Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

6 САКАВІКА 2009 г.
ПЯТНІЦА
№ 42
(26400)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Ліст у нумар

«ДЫ ТАГО НЕ ВЫРВУЦЬ, ШТО НАПЕЛА МАЦІ...»

Гэты год аб'яўлены Годам роднай зямлі, а значыць, на маю думку, і роднай мовы.

Калі нехта думае, што размаўляць на ёй вельмі складана, што на гэта здольны не многія, то ён вельмі памыляецца. Трэба толькі пачаць! У тым ліку — чытаць і слухаць. У радыёэфіры па канале «Культура» гучаць цудоўныя мелодыі, цікавыя апавяданні, прыгожыя вершы нашых знакамітых пісьменнікаў і паэтаў.

Апошнім часам, пасля ранішняга выпуску «Размаўляем па-беларуску» перадавалася цэлая кампазіцыя на творы Яўгеніі Янішчыц і Міхася Стральцова. Музыка іх прыгожага пісьменства чаравала, кранала да глыбіні душы, здавалася, што слухаць яе можна бясконца...

Але гэтага — мала! Давайце ж шанаваць чароўную музыку родных слоў, давайце размаўляць па-нашаму — між сабой і з дзецьмі! Давайце чытаць ім нашы мудрыя кніжкі! Давайце спяваць з імі прыгожыя беларускія песні! І тым самым перадаваць нашым нашчадкам найпрыгажэйшую мову свету!

Янка Купала пісаў:

Усё спаганяць людзі, покі ноч шалее,
Вырвуць веру ў шчасце, веру і надзею,
Ды таго не вырвуць, што напела маці
Ночкай над калыскай сваяму дзіцяці.
Ой, не вырваць з сэрца цябе, наша слова,
Ой, не ўзяць ніякім сховам ды аковам...

От, калі б гэта ды так!.. Бо сусветная практыка паказала, што якасць жыцця краіны залежыць не ад наяўнасці нафты ці газу, — ад маральнага духу народа, ад інтэлектуальных здольнасцяў, заснаваных на здабытках усіх папярэднікаў.

Валодаючы роднай мовай, нашы дзеці будуць інтэлектуальна і маральна больш развітыя, будуць улучаныя ў беларускую культуру, будуць ведаць гісторыю краю, будуць моцна стаяць на сваёй зямлі.

А што датычыцца іншых моваў — англійскай, французскай, рускай — вывучаць: дужым гэта пад сілу!

Галіна КАВАЛЕВІЧ, *г. Бяроза.*

P.S. *Даўно вядома: на мове душы — роднай мове — малітва хутчэй даходзіць да Бога.*

Хай жа дойдзе і наша — за Беларусь!

Грошы

Валютныя дэпазіты: стаўкі зніжаюцца

«Звязда» ўжо паведамляла пра тое, што спецыялістамі Нацбанка прапрацоўваецца пытанне аб зніжэнні ставак па валютных дэпазітах, таму што па іх склаліся занадта высокія працэнты. А напрыканцы лютага галоўны банк даў камерцыйным банкам пісьмовую рэкамендацыю знізіць стаўкі па дэпазітах у замежнай валюце да 12 працэнтаў.

— Нацыянальны банк ужо даўно казаў пра неабходнасць паніжэння ставак па валютных дэпазітах, — пракаментаваў гэтую інфармацыю карэспандэнту нашай газеты **начальнік Упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар Нацыянальнага банка Беларусі Анатоль ДРАЗДОЎ.** Паводле яго слоў, гэтыя захады павінны зрабіць больш прывабнымі для насельніцтва рублёвыя ўклады, што на карысць нацыянальнай валюце. Зразумела, аднамомантавага зніжэння ставак па дэпазітах не будзе. Нацыянальны банк, заўважыў Анатоль Драздоў, не патрабуе гэтага ад беларускіх банкаў.

Разам з тым, некаторыя банкі ўжо знізілі стаўкі па валютных дэпазітах. У прыватнасці, змены закранулі кароткатэрміновыя ўклады, у якія грошы прыцягваюцца на 1-3 месяцы. Стаўкі па такіх дэпазітах «палягчэлі» на 0,5-2 %. Калі раней, да прыкладу, адзін з беларускіх банкаў за тры месяцы плаціў укладчыку 12 % гадавых, то зараз прыцягвае валюту на дэпазіт пад 11,5 %.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Жыллё

Для атрымання льготнага крэдыту на будаўніцтва мінчане павінны заключыць дагавор з забудоўшчыкам

Для атрымання льготнага крэдыту на долевае будаўніцтва жылля мінчане, якія знаходзяцца на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, павінны заключыць дагавор долевага будаўніцтва ў парадку, устаноўленым указам № 396 «Аб долевым будаўніцтве шматкватэрных жылых дамоў» ад 15 чэрвеня 2006 года, з любым забудоўшчыкам сталіцы. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведаміў старшыня камітэта будаўніцтва і інвестыцый Мінгарвыканкама Андрэй Ясючэня.

Па рашэнні Мінгарвыканкама з 7 лютага гэтага года адміністрацыі раёнаў Мінска ўключаюць у спісы льготнага крэдытавання грамадзян, якія знаходзяцца на ўліку маючых патрэбу і заключылі дагаворы на долевае будаўніцтва жылля, незалежна ад даты іх пастаноўкі на ўлік. Спачатку чаргавік павінен заключыць дагавор на долевы ўдзел у будаўніцтве жылля. Выбраць забудоўшчыка неабходна самастойна, праглядзеўшы праектныя дэкларацыі, якія забудоўшчыкі публікуюць у СМІ.

Пасля заключэння дагавора, узяўшы па месцы працы даведку аб даходах за 12 месяцаў, неабходна звярнуцца ў адміністрацыю раёна, у якім грамадзянін знаходзіцца на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Адміністрацыя абавязана ўключыць грамадзяніна ў спісы льготнага крэдытавання і накіраваць гэтыя спісы ў аддзяленне ААБ «Беларусбанк». Наступным крокам павінен быць зварот грамадзяніна ў аддзяленне ААБ «Беларусбанк», што абслугоўвае раён, у якім ён знаходзіцца на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, з наборам дакументаў, рэгламентаваных указам № 185 «Аб прадастаўленні грамадзянам ільготных крэдытаў на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў» ад 14 красавіка 2000 года.

Для атрымання льготнага крэдыту ўзровень даходаў чаргавікоў не павінен перавышаць тры мінімальныя спажывецкія бюджэты на члена сям'і ў месяц (Br1089 тыс.). На сёння сярэдні кошт будаўніцтва жылля долевым спосабам у Мінску складае $1350 за 1 кв.м і залежыць ад месца размяшчэння дома і яго камфортнасці (мінімальны кошт — $1,3 тыс., максімальны — $4,8 тыс.).

Зберажэнні

Даход прыносяць «брусы»

У лютым попыт насельніцтва рэспублікі на залатыя мерныя зліткі крыху знізіўся ў параўнанні з попытам у студзені: калі за першы месяц года аб'ём купленых людзьмі зліткаў складаў каля 216 кілаграмаў, то ў другім месяцы — каля 183.

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ва ўпраўленні інфармацыі Нацыянальнага банка, у параўнанні з леташнімі студзенем-лютым сёлета за адпаведны перыяд аб'ём прададзеных залатых мерных зліткаў скараціўся на 15 % . Увогуле ж за два месяцы гэтага года беларусамі куплена 15 тысяч 847 штук зліткаў агульнай вагой каля 399 кілаграмаў.

Зразумела, многіх цікавіць, а наколькі даходным стала ўкладанне грошай у золата, што на гэтым зарабілі ўладальнікі каштоўнага металу? Для большасці пакупнікоў, якія набылі мерныя зліткі напрыканцы 2008 года, падлічваць прыбытак не выпадае: цана, па якой зараз банкі купляюць іх, крыху меншая ў параўнанні, напрыклад, з цаной падчас снежаньскага продажу. Гэта датычыцца ад 1-грамовых да 250-грамовых зліткаў. Іншая сітуацыя па больш важкіх «брусах» — паўкілаграмовых і вагой у 1 кілаграм. Уладальнік першага зліткa на розніцы паміж продажам зліткa ў канцы снежня і купляй яго банкамі зараз мог зарабіць каля 392 долараў ЗША. А вось даход па 1-кілаграмовым злітку дасягнуў каля 576 долараў. Праўда, пакупнікоў, якія могуць інвеставаць грошы ў такія зліткі, няшмат. Сёлета, да прыкладу, за два месяцы куплена толькі 12 кілаграмовых мерных зліткаў, а паўкілаграмовых — 53. Як заўсёды, найбольшы попыт у насельніцтва на 10-грамовыя зліткі, якіх было прададзена за студзень—люты 4284 штукі, або 27 працэнтаў ад агульнай колькасці. Следам ідуць 5-грамовыя, якіх куплена 3350 штук, і 20-грамовыя — 3078 штук. Між іншым, з моманту пачатку продажу насельніцтву залатых мерных зліткаў (з 20 жніўня 2001 года), банкамі рэалізавана ўжо амаль пяць з паловай тон каштоўнага металу. Пры гэтым зваротны выкуп зліткаў толькі крыху перавысіў 500 кілаграмаў.

Амаль зраўняўся за два сёлетнія месяцы з аб'ёмам продажу «жоўтага» металу і попыт на сярэбраныя мерныя зліткі. Агульная вага гэтых зліткаў, купленых насельніцтвам у банкаў, склала каля 381 кілаграма. Як і ў папярэднім выпадку, асабліва папулярныя 10-грамовыя зліткі, якіх было набыта 2373 штукі. Аперацыі з плацінавымі зліткамі выглядаюць зусім сціпла: іх прададзена ў гэтым годзе толькі тры кілаграмы 120 грамаў. Наогул, з 14 красавіка 2005 года, калі пачалася рэалізацыя плацінавых зліткаў, аб'ём купленага людзьмі металу нават не дацягнуў да 50 кілаграмаў: за ўвесь час банкамі насельніцтву было прададзена 48 кілаграмаў 775 грамаў, пры гэтым больш як 14 кілаграмаў пасля выкуплена.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 6.03.2009 г. (для б/н разлікаў)

■ 1 долар ЗША	2 870,00
▲ 1 еўра	3 616,49
1 латвійскі лат	5 113,13
1 літоўскі літ	1 047,20
1 чэшская крона	132,70
1 польскі злоты	775,18
▲ 1 расійскі рубель	79,97
1 украінская грыўня	365,61

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	35,8899
10 UAH	45,2572
1000 BYR	12,5008
EUR	45,7196

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Антыкрызісная эканоміка

МЕНШЫ ЗАРОБАК. АДНАК... НЕ ЗВАЛЬНЕННЕ

Фота БЕЛТА.

Праблемы, звязаныя з фінансавым крызісам, прымусілі многія замежныя кампаніі рэагаваць масавымі скарачэннямі персаналу. Беларусь, адзначыў падчас сустрэчы з журналістамі намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Пётр ГРУШНІК, гэтым шляхам не пойдзе. Прычым пакуль ранейшыя прагнозы наконт развіцця падзей на айчынным рынку працы не змяняюцца — па выніках года ўзровень зарэгістраванага беспрацоўя ў краіне павінен скласць 1-1,2 % ад агульнай колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва.

Два працэнты — у двух рэгіёнах

Высокі попыт на працоўную сілу — адна з адметнасцяў апошняга часу. Вынікам было паступовае зніжэнне паказчыкаў беспрацоўя. У 1996 годзе на ўліку ў службах занятасці знаходзілася 4, у 2003 годзе — 3,1, пазалетась — 1, а летась — 0,8 % эканамічна актыўных грамадзян краіны. Прычым са 118 раёнаў і 12 гарадоў Беларусі ў 85 рэгіёнах беспрацоўе знаходзілася ніжэй за адзнаку ў 1 %. А ўзровень беспрацоўя больш за 2 % быў толькі ў Ганцавіцкім і Пастаўскім раёнах.

Яшчэ адной даволі характэрнай з'явай сталася павелічэнне колькасці вакансій. У леташнім снежні попыт на працоўную сілу перавышаў прапановы ў 1,4 раза. Для параўнання: у 2003 годзе, наадварот, прапановы перавышалі попыт у 4,3 раза.

Паводле слоў Пятра Грушніка, зніжэнне напружанасці на рынку працы тлумачыцца актыўнай дзяржаўнай палітыкай. Некалькі лічбаў. Летась у краіне ўдалося стварыць 163 тыс. новых працоўных месцаў, накіраваць на прафпадрыхтоўку ці перападрыхтоўку амаль 23 тыс. чалавек, 2,7 тыс. беспрацоўных атрымалі дапамогу ў арганізацыі ўласнага бізнэсу, а 346 сем'яў пераехалі на сталае месца жыхарства і працы ў іншую мясцовасць. Усе гэтыя напрамкі будуць «працаваць» і сёлета.

У рэжыме няпоўнай занятасці працуе 106 тыс. чалавек.

З рынку «знікаюць» вакансіі

Аднак год мінулы — ужо гісторыя. Сёлета, з улікам уплыву сусветнага крызісу, рэалій іншыя. Як адзначыў Пётр Грушнік, пакуль сітуацыя на айчынным рынку працы не выходзіць за рамкі «штатнай» і не патрабуе прыняцця дадатковых тэрміновых мераў. У студзені па дапамогу ў службы занятасці звярнулася 23,1 тыс., у лютым — 24,4 тыс. чалавек — абедзве гэтыя лічбы меншыя, чым у студзені-лютым летась. Па-другое, на сёння ёсць звесткі пра магчымае вызваленне на працягу I квартала 3602 работнікаў. У I квартале летась патрапілі пад скарачэнне 6082 чалавекі. Па-трэцяе. Колькасць вакансій па-ранейшаму перавышае колькасць беспрацоўных, пры гэтым у Мінску — адразу ў 4,5 раза. Урэшце, на сёння ў міністэрстве не адзначаюць рэзкага скарачэння попыту на прадстаўнікоў тых ці іншых прафесій.

У Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны спадзяюцца на вяртанне беларускіх гастарбайтараў — перш-наперш з Расіі.

Разам з тым, нельга не адзначыць: менавіта сітуацыя з вакансіямі выклікае занепакоенасць. Іх становіцца ўсё менш — толькі за апошні тыдзень лютага адразу на 910 месцаў. Апроч таго, павялічылася агульная колькасць беспрацоўных — з 40,6 тыс. чалавек напрыканцы студзеня да 43,6 тыс. напрыканцы лютага.

На «скарочаны» рэжым

І ўсё ж ці не самым трывожным момантам стала рэзкае павелічэнне маштабаў няпоўнай занятасці. У лістападзе мінулага года колькасць работнікаў, якія былі занятыя на ўмовах няпоўнага працоўнага тыдня па ініцыятыве наймальніка, складала 16,6 тыс. чалавек, што ў 2,5 раза больш, чым у кастрычніку. Пры гэтым па лясной, дрэваапрацоўчай і цэлюлозна-папяровай прамысловасці паказчык павялічыўся ў 3,7, па машынабудаванні і металаапрацоўцы — у 4,6, па будаўніцтве — у 5,8 раза. Адначасова ў вымушаныя водпускі без захавання або з частковым захаваннем зарплаты ў тым жа лістападзе было адпраўлена 14,4 тыс. работнікаў — рост у параўнанні з кастрычнікам тут склаў 3,1 раза. Зноў-такі перш-наперш гэта датычылася машынабудавання, лясной і дрэваапрацоўчай прамысловасці.

Аднак, гэта было толькі пачаткам. У снежні колькасць работнікаў, пераведзеных на няпоўны працоўны тыдзень, дасягнула 40 тыс., а колькасць работнікаў, што знаходзіліся ў вымушаных водпусках без захавання або з частковым захаваннем зарплаты, — 47,1 тыс., у студзені гэтыя лічбы былі — 47 тыс. і 59 тыс. чалавек адпаведна.

Такім чынам, агульны аб'ём вымушанай няпоўнай занятасці ў студзені быў больш за 106 тыс. чалавек. Прычым страты працоўнага часу ў лютым адзначаліся на 240 прадпрыемствах і арганізацыях, у тым ліку на 44 прадпрыемствах Брэсцкай, 25 — Віцебскай, 43 — Гомельскай, 40 — Гродзенскай, 34 — Мінскай, 54 — Магілёўскай вобласці. Праўда, паводле аператыўнай інфармацыі двухтыднёвай даўнасці, колькасць праблемных суб'ектаў гаспадарання ўсё ж крыху зменшылася — да 226.

— Безумоўна, няпоўная занятасць — з'ява вельмі кепская, — адзначыў Пётр Грушнік. — У той жа час трэба вітаць імкненне наймальнікаў не звальняць работнікаў, а пакідаць працоўныя месцы — захаванне калектываў з'яўляецца антыкрызіснай мерай. Дарэчы, сёння аб намеры ісці падобным шляхам захавання працоўных месцаў заяўляюць і некаторыя еўрапейскія краіны, у прыватнасці, Германія.

Што далей?

Няма сумненняў, што павелічэнне маштабаў неэфектыўнага выкарыстання працоўнага часу — патэнцыяльная база для росту беспрацоўя. Таму, падкрэсліў Пётр Грушнік, сітуацыя будзе знаходзіцца пад пільным кантролем. Каб мець магчымасці прымаць аператыўныя рашэнні, наладжаны манітарынг становішча — асаблівая ўвага тут надаецца прадпрыемствам і арганізацыям, якія аказваюць значны ўплыў на рэгіянальныя рынкі працы.

Пры гэтым намеснік міністра працы нагадаў: у краіне дзейнічае праграма занятасці насельніцтва і, з улікам сітуацыі, асноўная стаўка сёлета будзе рабіцца на арганізацыю аплатных грамадскіх работ для беспрацоўных, дапамогу ў адкрыцці «ўласнай справы», прафесійную перападрыхтоўку, субсідзіраванне працоўных месцаў для моладзі і інвалідаў, падтрымку арганізацый, што ствараюць і захоўваюць працоўныя месцы.

— Варта заўважыць, што мы гатовыя правесці пэўную карэкціроўку сёлетняй праграмы занятасці — гаворка ідзе пра магчымае перараз мяркаванне сродкаў, — адзначыў Пётр Грушнік. — Да слова, аналіз паказвае, што грошай, закладзеных у праграму, будзе дастаткова пры ўзроўні беспрацоўя ў межах 2 %. Калі ж узровень беспрацоўя перавысіць гэту адзнаку і складзе 2-3 %, спатрэбіцца дадаткова каля 12 млрд рублёў.

Толькі за апошні тыдзень лютага ў краіне стала менш на 910 вакансій.

Гастарбайтары будуць вяртацца

Між тым, вядома: адваротны бок ёсць не толькі ў месяца і бутэрброда. Тое ж можна сказаць і ў дачыненні да эканамічнага крызісу — пад яго ўплывам з-за мяжы на радзіму пачынаюць вяртацца беларускія гастарбайтары.

Апошнім часам статыстыка канстатавала паступовае павелічэнне колькасці працоўных рэсурсаў: з 6 млн 4,6 тыс. чалавек у 2000 годзе да 6 млн 241,4 тыс. летась. Разам з тым, гэты рост назіраўся толькі ў гарадах. Да таго ж ужо сёлета ён павінен спыніцца — у сувязі з тым, што менавіта цяпер паўналецця дасягае нешматлікае паколенне дзяцей 1990-х гадоў. Як вынік, дэмографы робяць несуцяшальныя прагнозы: ужо ў 2010 годзе працоўны патэнцыял краіны будзе ацэньвацца ў 6 млн 120 тыс. — 6 млн 150 тыс. чалавек. Таму каб «замартызаваць» падзенне, гаворка павінна ісці аб паступовым уцягненні ў айчынную эканоміку грамадзян, якія не маюць сталага афіцыйнага занятку. Пэўныя поспехі тут ёсць. Аднак ёсць і вялікія рэзервы. У прыватнасці, паводле ацэнак расійскіх экспертаў, у гэтай краіне працуе каля 180 тыс. беларусаў — збольшага будаўнікоў і транспартнікаў.

Сродкаў на папярэджанне беспрацоўя будзе дастаткова, калі яго ўзровень не перавысіць 2 %.

Зрэшты, лічаць у Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны, менавіта эканамічныя ўзрушэнні прымусяць значную частку гастарбайтараў вярнуцца ў айчынную эканоміку. Пакуль афіцыйнай статыстыкі на гэты конт няма. Аднак, заўважыў начальнік галоўнага ўпраўлення палітыкі занятасці і народанасельніцтва Мікалай Коханаў, адной з тэндэнцый апошняга часу сталася павелічэнне паказчыкаў рэгістрацыі ў якасці беспрацоўных мужчын — хутчэй за ўсё, гаворка ідзе якраз пра «расійскіх беларусаў».

Сяргей ГРЫБ.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ СА «ЗВЯЗДОЙ»

Пачалася падпіска на II квартал 2009 года

Падпісныя цэны на газету «Звязда» (у рублях)

Індэкс	на 1 месяц	на 3 месяцы
63850 (індывідуальны)	10120	30360
63145 (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны)	9570	28710
63858 (ведамасны)	16170	48510
63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя)	14740	44220

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

ЗОЛАТАВАЛЮТНЫЯ РЭЗЕРВЫ БЕЛАРУСІ — БОЛЬШ ЯК 3,8 МЛРД

За два месяцы гэтага года золатавалютныя рэзервы Беларусі ў нацыянальным вызначэнні павялічыліся на 152 мільёны долараў ЗША, ці на 4,2 %, паведаміў карэспандэнту «Звязды» папярэднія звесткі намеснік начальніка ўпраўлення інфармацыі Нацыянальнага банка Беларусі Міхаіл ЖУРАВОВІЧ. Нагадаем, што да гэтага золатавалютныя рэзервы краіны на працягу некалькіх месяцаў скарачаліся.

Такім чынам, на 1 сакавіка золатавалютныя рэзервы Беларусі дасягнулі 3814,2 мільёна долараў ЗША. Па стандартах МВФ золатавалютныя рэзервы рэспублікі ўзраслі на 265,8 мільёна долараў, ці на 8,7 % і склалі 3326,9 мільёна долараў ЗША.

Каментуючы, за кошт чаго адбыўся рост рэзерваў, у Нацбанку зазначаюць, што станоўча паўплывалі тут у студзені-лютым паступленне першай траншы крэдыту МВФ і сродкі ад продажу пакета акцый ААТ «Белтрансгаз». Акрамя таго, на павелічэнне паказчыка міжнародных рэзервовых актываў паўплывалі аперацыі куплі-продажу замежнай валюты на ўнутраным пазабіржавым рынку, што праводзіць галоўны банк. У нязначнай ступені папаўненне адбылося і за кошт уплыву змянення абавязацельстваў Нацбанка перад банкамі і банкаў перад галоўным банкам краіны, ажыццяўлення разлікаў па аперацыях з замежнай валютай, змянення кошту і аб'ёму каштоўных металаў і каштоўных камянёў і іншых фактараў.

Ігар ГРЫШЫН.

НА ЦЮЛЬПАНЫ МАГЧЫМЫЯ ЗНІЖКІ

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў аддзеле маркетынгу КУП «Кветкі сталіцы», сёлета да 8 сакавіка ў гандаль будзе пастаўлена 130 тысяч цюльпанаў. Гэта значна больш, чым было вырашчана летась, калі напярэдадні жаночага свята было пастаўлена 55 тысяч гэтых кветак.

На сёння кошт адной кветкі складае 3570 рублёў. На прадпрыемстве запэўнілі, што напярэдадні 8 сакавіка гэтая цана не павялічыцца, наадварот, магчымыя зніжкі. Але пра апошнія стане вядома не раней, чым 7 сакавіка. Па словах суразмоўцы, кошт на імпартныя цюльпаны прынамсі цяпер вагаецца ад 4,5 да 5,5 тысячы рублёў за кветку. Якой цана будзе бліжэй да свята, сказаць зараз цяжка. А вось айчынныя ружы ад КУП «Кветкі сталіцы» яшчэ не выраслі і пакупнікі змогуць убачыць іх у продажы толькі ў красавіку. Тлумачыцца гэта рэканструкцыяй, што вядзецца на прадпрыемстве.

Сяргей РАСОЛЬКА.

КАНТРАКТ «ПАЦЯГНУЎ» НА $6000

44-гадовы кіраўнік адной з фермерскіх гаспадарак, жыхар Крычава, а таксама 50-гадовы непрацуючы жыхар Мінскага раёна падазраюцца ў атрыманні хабару ад прадстаўніка маскоўскай фірмы.

Фігуранты справы, якую па матэрыялах падраздзяленняў па барацьбе з карупцыяй і эканамічнай злачыннасцю МУС, ГУУС і Савецкага РУУС сталіцы ўзбудзіла пракуратура Мінска, як мяркуецца, падбухторвалі да дачы хабару прадстаўніка расійскай фірмы яшчэ з верасня мінулага года. 6 тысяч долараў, якія атрымалі падазроныя, сталі «падзякай» за станоўчае вырашэнне пытання аб заключэнні кантракта з беларускім прадпрыемствам на пастаўку арматуры.

Кацярына СОКАЛ-ЭЛЧАКЯН.

НАПЯРЭДАДНІ СВЯТА — ДАДАТКОВЫЯ ЦЯГНІКІ

Паводле інфармацыі Мінскага аддзялення, Беларускай чыгункі дадаткова прызначаны цягнік № 606 Мінск — Гомель, які адпраўляецца з Мінска 6 сакавіка ў 21.43, прыбывае ў Гомель 7 сакавіка ў 2.14. Таксама прызначаецца цягнік № 605 Гомель — Мінск, што адпраўляецца з Гомеля 7 сакавіка ў 3.20, прыбывае ў Мінск 7 сакавіка ў 9.05.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ГК УП «УНІВЕРМАГ «БЕЛАРУСЬ»

З адным з самых любімых святаў нашай краіны – 8 Сакавіка – віншуе ўсіх беларускіх жанчын! Асабліва – сваіх наведвальніц, супрацоўніц і жанчын, якія працуюць на прадпрыемствах, што пастаўляюць у наш універмаг высакаякасны, прыгожы і патрэбны тавар!

Дарагія нашы, мілыя, любыя жанчыны! Мы жывём і працуем для вас! Дзеля вашых усмешак, святла вашых вачэй, дзеля таго, каб вы заўсёды заставаліся разам з намі! Мы жадаем вам шчасця, здароўя, кахання, упэўненасці ў заўтрашнім дні! Застаўайцеся такімі ж прыгожымі, маладымі, летуценнымі, якія вы ёсць! Няхай веснавое сонейка суправаджае кожны ваш дзень!

Дырэктар Мікалай МЯТЛІЦКІ.

Рэгістрацыйна-экзаменацыйным падраздзяленням ДАІ МУС Беларусі — 35 гадоў

НОВАЕ ПАСВЕДЧАННЕ ПА СТАРЫМ КОШЦЕ

ДАІшнікі віншуюць аўтааматарак са святам.

Фота Вольгі ПАСКІ.

Дзе пачынаецца знаёмства для ўчарашніх курсантаў аўташкол і новаспечаных уладальнікаў аўтамабіляў з Дзяржаўтаінспекцыяй? Безумоўна, у рэгістрацыйна-экзаменацыйным падраздзяленні (далей — РЭП) ДАІ. Сюды людзі прыходзяць спачатку па вадзіцельскае пасведчанне на права кіравання транспартным сродкам, а пасля ўжо для таго, каб зарэгістраваць аўтамабіль ці зняць яго з уліку. Напярэдадні свята старшы інспектар па асаблівых даручэннях аддзела рэгістрацыйна-экзаменацыйнай дзейнасці і тэхнічнага нагляду УДАІ МУС Дзмітрый ГАРЫНОВІЧ згадзіўся адказаць на некалькі пытанняў аўтааматараў, якія чытаюць «Звязду».

— Якім будзе новае вадзіцельскае пасведчанне і як новаўвядзенне адаб'ецца на кішэні аўтаўладальнікаў?

— Сёлета мы плануем распрацаваць новы праект адзінага вадзіцельскага пасведчання еўрапейскага стандарту: гэта будзе пластыкавая картка з подпісам яе ўладальніка. У сакавіку 2011 года мы пачнём выдаваць і абменьваць іх. Абмен пасведчанняў кіроўцаў будзе праходзіць паэтапна. Можаце не хвалявацца, ніхто арганізавана і пад прымусам не пагоніць у МРЭА па новае пасведчанне. Зараз вадзіцельскае пасведчанне выдаецца тэрмінам на 10 гадоў, па скончэнні гэтага тэрміну можна будзе абмяняць стары дакумент на картку новага ўзору. Кошт застанецца ранейшым.

— Што найперш трэба ведаць пры пакупцы аўтамабіля, каб паспяхова яго зарэгістраваць?

— Усю інфармацыю аб парадку рэгістрацыі транспарту можна знайсці на сайце МУС ці даведацца па тэлефоне. Акрамя таго, не палянуйцеся зверыць рэгістрацыйныя дакументы з ідэнтыфікацыйнымі нумарамі транспартнага сродку, у прыватнасці праверце, ці супадае сапраўдны нумар кузава з тым нумарам, які значыцца на паперы. У выпадку, калі высветліцца, што нумары не супадаюць ці перабітыя, працэдура рэгістрацыі можа зацягнуцца надоўга.

У кожным рэгістрацыйна-экзаменацыйным падраздзяленні (а іх у Беларусі 44) ёсць адзіная сістэма, якая дазваляе пры рэгістрацыі аўтаматычна праверыць па базе звестак, ці не ўкрадзены транспарт, а ўладальнікаў аўтамабіляў праверыць па базе асобаў, якія знаходзяцца ў вышуку.

УДАІ МУС Беларусі віншуе ўсіх супрацоўнікаў РЭП з 35-годдзем са дня ўтварэння службы.

Надзея ДРЫЛА.

ЗАБІЎ АДНАГО, А ПЛАЦІЦЬ ЗА ВОСЕМ — УСЯГО BR21 МЛН

Побач з Лунінцам браканьер застрэліў самку дзіка. Гэта зрабіў беспрацоўны з райцэнтра. У яго знайшлі тушу звера і стрэльбу. Абследаванне паказала, што самка была пароснай і прывяла б неўзабаве 7 парасят. А калі так, то даводзіцца заплаціць 21 млн рублёў.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Зацверджана палажэнне аб ліцэнзаванні дзейнасці па аказанні псіхалагічнай дапамогі

Такое рашэнне змяшчаецца ў пастанове Саўміна № 240. Палажэннем, распрацаваным у адпаведнасці з дэкрэтам ад 14 ліпеня 2003 года № 17 «Аб ліцэнзаванні асобных відаў дзейнасці», вызначаецца парадак ліцэнзавання дзейнасці па аказанні псіхалагічнай дапамогі.

Выдача спецыяльных дазволаў (ліцэнзій) ажыццяўляецца Міністэрствам аховы здароўя. Для ажыццяўлення псіхалагічнай дзейнасці ў Беларусі абавязковай з'яўляецца наяўнасць вышэйшай псіхалагічнай ці педагагічнай адукацыі з кваліфікацыяй педагог-псіхолаг або вышэйшай медыцынскай адукацыі з кваліфікацыяй урач-псіхолаг, або дыплома аб перападрыхтоўцы ўстаноўленага ўзору на ўзроўні вышэйшай адукацыі з кваліфікацыяй псіхолаг, або дыплома магістра, кандыдата ці доктара псіхалагічных навук, а таксама стажу работы ў галіне практычнай псіхалогіі не менш як 3 гады.

БЕЛТА.

Не слабы пол

Жанчыны дбаюць пра дзяцей, мужчын і г.д.

Аб старце новых тэматычных акцый Беларускага саюза жанчын журналістам паведаміла намеснік старшыні арганізацыі Рэгіна ДАВІДОВІЧ.

Году роднай зямлі будзе прысвечана акцыя «Беларусь — утульны дом». А ў межах акцыі «Крыніца дабрыні і памяці», прымеркаванай да 65-годдзя вызвалення Беларусі, актывісткі самага масавага жаночага руху накіруюць увагу ў бок адзінокіх сталых людзей, у першую чаргу тых, што пражываюць у сельскай мясцовасці. Праект «Выхаванне бацькоўства» мае на мэце сапраўды выхаваўчую ролю ў дачыненні да маладых мужчын, якім не пашкодзіла б больш адказна ставіцца да такой сур'ёзнай падзеі, як нараджэнне дзіцяці. Жанчыны мяркуюць, што абуджэнню «інстынкту таты» паспрыяе і Дзень бацькі, рашэнне аб зацвярджэнні якога ўжо вынесена. Паводле слоў Рэгіны Давідовіч, адразу пасля ўкаранення Дня маці «мы ўсё чакалі, што мужчыны разлюбяцца і запатрабуюць хутчэйшага ўвядзення «свайго» дня, аднак гэтага не адбылося, і таму мы вырашылі ім дапамагчы...».

Рэгіна Давідовіч упэўнена, што кожны праект БСЖ дасягае сваёй мэты і прыносіць канкрэтныя вынікі. Узяць хоць бы аб'яўлены два гады таму рух «Ніводнага кінутага дзіцяці», дзякуючы якому толькі летась у сем'і былі размеркаваны 18 тысяч сірот. На рэспубліцы нават з'явіліся рэгіёны, у якіх статус сіраты не атрымала летась ніводнае дзіця, а тры школы-інтэрнаты па краіне — у Мінску, Віцебску і Жыткавічах — былі расфарміраваны і зачынены.

Святлана БАРЫСЕНКА.

У БЕЛАРУСКАГА БІЗНЭСУ З'ЯВІЛАСЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ПЛАТФОРМА

На рэспубліканскай асамблеі дзелавых колаў беларускія прадпрымальнікі абмеркавалі з прадстаўнікамі ўлады ролю бізнэс-структур у краіне, у тым ліку і ва ўмовах крызісу. Прынята «Нацыянальная платформа бізнэсу Беларусі на 2009 год», якая будзе дапрацавана да 31 сакавіка.

Гэта 144 прапановы па паляпшэнні бізнэс-клімату і пераадоленні краінай эканамічнага крызісу, ад прыватызацыі і спрашчэння дакументаабароту да сацыяльнай адказнасці і інфармацыйнай адкрытасці дзяржавы. Дванаццаць самых важных і першачарговых агучыў **Віктар МАРГЕЛАЎ, старшыня Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва.** Гэта адмена дзяржаўнага рэгулявання цэнаў, уключэнне механізмаў самарэгуляцыі рынку, скарачэнне колькасці і памяншэнне памеру падаткаў, памяншэнне штрафаў, спрашчэнне дакументазвароту, зняцце абмежаванняў на зарплату, супрацьдзеянне манапалістычным практыкам, паскарэнне прыватызацыі, памяншэнне арэндных плацяжоў, спрашчэнне сертыфікацыі, памяншэнне адлічэнняў у ФСАН і спрашчэнне крэдытнай палітыкі. Цікава, што прадпрымальнікі настойваюць на комплекснай рэалізацыі сваёй платформы, бо, напрыклад, спрашчэнне таго самага дакументазвароту ўпіраецца ў рэгуляванне цэнаў і налічэнне зарплаты, а адмена дзяржрэгулявання цэнаў аўтаматычна патрабуе самарэгуляцыі рынку і супрацьдзеяння манаполіям. Наконт прыватызацыі Віктар Маркелаў сказаў, што ніхто не замахваецца на гіганты:

— Не трэба думаць, што ў зале тут сквапныя людзі, якія на халяву жадаюць прыватызаваць МАЗ або трактарны. Гаворка ідзе пра тысячы малых і сярэдніх дзяржаўных суб'ектаў, якія даўно працуюць стратна, неэфектыўна выкарыстоўваюць сваю маёмасць. І будзе толькі на карысць, калі іх маёмасць будзе ўцягнута ў гаспадарчае абарачэнне.

Перад правядзеннем асамблеі праект Нацыянальнай платформы бізнэсу-2009 быў разасланы па зацікаўленых міністэрствах і ведамствах. У прынцыпе, платформай задаволены і ў міністэрстве эканомікі, але маюць да яе шэраг прэтэнзій, пра што і расказаў **намеснік міністра Андрэй ТУР:**

— У мінэканомікі мы ўважліва прааналізавалі яе. Вылучаныя там напрамкі развіцця бізнэс-клімату дастаткова правамерныя. Частка прапаноў ужо рэалізавана на практыцы поўнасцю ці часткова ў рамках прынятых праграмных дакументаў, каля трэці прапаноў прапісаны ў плане першачарговых мераў, а цэлы шэраг іншых станоўчых момантаў платформы знайшлі адлюстраванне ў дакументах, якія мы зараз рыхтуем, прынамсі, у сур'ёзным дакуменце, які заменіць сістэму ліцэнзавання. Разам з тым, я думаю, што асобныя рашэнні, якія прапануюцца ў платформе, з'яўляюцца неадназначнымі, патрабуюць дапрацоўкі або канкрэтызацыі. З усімі пунктамі, якія пералічыў, у асноўным згодны, але шмат у чым я гэта ўспрымаю як лозунг або імкненне, або тэндэнцыю без прапрацоўкі рэальных механізмаў і тэрмінаў рэалізацыі дакументаў.

Такім чынам Андрэй Тур прапанаваў падзяліць пункты платформы на тры часткі — доўгатэрміновыя, сярэднетэрміновыя і меры сённяшняга дня, а таксама дапісаць механізмы рэалізацыі. Дарэчы, па інфармацыі ад Андрэя Мікалаевіча, у рамках зацверджанага плана мераў па лібералізацыі эканомікі ўжо прынята 37 нарматыўна-прававых актаў, у тым ліку 7 дэкрэтаў і ўказаў Прэзідэнта, 2 пастановы Урада, 28 ведамасных прававых актаў. Пра эфектыўнасць прынятых мераў можна будзе казаць толькі па выніках першага квартала і не раней.

Цікава, што першым крокам бізнэсоўцы ставяць адмену дзяржаўнага рэгулявання цэнаў, а вось Мінэканомікі пакуль да такога кроку не гатовае:

— Дзе вы ў свеце бачылі, каб не было дзяржаўнага рэгулявання цэнаў? — спытаў з трыбуны Андрэй Тур. — Пытанне заключаецца ў тым, за кошт якіх спосабаў і метадаў гэта робіцца. Правільна кажаце, што трэба ўводзіць антыманапольнае рэгуляванне. Але каб да яго падысці, патрэбны час. А калі адразу адмяніць, без антыманапольнага рэгулявання, мы атрымаем тое, што было на працягу 2-3 тыдняў сярэдзіны студзеня. Вы бізнэсоўцы, але ісціна яшчэ і сацыяльная адказнасць. Вы б пабачылі, якая колькасць лістоў была ў нас наконт неабгрунтаванага росту цэнаў і адсутнасці кантролю. У эканоміцы ніколі нічога не адбываецца ў адзін момант.

Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь Рыгор ВАСІЛЕВІЧ станоўча ўспрыняў прапановы прадпрымальнікаў:

— Прапановы, якія гучаць з вуснаў бізнэс-суполкі, павінны быць прадметам уважлівага вывучэння. Шэраг прапановаў, з якімі я азнаёміўся, ідуць у рэчышчы развіцця беларускай дзяржавы як прававой — гаворка ідзе пра прэзумпцыю невінаватасці, прыярытэт інтарэсаў суб'екта гаспадарання, калі заканадаўца незразумела прапісаў тыя ці іншыя патрабаванні. Гаворку зараз трэба весці пра сацыяльную адказнасць прадпрымальніцтва, павінен быць аптымальны баланс усіх суб'ектаў — дзяржавы, грамадства і асобных грамадзян.

Згодны Рыгор Аляксеевіч і з тым, што адміністрацыйная адказнасць павінна быць аптымальнай, адпаведнай правапарушэнню, а штрафы павінны мець стымулюючы характар, а не мэту абанкруціць. Яшчэ генеральны пракурор расказаў, што зараз рыхтуюцца змены ў Крымінальным кодэксе з той задумай, каб патрабаванні да прадпрымальнікаў, грамадзянаў і службовых асобаў былі аднолькавыя.

Дарэчы, наконт штрафаў і праверак сваё меркаванне выказаў і **Андрэй КАРПУНІН, віцэ-старшыня Сталічнага саюза прадпрымальнікаў і працадаўцаў, старшыня Савета дырэктараў ІПА «Рэгістр».** Ён адзначыў, што пакуль ёсць два дасягненні: па-першае, у гэтым годзе на 40 працэнтаў паменшаны даход ад штрафаў у бюджэце, і па-другое, аб'яўлены паўгадавы мараторый на праверкі. Праўда, Андрэй Юр'евіч папярэдзіў бізнэсоўцаў, што мараторый скончыцца і праверкі зноў пачнуцца, таму да іх трэба быць падрыхтаванымі. Негатыўнымі з'явамі Андрэй Карпунін лічыць і вялікую колькасць кантралюючых органаў (толькі па самых сціплых падліках праверыць прадпрыемства могуць больш за 40 структур), наяўныя планы штрафаў у падатковых інспекцыях, вялікія памеры штрафных санкцый, якія могуць прывесці да ліквідацыі суб'екта гаспадарання.

Галоўным вынікам праведзенай 10-й асамблеі **Уладзімір КАРАГІН, старшыня Мінскага сталічнага саюза прадпрымальнікаў і працадаўцаў** і адначасова адзін з арганізатараў мерапрыемства, лічыць тое, што бізнэс-структуры атрымалі магчымасць пачуць адно аднаго. Ён прызнаўся, што было вельмі складана запрасіць на асамблею прадстаўнікоў міністэрстваў і ведамстваў. Па-першае, за таго, што ў тых і так працы хапае ў сувязі з крызісам і шматлікімі антыкрызіснымі нарадамі, а па-другое, з-за таго, што ў нас у краіне не склаліся «трацыцыі дыялогу», як выказаўся Уладзімір Карагін. Бізнэсоўцы гатовыя ісці на дыялог, гатовыя дапамагчы перажыць крызіс і спадзяюцца, што і да іх прапановаў прыслухаюцца.

Павел БЕРАСНЕЎ.

Салдат, які пацярпеў падчас пажару ў танку, памёр у шпіталі

Пра гэта паведаміў БЕЛТА начальнік прэс-службы Міністэрства абароны Беларусі Вячаслаў Раменчык. Як паведамлялася, 19 лютага ў час планавых заняткаў па баявой падрыхтоўцы аднаго з падраздзяленняў у парку 11-й механізаванай брыгады Сухапутных войскаў адбылося ўзгаранне паліва ў танку Т-72. Пажар быў аператыўна патушаны.

У выніку ўзгарання апёкі рознай ступені цяжкасці атрымалі трое членаў экіпажа. Ваеннымі медыкамі праведзены комплекс мерапрыемстваў па аднаўленні здароўя вайскоўцаў. На працягу двух тыдняў спецыялісты змагаліся за жыццё найбольш пацярпелага з іх, аднак атрыманыя ім траўмы былі несумяшчальныя з жыццём.

Міністэрства абароны выказвае спачуванні родным і блізкім памерлага і акажа неабходную дапамогу ў адпаведнасці з заканадаўствам.

Абзац

■ Органы ўнутраных спраў Беларусі больш не будуць загадзя называць даты правядзення дзён цвярозасці.

■ Расія прадаставіць Беларусі крэдыт на $500 млн. Адпаведную пастанову падпісаў прэм'ер-міністр Расіі Уладзімір Пуцін, паведамляюць інфармагенцтвы.

■ Трохгадовае дзіця загінула на пажары ў Докшыцкім раёне. Мяркуемай прычынай трагедыі стала дзіцячае свавольства з агнём і недагляд дарослых. Родныя былі на кухні і пакінулі хлопчыка гуляць аднаго. Пажар яны выявілі толькі тады, калі агонь ахапіў усё памяшканне. Дзіця на ўласным аўтамабілі даставілі ў бальніцу, аднак выратаваць яго не ўдалося: хлопчык атрымаў апёкі, несумяшчальныя з жыццём. Яго маці ў гэты час была на працы.

■ Беларуская чыгунка ўвяла ў цягніках дадатковае поснае меню. У перыяд Вялікага посту ў вагонах-рэстаранах БЧ пасажырам прапаноўваюць шырокі выбар страў, што выключаюць прадукты жывёльнага паходжання — салаты з агародніны, перац, фаршыраваны гароднінай, вараную і смажаную бульбу з грыбамі, разнастайныя кашы, грыбную салянку і іншыя. Дэсертнае меню замест пірожных прапаноўвае вялікі выбар садавіны і сокаў. Акрамя поснага, існуе і традыцыйнае меню.

Поўны абзац

■ 36-гадовы аўстрыец быў вымушаны рабаваць банкі, каб забяспечыць дастатковую колькасць грошай на вяселле. Яго абранніца запатрабавала запрасіць на вяселле 500 гасцей, акрамя таго, хацела сукенку ад Chanel, новы аўтамабіль для паездкі ў Палац шлюбаў, а таксама мядовы месяц на астравах у Карыбскім моры. Таму жаніх адправіўся «на справу». Аднак грошы, атрыманыя падчас першага рабавання, пайшлі за адзін дзень, і яму давялося працягваць. Перш чым быць злоўленым, ён паспеў здзейсніць чатыры рабаванні на агульную суму каля 400 тыс. еўра, аднак і гэтага аказалася недастаткова для патрабавальнай нявесты. Падчас чарговага налёту на банк у Вене аўстрыец быў арыштаваны. Цяпер замест вяселля яму пагражае турэмнае зняволенне.

■ Запарожскія зладзеі прэтэндуюць на тытул «самы тупы зламыснік». Двое мужчын спачатку спрабавалі ўкрасці ў аднавяскоўца аўтамабіль, аднак іх спробе перашкодзіла блакіроўка руля. Тады яны вырашылі «ўзяць краму». Ноччу выламілі частку сцяны і ўкралі каля 2 тыс. грыўняў выручкі і прадуктаў на крыху меншую суму. Спачатку яны адзначалі поспех у Запарожжы, а потым вырашылі паехаць на поўдзень, у крымскую зону. Калі ў гулякаў скончыліся грошы, яны пачалі думаць, як дабрацца дадому. У кішэні аднаго з іх была візітоўка ўчастковага — іх раздавалі напярэдадні падчас акцыі «Візіт». Яго і папрасілі паспрыяць вяртанню, бо больш званіць не было каму. Участковы арганізаваў бясплатнае вяртанне землякоў дадому, але там іх чакаў адмысловы прыём — праваахоўнікам ужо ўдалося ўстанавіць вінаватых у спробе выкрадання аўтамабіля і крадзяжы з магазіна. Шчоўкнулі наручнікі...

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ВАДЗІЦЕЛЯ ЗАТРЫМАЛІ

Супрацоўнікі Віцебскага УУС на працягу некалькіх гадзін затрымалі вадзіцеля, які ўцёк з месца ДТЗ, паведамілі ў аддзеле інфармацыі і грамадскіх сувязяў Віцебскага аблвыканкама.

У выніку аварыі, якая адбылася напярэдадні вечарам у гарадскім пасёлку Сураж Віцебскага раёна, быў збіты пешаход 1972 года нараджэння. Ад атрыманых цялесных пашкоджанняў хлопец загінуў на месцы. Вадзіцель з месца здарэння ўцёк, аднак сведкі ДТЗ запомнілі прыкметы машыны і кірунак, у якім аўтамабіль паехаў, аб чым і паведамілі ў міліцыю. Для затрымання віноўніка ДТЗ быў аб'яўлены план «Перахоп». У выніку ўжо праз некалькі гадзін быў знойдзены аўтамабіль ВАЗ-2109 з тэхнічнымі пашкоджаннямі, а яшчэ праз нейкі час затрыманы і яго вадзіцель. Следствам выяўлена, што наезд учыніў 23-гадовы малады чалавек, які не мае вадзіцельскага пасведчання і на момант учынення аварыі знаходзіўся ў стане алкагольнага ап'янення. Машына належала яго знаёмаму.

БЕЛТА.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже *складской базы* (имеется ж/д ветка), в составе: административные здания, об. пл. 105,1 кв.м; 66,1 кв.м; здание склада № 1, 1025,7 кв.м; здание склада № 2, 985,5 кв.м; здание склада № 3, 581,6 кв.м; гараж металлический (6х12); канализационная площадка; крановая эстакада; противопожарный водоем; склад цемента (250 тон); территория базы (песчано-гравийное покрытие); асфальтированная площадка (2321 кв.м); забор ж/б (352 м.п.), расположенной по адресу: *Минский район, г. Заславль, ул. Привокзальная, 2.* Начальная цена с НДС (снижена) – 1 520 000 000 бел. руб. Под обслуживание объектов недвижимости сформировано три земельных участка – 0,1084 га; 0,5319 га; 0,5854 га. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 17.02.2009 г. Аукцион состоится **24 марта 2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **23 марта 2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

Контактный телефон: (8017) 224 61 34.
Сайт в интернете: www.rlt.by.

УНП 690324015

ДАПАМОГА І... ПАДМАН

Будзь у курсе!

Як працуюць сапраўдныя сацыяльныя работнікі і што трэба ведаць, каб не стаць ахвярай аферыстаў?

Нядаўна ў праграме Андрэя Малахава «Няхай гавораць» абмяркоўвалася тэма аферыстаў, якія пад выглядам работнікаў сацыяльных і іншых службаў уваходзяць у давер да адзінокіх пенсіянераў, пасля чаго тыя застаюцца без сваіх грашовых зберажэнняў, каштоўнасцяў і ўзнагародаў. Асабліва ўразіў аповед унучкі знакамітага расійскага дырыжора. Гарачыя апладысменты, воклічы «Брава!» і... элементарнае махлярства ў выкананні «сацыяльных работнікаў». Для жанчыны гэта быў такі ўдар, вытрымаць які яна так і не здолела. Як лічыць унучка, не аб украдзеным яе бабуля перажывала, а таму, што заслужанаму, прыстойнаму чалавеку наплявалі ў душу. Неўзабаве жанчына памерла...

Мяркуем, што выказаныя ў гэтым артыкуле парады будуць карыснымі для нашых чытачоў, кожны з якіх зусім не застрахаваны ад махлярскіх спробаў завалодаць чужым. Але спачатку — аб сапраўдных сацыяльных работніках.

«Наша Каця»

У Гродзенскім раённым тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва на сёння працуюць 74 сацыяльныя работнікі, якія дапамагаюць вырашаць самыя надзённыя пытанні 654 чалавекам. Калі даход перавышае пражытковы мінімум і ў чалавека ёсць дзеці, то з ім заключаецца дагавор на платнае абслугоўванне. Сума фіксаваная — цяпер гэта 17 тысяч 300 рублёў у месяц за паслугі сацыяльнага работніка, які наведвае свайго падапечнага пяць разоў на тыдзень. Па такой сістэме абслугоўваюцца 53 пенсіянеры. А астатнія — бясплатна: такое рашэнне прыняў у 2007 годзе Гродзенскі райвыканкам у дачыненні да састарэлых людзей. Увогуле летась фінансаванне работы цэнтра сацыяльнага абслугоўвання з раённага бюджэту склала 686 мільёнаў рублёў.

Сацыяльныя работнікі ў асноўным жывуць калі не ў адным населеным пункце са сваімі падапечнымі, то на тэрыторыі гэтага сельскага альбо гарадскога (Скідаль) Савета. Дапамога аказваецца самая розная. Гэта і дастаўка прадуктаў, лекаў, і прыбіранне ў доме, і аплата камунальных паслуг... У кожнага сацыяльнага работніка ёсць танометр для вымярэння крывянога ціску. Акрамя таго, сацыяльны работнік павінен пацікавіцца спраўнасцю пячнога ацяплення і электраправодкі, наяўнасцю аўтаномнага пажарнага апавяшчальніка і, калі трэба, перадаць гэту інфармацыю да ведама адпаведных службаў. І, вядома ж, сацыяльныя работнікі выконваюць тое, што не прапісана ніякімі службовымі інструкцыямі. Менавіта яны часта для састарэлых адзінокіх людзей практычна адзіныя суразмоўцы. Раскажуць апошнія навіны, нешта параяць альбо проста выслухаюць.

Усе сацыяльныя работнікі, якія рэгулярна наведваюць сваіх падапечных на тэрыторыі Гродзенскага раёна, — гэта жанчыны. Праўда, пры неабходнасці можна скарыстацца і мужчынскай дапамогай па шэрагу платных паслуг, якія аказвае аддзяленне тэрміновага сацыяльнага абслугоўвання пры цэнтры. Сацыяльныя работнікі Аляксандр Кобрын з горада Скідаля і Мікалай Ашуркевіч з вёскі Васілевічы летась выканалі больш за паўтары тысячы заявак, прычым не толькі ў сваіх, але і ў іншых населеных пунктах раёна. Яны могуць папілаваць і пакалоць дровы, адрамантаваць агароджу, выканаць дробны рамонт мэблі, памяняць кран альбо замок... Расцэнкі зусім не «кусаюцца». Мяркуйце самі. Паводле цяперашняга прэйскуранта, за ўскопванне глебы ўручную (сто квадратных метраў) трэба заплаціць тры тысячы рублёў, а за выкідванне тоны гною з хлява — 1520 рублёў.

Нягледзячы на, мякка кажучы, сціплую зарплату (у сярэднім каля 300 тысяч рублёў), многія сацыяльныя работнікі працуюць у Гродзенскім раёне па дзесяць і больш гадоў. Пэўна, гэта па сілах толькі тым, хто не проста ўладкаваўся на такую працу, бо няма іншай, а быў выхаваны ў духу міласэрнасці і жадання дапамагаць людзям. Шмат добрых слоў, у прыватнасці, можна пачуць ад вяскоўцаў пра Таццяну Яўгенаўну Гуліду (Абухаўскі сельскі Савет), Ядзвігу Чаславаўну Лукуць (Сапоцкінскі пасялковы Савет), Святлану Аляксандраўну Лавягіну (Гожскі сельскі Савет), Марыю Чаславаўну Перавоз (Верцялішкаўскі сельскі Савет).

А вось вытрымкі з пісьмаў у цэнтр сацыяльнага абслугоўвання.

«Паважаныя работнікі сацыяльнай службы, выказваю вам удзячнасць, павагу за вашу нялёгкую працу, звязаную з клопатам аб састарэлых, хворых і нямоглых людзях. Асабліва я ўдзячная Тэрэзе Яўгенаўне Салдаценкавай, якая на працягу многіх гадоў клапацілася і даглядала маіх бацькоў Янушчанкаў Міхаіла Фёдаравіча і Валянціну Сцяпанаўну ў пасёлку Сапоцкін. Тэрэза — вельмі чулы, уважлівы і бязадмоўны чалавек, выконвала любое пажаданне маіх дарагіх бацькоў. Велізарны ёй чалавечы дзякуй».

Матушкіна Ларыса.

«Выказваем удзячнасць Данільчык Кацярыне за абслугоўванне нас, пенсіянераў. Наша Каця — вельмі душэўны чалавек, мілая, ласкавая, працавітая. Яна нам і лекі купляе, і завязе, калі трэба, да ўрача. Гэта наша апора, і ў нягодах з намі, і ў радасці. Гаворым ёй дзякуй, а гэтага мала. Дзякуй у кашалёк не пакладзеш. Хочам папрасіць, каб далі ёй прэмію і Ганаровую грамату».

Пенсіянеры вёсак Глушнева, Новая Руда і Бабіна.

Дырэктар Гродзенскага раённага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Наталля Бяляева гэту просьбу выканала.

Асцярожна: гэта не сацыяльныя работнікі, а махляры!

Не ведаю, як у краінах Заходняй Еўропы, а на постсавецкай прасторы аферысты ўжо даўно спекулююць на даверы пенсіянераў да работнікаў сацыяльных службаў. Пры гэтым у ход ідуць самыя розныя махлярскія спосабы. Напрыклад, у Кемераве трое маладых людзей пры садзейнічанні дворніка арганізавалі сход жыльцоў аднаго дома. Прад'явіўшы пасведчанні сацыяльных работнікаў, яны пачалі нахвальваць «цуда-масажор», які, маўляў, дапамагае ад усіх хваробаў і рэалізуецца на льготных умовах толькі паважаным пенсіянерам. На гэту «вуду» трапілі ажно 20 чалавек. Яны выклалі па 4 тысячы расійскіх рублёў за прыбор, у якога, як потым аказалася, не было ніякага лячэбнага эфекту. Ды і каштаваў ён насамрэч разоў у дзесяць менш.

У Маскве махляры тэлефанавалі пенсіянерам і паведамлялі, што Міністэрства аховы здароўя быццам праводзіць акцыю для льготнікаў. Ім прапаноўваліся дыягностыка і лячэнне ў адным з прыватных медыцынскіх цэнтраў на працягу пяці наступных гадоў. Маўляў, толькі і трэба, што заплаціць 10 працэнтаў ад кошту паслуг, а астатнія 90 працэнтаў аплачвае дзяржава. Даверлівыя людзі аддавалі па 20 тысяч расійскіх рублёў і прыходзілі ў медцэнтр, каб атрымаць дапамогу па ... фальшывых дагаворах.

У Волагдзе ў кватэру пенсіянеркі патэлефанаваў мужчына, назваўся работнікам сацыяльнай службы і прапанаваў адрамантаваць усю сантэхніку па невысокай цане. Узяў 2,5 тысячы расійскіх рублёў у якасці папярэдняй аплаты, пакінуў нейкія паперы і... след прастыў.

Не менш вынаходліва арудуюць махляры і ў Беларусі. Днём, каля дванаццаці гадзін у Магілёве 81-гадовы адзінокі пенсіянер адчыніў дзверы жанчынам, якія звярнуліся да яго праз дамафон, прычым ведаючы імя і імя па бацьку гаспадара кватэры. Тры госці назваліся супрацоўніцамі гуманітарнай арганізацыі, якая, маўляў, раздае пажылым людзям падарункі і пуцёўкі на лячэнне. А калі гэты «дабрачынны» візіт завяршыўся, то аказалася, што разам з «дабрадзейкамі» зніклі і грошы — амерыканскія і беларускія. Як, дарэчы, і нядаўна ў Гродне. «Звязда» паведамляла ўжо пра два злачынствы, якія былі здзейсненыя «сацыяльнымі работнікамі»: адна пенсіянерка пазбавілася схаваных у шафе грошай, а другая — залатых вырабаў.

А вось у Зэльвенскім раёне аферыст хадзіў па вёсках і называўся работнікам пажарнай службы, які правярае работу пячнога ацяплення. Прычым папярэджаннем гэты спецыяліст не абмяжоўваўся: няспраўнасць — штраф. І плацілі. Добра яшчэ, што зламысніка ўдалося хутка затрымаць.

Сумны вопыт кантакту з ілжывымі сацработнікамі ёсць і ў некаторых жыхароў Гродзенскага раёна. Паводле інфармацыі дырэктара раённага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Наталлі Бяляевай, у абодвух выпадках людзі пагаршылі сваё матэрыяльнае становішча ў выніку таго, што паверылі ў маючы адбыцца ўвод у абарачэнне новых банкнотаў і аддалі махлярам «на абмен» свае грошы.

Пры гэтым фіктыўныя работнікі сацыяльных, дабрачынных і іншых службаў папярэдне збіраюць інфармацыю пра сваіх будучых ахвяраў, прыходзяць раніцай альбо днём, калі ў доме толькі дзеці альбо пенсіянеры і, як правіла, аруюць не ў адзіночку. Адзін міла гутарыць з чалавекам, а другі — умела абшнарвае кватэру.

Як жа папярэдзіць падобныя злачынствы? Вось некаторыя парады ад Гродзенскага раённага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва.

Па-першае, *трэба ведаць, што за кожным населеным пунктам замацаваны пэўныя спецыялісты, якія перыядычна наведваюць грамадзян сваёй акругі. Прозвішчы гэтых работнікаў можна высветліць у раённым тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва.*

Па-другое, *у кожнага спецыяліста ёсць пасведчанне з указаннем прозвішча, пасады, назвы ўстановы і фатаграфіяй. Калі ўзнікаюць сумненні ў сапраўднасці гэтага дакумента, неабходна патэлефанаваць у цэнтр сацыяльнага абслугоўвання, у сельсавет альбо ў міліцыю па нумары 102.*

Па-трэцяе, *пры наведванні населенага пункта ў спецыялістаў маюцца спісы, дзе пазначаны год нараджэння, прозвішча, імя і імя па бацьку, а таксама адрасы грамадзян, якіх трэба наведаць.*

Па-чацвёртае, *калі просяць паглядзець узнагароды, медалі, дакументы на нерухомасць, якія-небудзь каштоўныя рэчы, цікавяцца наяўнасцю ў доме грошай, то гэта не спецыялісты цэнтра сацыяльнага абслугоўвання, а злачынцы і неабходна зараз жа патэлефанаваць па нумары 102.*

Ды і хіба ж абавязкова запрашаць незнаёмцаў у дом, калі вы не ўпэўненыя, што гэта за людзі? Лепш паказацца няпрошаным гасцям не надта ветлівым, чым быць абдураным, абрабаваным і зняважаным маральна.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Фота БЕЛТА.

На слыху

МАХЛЯР «КІНУЎ» БАНКІ

Летась за тры месяцы індывідуальны прадпрымальнік з Мінска ўхітрыўся падмануць адразу шэсць беларускіх банкаў і завалодаў буйной сумай грошай. Як мяркуецца, 23-гадовы бізнэсмен на працягу красавіка-чэрвеня мінулага года змог з дапамогай махлярства разжыцца ў банках 52 тысячамі долараў.

У ДТЗ ЗАГІНУЛІ ДВОЕ

Каля паловы на дванаццатую дня 47-гадовы галоўны эканаміст аднаго з салігорскіх прадпрыемстваў, які знаходзіўся за рулём «Опеля», выехаў на сустрэчную паласу на дарозе паблізу вёскі Кулакі Салігорскага раёна і сутыкнуўся з аўтамабілем «Жыгулі», якім кіраваў 68-гадовы пенсіянер. Для апошняга, а таксама яго пасажыркі, 53-гадовай жанчыны, сутыкненне скончылася трагічна — яны загінулі. Вадзіцель «Опеля» і муж загінулай, які знаходзіўся ў салоне «Жыгулёў» з цялеснымі пашкоджаннямі змешчаны ў бальніцу.

Кацярына СОКАЛ-ЭЛЧАКЯН.

ВЯДРА ВАДЫ НЕДАСТАТКОВА,

каб затушыць пажар. На асабістым вопыце пра гэта даведаліся гаспадары дома ў вёсцы Рычаў Жыткавіцкага раёна. Гаспадар дома раніцай пакурыў на печы і пайшоў на працу. Куды трапіў незатушаны акурак, невядома, але ж гаспадыня, якая вярталася з фермы дадому, пачула гук аўтаномнага пажарнага апавяшчальніка і паскорыла крок. Пабачыўшы, што дым ідзе ад печы, схапіла вядро вады, хуценька заліла ёю ўсё і пайшла да мужа расказаць аб здарэнні. Аднак агонь не патух. Калі яны зноў вярнуліся дадому і адчынілі дзверы, увайсці ў хату было ўжо нельга — такім моцным было задымленне. Давялося клікаць на дапамогу выратавальнікаў, якія ліквідавалі ўзгаранне. Мэбля і іншая маёмасць у доме моцна пацярпелі, аднак сам дом захаваўся — у тым ліку і таму, што гаспадары не сталі біць шыбы.

Летась на сямі пажарах у Гомельскай вобласці, дзе спрацавалі аўтаномныя пажарныя апавяшчальнікі, выратавана 12 чалавек, сёлета на двух — яшчэ тры чалавекі.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ЖЫХАР КАМЯНЦА ВЫПЛАЦІЦЬ ШТРАФ У BR700 ТЫС. ЗА ЗНЯВАГУ МЫТНІКАЎ

Пра гэта паведамілі ў прэс-групе Брэсцкай мытні.

Такое рашэнне вынес Камянецкі раённы суд у дачыненні да 22-гадовага жыхара г. Камянца, які 20 студзеня 2009 года ў пункце мытнага афармлення «Пясчатка» ў грубай форме аспрэчваў рашэнне службовых асобаў мытні, якія адмовілі яму ў выдачы пасведчання аб мытным афармленні тавару, які ўвозіўся з Польшчы. Грамадзянін быў прызнаны вінаватым у зняважэнні адказных асобаў Брэсцкай мытні, якія знаходзіліся пры выкананні службовых паўнамоцтваў, і пакараны адміністрацыйным спагнаннем у выглядзе штрафу ў даход дзяржавы ў памеры 20 базавых велічынь (Br700 тыс.). Кіраўніцтва Брэсцкай мытні, забяспечваючы ўважлівае стаўленне сваіх супрацоўнікаў да грамадзян, разлічвае на разуменне і карэктныя паводзіны насельніцтва.

Кар. БЕЛТА.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ ОБЪЕКТА ДОЛЕВОГО СТРОИТЕЛЬСТВА

ООО «ДИНАСИСТЕЙТ» информирует юридических и физических лиц о создании **объекта долевого строительства.**

ЗАСТРОЙЩИК (заказчик) – ООО «ДИНАСИСТЕЙТ»

Зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета от 28 сентября 2000 г. № 1097, в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100984486. Застройщиком осуществлено строительство жилых домов по адресу: г. Минск, ул. Крупская, д. 23 и д. 25, ул. Кулешова, д. 76.

Адрес: 220007, г. Минск, ул. Аэродромная, 125, помещение 1, комната 12, телефон 2245129. Режим работы по вопросам долевого строительства: понедельник–пятница с 09.00 до 17.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

Цель проекта строительства – исполнение решений Мингорисполкома «Об изъятии и предоставлении земельного участка и разрешении строительства» № 251 от 14 февраля 2008 г. и № 539(1) от 20 марта 2008 г. на строительство объекта «Жилые дома №№ 4 и 5 (не относящиеся к домам повышенной комфортности) по генплану по ул. Крупской с устройством административных помещений в цокольных этажах в составе объекта «2-я очередь реконструкции жилой усадебной застройки в границах ул. Плеханова – Малинина – Крупской – прибрежной зоны р. Слепянка».

Объект долевого строительства – жилые дома (ж/д № 4 по генплану – 3-секционный, ж/д № 5 по генплану – 2-секционный) представляют собой 5-этажные жилые дома с размещением в цокольном этаже административных помещений. Здания запроектированы на основе безригельной каркасной системы с плоскими монолитными дисками перекрытия. Каркас и перекрытия – монолитный железобетон. Наружные стены и внутренние перегородки – керамзитобетонные блоки. Оконное заполнение и остекление лоджий – изделия ПВХ. Кровля – плоская, покрытие – рулонные материалы. Проезды, площадки, тротуары – асфальтобетон, тротуарная плитка. Для отопления жилого дома принята поквартирная система с установкой индивидуальных источников отопления. Высота этажа – 2,7 м. Наружная отделка – утепление стен, штукатурка, покраска акриловыми красками. Цоколь здания – облицовка естественным камнем.

Жилая часть: общая площадь квартир за вычетом площади

Заснавальнікі — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 12 ад 19 лютага 2009 г.

6

САКАВІКА
2009 г.
ПЯТНІЦА
№ 9 (15563)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

«НЕ ЗАБЫВАЙЦЕСЯ: МЫ ТАКСАМА МОЖАМ ЗА СЯБЕ ПАСТАЯЦЬ...»

На парозе вялікае свята, якое нясе ў сабе для кожнай жанчыны, дзяўчыны і нават бабулі шмат надзей на самае лепшае, прыгожае і ўрачыстае. Іншае пытанне, ці спраўджваюцца ўсе яны, гэтыя самыя надзеі. Мы, жанчыны, хоць бы ў гэты дзень чакаем ад сваіх мужчын нечага незвычайнага...

Гэта, на жаль, здараецца не заўсёды. Жыццё наша пабудавана так, што ў бясконцай кругаверці падзей не маеш часу на адпачынак. А жанчынам, тым, каму, здавалася б, трэба адчуваць сябе прыгожай, каштоўнай кветкай у гэтым садзе жыцця, прыходзіцца час ад часу забыцца на сваю слабасць і бездапаможнасць. Вось і здараецца так, што мы займаем месцы ў гэтым жыцці, якія проста ніяк не суадносяцца з азначэннем — жанчына. Я не палезу далёка ў нетры, а проста раскажу вам, шаноўныя чытачы, пра адну сваю знаёмую — Кацярыну Сасновіч. Яе можна аднесці да разраду моцных жанчын. І не толькі таму, што яна працуе, здавалася б, на мужчынскай рабоце. Каця вырасла сярод хлопчыкаў. З самага дзяцінства ёй даводзілася адстойваць сваю пазіцыю сярод тых, хто не хоча і не любіць прызнаваць сваю няпраўду, а часам і слабасць. Але менавіта дзякуючы ім яна атрымала дастатковую загартоўку характару, якая цяпер дапамагае ёй працаваць і ўзаемадзейнічаць у калектыве. Што гэта за праца, пра якую я так шмат кажу? Кацярына працуе ў службе аховы ў адным з начных клубаў нашай сталіцы. Я не называю гэту ўстанову. Але, як мне падаецца, той, каму трэба, здагадаецца сам, што гэта за месца.

Яшчэ зусім нядаўна Каця была звычайнай студэнткай, жыццё якой абмяжоўвалася ўніверсітэтам і домам. Плюс-мінус сустрэчы з сябрамі і тусоўкі на начных дыскатэках. А дзесьці каля 2 гадоў таму ўсё змянілася. Тыя начныя тусоўкі, на якіх ёй здаралася бываць у якасці госці, цяпер сталі яе працай. І студэнцкае жыццё больш не турбуе яе так, як некалі. Цяпер Каця — студэнтка завочнага аддзялення **Мінскага інстытута кіравання і прадпрымальніцтва.** Дарэчы, на завочнае аддзяленне яна перавялася зусім нядаўна. Так прасцей працаваць. Не перашкаджаюць лекцыі, якія трэба наведваць, нягледзячы на тое, што ты працуеш у начную змену і вельмі цяжка пасля яе яшчэ адсядзець на парах. Цяпер у Каці больш вольнага часу.

Мяне цікавіла, якім чынам трапіла Каця на гэта працоўнае месца. Дзяўчына і служба аховы — гэта, на мой погляд, рэчы несумяшчальныя.

— Па праўдзе кажучы, — усміхнулася мне ў адказ дзяўчына, — ад знаёмых краем вуха пачула, што патрабуецца дзяўчына ў службу аховы ў начны клуб. Прыйшла і прапанавала сваю кандыдатуру, якая, як бачыце, падышла.

— А ці валодаеш ты, Каця, якімі-небудзь відамі баявых мастацтваў?

— Ужо каля 3 гадоў займаюся **тайскім боксам.** Гэты від мне падабаецца асабліва. Ды і на працы дапамагаюць тыя навыкі, якія я атрымала за час заняткаў ім.

Вось так. Насамрэч слабая жанчына не змагла б працаваць на гэтай пасадзе. Як лічыць сама Каця, фізічныя і маральныя якасці тут зліваюцца ў адно. Калі тыя слабы характарам, то надоўга тут не затрымаешся. А калі целам — то наогул не мае сэнсу ісці сюды працаваць.

Каця раскрыла мне шмат сваіх прафесійных сакрэтаў, якія я, вядома ж, не магу перадаць поўнасцю. Сакрэт — ён і ў Афрыцы сакрэт. Але ў агульным плане нешта сказаць змагу.

«ПРА КАЛЕКТЫЎ...»

— Раскажы, калі ласка, як складваюцца адносіны ў поўнасцю мужчынскім калектыве? Як гэта — быць адзінай дзяўчынай на працы? Мабыць, прыемна?

— Адносіны проста суперскія! Сапраўды. Я сваіх хлопцаў люблю, паважаю, цаню. Я вельмі рада, што працую менавіта ў такім калектыве. Яны для мяне замест старэйшых братоў. Ведаеш, такія клапатлівыя, добрыя. Заўсёды мне дапамагаюць, даюць парады. Мы заўсёды дзелімся сваімі праблемамі і радасцямі. Гэта самае прыемнае. З імі расце мой талент. Куды-куды, а на працу я заўсёды іду з радасцю.

— А бачыцеся вы толькі на працы ці яшчэ сустракаецеся?

— Мы разам ходзім на дыскатэкі. Пасля працы, калі скончылася дыскатэка, можам пасядзець. Пагутарыць. Калі цёпла, вясной ці летам, разам ходзім на шашлыкі. Праўда, у госці хадзіць адзін да аднаго не заўсёды атрымліваецца. Гэта тлумачыцца тым, што працуем мы па розных зменах. Але часта тэлефануем адзін аднаму.

«ПРА ЗМЕНЫ...»

— Які твой графік працы?

— Мая працоўная змена заўсёды прыпадае на самыя наведвальныя дні на дыскатэцы. Гэта значыць, чацвер, пятніца, субота. Плюс на канцэртах, якія праводзяцца ў асноўным па будных днях. А таксама на раніштках. Як атрымаецца.

— Што ўваходзіць у твае абавязкі?

— Асноўная мая задача — глядзець за дзяўчатамі. Я правяраю сумачкі пры ўваходзе, кішэні, стаўлю пячаткі. А таксама — у зале. Там я непасрэдна даглядаю, як малых дзетак, дзяўчат. Калі, скажам, дзяўчына не ў надта цвярозым стане, мне трэба вывесці яе з залы.

«ПРА ЗНЕШНІ ВЫГЛЯД...»

— А ці ёсць нейкія абмежаванні па адзенні? Якую форму апранаеце?

— Абмежаванне адно: адзенне павінна быць чорнага колеру. Красоўкі можна, але чорныя. Калі ты ў класічным варыянце, касцюмчык, абцасікі... Гэта добра. Дырэкцыі гэта падабаецца. Але ж усю ноч на абцасіках не пабегаеш. Праўда, адзенне наша хутка псуецца. Бойка якая-небудзь — і ляціць па швах наша форма. У нас ужо ёсць своеасаблівае міні-атэльe па рамонце адзення. Парвалася — так, значыць ідзём зашывацца.

«ПРА ГРОШЫ...»

— Калі не сакрэт, скажы, калі ласка, колькі плацяць на такой працы?

— Ну, я скажу так. Мне хапае і нават задавальняе тая сума, якую я атрымліваю. Часам, нават маме падкідваю на дробныя выдаткі.

Прыкладна так выглядаюць ахоўніцы ў начных клубах.

— І на што маладая сімпатычная дзяўчына растрачвае свой заробак?

— На сябе, любімую. Я ж дзяўчына. І ў мяне заўсёды столькі планаў. Вось на іх ажыццяўленне зароблены грошы і растрачваюцца.

«ПРА АДНОСІНЫ...»

— Як складваюцца адносіны паміж персаналам клуба і наведвальнікамі?

— З кожным па-рознаму. Ёсць людзі, якія цябе проста ігнаруюць, нават не павітаюцца. Мяне гэта мала турбуе. А ёсць людзі, якія табе дапамагаюць і ставяцца да тваёй персоны толькі з найлепшымі пачуццямі *(усміхаецца)*.

— А ці здаралася табе адчуваць на сабе рэўнасць з боку дзяўчат? Жаночыя адносіны — цяжкія адносіны. Тым больш, калі ўлічваць, што калектыў мужчынскі. А паклонніц, ці нават фанатак у хлопцаў-ахоўнікаў хапае. І ты можаш ім уяўляцца як суперніца.

— Амаль усе нашы хлопцы-ахоўнікі маюць каханых. І тыя фанаткі ім не ўяўляюцца ў якасці чагосьці сур'ёзнага. І я ў іх асобах суперніц не бачу. А што мроіцца ім, дык гэта не мая справа. Самая вялікая шкода, якую яны могуць зрабіць, дык гэта дэманстратыўна не адкрыць сумачку для даведкі за дзвюма чарамі. І правяраю гляду. Проста пастараюцца прайсці міма. Але...

«ПРА НАСТРОЙ...»

— Колькі хаджу на дыскатэку, столькі бачу, што вас, супрацоўнікаў клуба, цягне на танцпол. Так і хочацца вам патанцаваць. А ці можна адпачываць супрацоўнікам у тым месцы, дзе яны працуюць?

— Не. А танцаваць часам хочацца. І надта. Але ёсць начальства, якое не дазваляе нам адпачываць у нашым клубе. Хоць я не разумею, чаму. На мой погляд, было б лепш, калі б я тыя грошы, якія збіраюся пакінуць у іншым клубе, пакінула ў сваім. Прыбытак. Тыя грошы, якія я зарабіла, тут жа і пакінула.

— А якой музыцы аддаеш перавагу?

— Наогул, люблю розную музыку. Ад папсы і да шансона. Прычым слухаю такія рэчы, якія хлопцы нашы наогул не ўспрымаюць. А мне падабаецца. Я ж вырасла сярод хлапцоў.

«ПРА ВЫПАДКІ...»

— Ці здараліся калі-небудзь падчас тваёй змены нешчаслівыя выпадкі?

— Было аднойчы, што дзяўчына, у надта нецвярозым стане, звалілася з лесвіцы. Проста з'ехала па ёй, а напрыканцы шляху дзеўбанулася галавой аб столік. Пакуль ехала «хуткая дапамога», мы стараліся ёй дапамагчы. Анекдоты нават расказвалі, каб адцягнуць увагу ад раны...

— Ад сумнага пяройдзем да смешнага. Ці былі кур'ёзы на працы?

— Адноўчы я ўпала непасрэдна на адпачывальніка. Было гэта падчас пеннай вечарыны. Падлога была слізкая, ды і пены па калена. Я трошкі не далічылася прыступак і перамахнула праз адну. Прычым я збіралася разбудзіць таго чалавечка, на якога ўпала. А атрымалася так, што ён жа мяне і злавіў, такім чынам выратаваўшы ад падзення. Пасмяяліся разам.

«ПРА МУЖЧЫН...»

— Як ты лічыш, ці існуюць сапраўдныя мужчыны ў наш час?

— Так. Безумоўна.

— Хто гэта, на твой погляд, сапраўдны мужчына?

— З таго моманту, калі я пачала працаваць у клубе на такой пасадзе, маё ўяўленне пра сапраўдных мужчын змянілася. Я стала надта пераборлівай. На мой погляд, мужчына павінен быць моцным, цікавым, вопытным. Мне падаецца, што за моцным мужчынам жанчына, нават такая ж моцная ці тая, якая сябе заўсёды такой выстаўляе, можа дазволіць сабе пабыць слабай і проста схавацца за яго шырокімі плячыма. Не думаць ні пра што. Часам гэтага так хочацца.

— А калі ты знаёмішся з хлопцамі, ты ім прызнаешся, дзе працуеш?

— Не. Я кажу, што я там афіцыянтка ці наогул не працую. А калі мне кажуць, што збіраюцца да мяне завітаць, то адразу знаходжу сотню прычын, абы не пускаць іх да сябе на працу. Моцных жанчын у нас баяцца. А тое, што я працую на такой пасадзе, з'яўляецца паказчыкам таго, што я моцны чалавек.

«ПРА СВЯТА...»

— Што хочаш пажадаць дзяўчатам напярэдадні 8 Сакавіка?

— Жадаю ўсім быць каханымі і, безумоўна, кахаць. Поспехаў на працы і ў сям'і. Заставайцеся заўсёды жанчынамі, прыгожымі і непаўторнымі. Але, у той жа момант, дзяўчаты, не забывайцеся на тое, што мы заўсёды можам за сябе пастаяць. Я люблю сваю матулю. І, карыстаючыся момантам, віншую яе са святам. На жаль, 8-га я буду працаваць, але гэта не бяда. Мае супрацоўнікі, я спадзяюся, павіншуюць мяне асабліва ўрачыста. І свята будзе сапраўднае.

Вось такая моцная дзяўчына Каця, якая працуе на мужчынскай працы, але мае прыгожую, сапраўдную жаночую натуру. Ёй, як і ўсім нам, уласціва марыць пра каханне. І гэтай рамантыкі яна не цураецца. Месца працы — гэта яшчэ далёка не паказчык таго, чаго ты варты. Са святам вас, любыя жанчыны! Не забывайцеся на права імі звацца.

P. S. Фотаздымак гераіні ў матэрыяле не змяшчаецца. Гэта забаронена кодэксам установы, у якой працуе Каця.

З моцнай жанчынай размаўляла студэнтка БДПУ імя Максіма Танка Наталля БЕЛЬЧАНКА.

Пасля пісьма

ДЭФІЦЫТ НА... ЛЕТНІ АДПАЧЫНАК

«Сітуацыя з летнім аздараўленнем у Жодзіне летась, асабліва ў ліпені-жніўні, насцярожвала, а часам нават засмучала. Большасць дзяцей аказаліся нікому не патрэбнымі, заставалася хіба спадзявацца на дзіва, што пакуль бацькі працуюць, нічога не здарыцца. Прычым малюнак можа паўтарыцца сёлета...». Абмінуць увагай гэтыя радкі з электроннага пісьма ў рэдакцыю было немагчыма. Таму з'явілася рашэнне — скіравацца ў горад беларускіх аўтабудаўнікоў. Тым больш, што з надыходам вясны да пачатку чарговага «высокага сезона» ў аздараўленчых лагерах засталося насамрэч няшмат часу.

Прапанова нараджае попыт

Крыху больш за паўсотню кіламетраў ад сталіцы. 62-тысячнае Жодзіна не без падстаў лічыцца адным з найбольш маладых гарадоў Беларусі, які (факт па-сапраўднаму рэдкі) мае натуральны прырост насельніцтва. Пры гэтым кожны дзявяты жодзінец — дзіця ці падлетак. Адсюль і ўся пікантнасць сітуацыі з летнікамі. Вядома, што хтосьці са школьнікаў з'язджае на канікулы да дзядуляў і бабуль. Але далёка не ўсе.

— Летась удалося наладзіць аздараўленне 1493 дзяцей у загарадных і 1858 дзяцей у школьных лагерах, — кажа галоўны спецыяліст прадстаўніцтва Мінскага абласнога ўпраўлення па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва па Жодзіне Ніна Казлоўская. — Гэтыя паказчыкі аказаліся нават вышэйшымі, чым планавалася спачатку, прычым у тым ліку дзякуючы арганізацыі адпачынку ў іншых рэгіёнах. Словам, вялікага ажыятажу вакол пуцёвак мы не назіралі. Праўда, усё ж нельга не заўважыць: бацькоў, якія маглі б адправіць дзяцей у летнікі, магло быць і больш. Калі б мы мелі больш тых самых летнікаў на сваёй тэрыторыі. Не так даўно загарадных лагераў у нас было два, але цяпер застаўся толькі адзін.

Вета ад санслужбы

Мы кажам Жодзіна — маем на ўвазе БелАЗ. Справа не толькі ў тым, што цяперашні горад абавязаны свайму з'яўленню менавіта гіганту айчыннага аўтапрама. На заводзе «завязана» значная частка мясцовай інфраструктуры, у прыватнасці, дзіцячы загарадны лагер.

Летась загарадны лагер БелАЗа прыняў 591 дзіця. Прычым, што да якасці, ніякіх прэтэнзій да ўласніка быць не можа. Летась аўтазавод уклаў у аднаўленне і мадэрнізацыю летніка 120 млн рублёў. Укладанні плануюцца і сёлета.

Зусім іншая сітуацыя з лагерам, які належыць жодзінскай ЦЭЦ. Неабходнасць рэканструкцыі спальных карпусоў, блока харчавання, водаправода, пракладка каналізацыі, будаўніцтва медыцынскага пункта, добраўпарадкаванне стадыёна, дзіцячых пляцовак і пляжа — вось толькі некаторыя прэтэнзіі з боку санітарных службаў. Як вынік, пазалетась увосень лагер зачынілі — летась ён ужо не працаваў.

У нечым сітуацыю патрапіла згладзіць за кошт профільных лагераў і дзённых лагераў пры школах. Аднак па-сапраўднаму яны працавалі толькі ў першую змену, ліпень-жнівень застаўся практычна «за кадрам». Прычыны тут розныя. Сярод аб'ектыўных — грошы на «дзённы» варыянт былі асвоены менавіта за чэрвень, да таго ж надалей школы ўзялі «тайм-аўт» для падрыхтоўкі да новага навучальнага года. Разам з тым малюнак аказаўся неадназначным. Паводле слоў начальніка ўпраўлення адукацыі Жодзінскага гарвыканкама Яўгена Горыда, магчымасці атрымаць пуцёўку напрыканцы лета таксама былі — у 9-дзённыя профільныя лагеры. Не было ахвотных, асабліва калі гаворка ішла пра накіраванне ў «лагеры па інтарэсах» у іншых рэгіёнах.

Новы сезон. Ранейшы расклад?

Бацькі на рабоце — дзеці прадастаўленыя самі сабе. А ў сваю чаргу гэта можна лічыць фактарам рызыкі. «Няма чым заняцца» — прамы шлях да магчымых правапарушэнняў. Апроч таго, лета было і застаецца найбольш спрыяльным часам для аздараўлення. Вялікія канікулы на асфальце падрыхтоўцы да школы ніяк не спрыяюць. Таму пытанне, што далей, сваёй вастрыні не губляе.

— Пакуль аб'ёмы фінансавання невядомыя, але сёлета, як і раней у першую змену будуць працаваць дзённыя школьныя лагеры, будуць давацца пуцёўкі ў лагеры профільныя, — кажа Яўген Горыд. — Прычым, каб вырашыць «праблему адлегласцяў», мы мяркуем наладзіць работу профільных лагераў у кожнай навучальнай установе. Але пры адной вельмі істотнай умове: калі будуць грошы.

Практычна ранейшай застанецца і схема загараднага аздараўлення. Яго памеры не павінны зменшыцца. І ў той жа час ужо цяпер можна канстатаваць, што летнік жодзінскай ЦЭЦ працаваць сёлета не будзе. Яго рэканструкцыя ацэньваецца ў мільярды рублёў — на сёння тут замоўлена толькі неабходная праектная дакументацыя.

Больш аптымістычная сітуацыя з лагерам БелАЗа. Працаваць ён будзе. Праўда, тут ужо ўзнікаюць пытанні з... падрыхтоўкай летніка да сезону. Бо зразумела: сусветны эканамічны крызіс не можа не адбівацца на становішчы айчыннага аўтагіганта.

Грашовы пасьянс

Прадпрыемствы, што ўтрымліваюць сацыяльныя аб'екты, ёсць паўсюль, падобная практыка існуе не толькі ў Беларусі. Прычым нічога дрэннага тут нібыта няма. Калі б не адна акалічнасць. Сёння завод можа знаходзіцца на ўздыме, а заўтра — сутыкнуцца з праблемамі. Якімі будуць наступствы ў апошнім выпадку, здагадацца няцяжка. Безумоўна, адмаўляцца ад свайго загараднага лагера БелАЗ не збіраецца. Аднак прыкладаў іншага кшталту ў краіне, на жаль, ужо шмат.

На першы погляд, цалкам лагічнае выйсце — перадача аздараўленчых летнікаў на баланс мясцовых уладаў, тым больш, што само па сабе паняцце «лагер прадпрыемства» часам даволі сімвалічнае — тут адпачываюць дзеці з усяго раёна. Аднак тут таксама ёсць падводныя камяні. Разлічваць на больш-менш роўныя ўмовы ў гэтым выпадку нельга, бо заўсёды існуюць рэгіёны-донары і рэгіёны-рэцыпіенты. Да таго ж яны могуць лёгка памяняцца месцамі. Любы збой у рабоце буйнога прадпрыемства адбіваецца на бюджэце пэўнага горада ці раёна. Вынікам становіцца той жа дэфіцыт грошай.

Нарэшце, варыянтам нумар тры можна лічыць перавад загарадных летнікаў на фінансаванне з дзяржаўнага бюджэту. Варыянт з агаворкамі, скажам, ролі прадпрыемстваў ці рэгіёнаў адмаўляць таксама нельга. Аднак нельга не заўважыць, што часта альтэрнатывы тут проста няма.

Безумоўна, дзяржаўцы на падрыхтоўку загарадных летнікаў да сезона ёсць і сёння. Аднак, у прыватнасці, на 31 загарадны лагер Мінскай вобласці павінна быць выдаткавана каля 200 мільёнаў. У лепшым выпадку, такіх грошай хопіць на фарбу. Тым часам не сакрэт: прэтэнзіі санітарных службаў і пажарных часта цалкам слушныя, стан многіх летнікаў набліжаецца да крытычнага. Выратаваць іх зможа толькі кардынальнае «ўліванне» сродкаў. Бо страціць заўсёды лёгка. А вось вярнуць — далёка не.

Сяргей ГРЫБ.
Мінск — Жодзіна.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЯК ЗАМАЦАВАЦЬ МОЛАДЗЬ У РЭГІЁНАХ?

ІДЗЕ РАСПРАЦОЎКА НОВАГА МОЛАДЗЕВАГА ЗАКОНА

За рэалізацыяй моладзевай палітыкі ў Магілёўскай вобласці разам з рабочай групай парламентарыяў назіраў карэспандэнт «ЧЗ».

Пра тое, што ў Беларусі выспела неабходнасць прыняцця новага закона адносна дзяржаўнай моладзевай палітыкі, гаварылі даўно. Закон, які дзейнічае ў краіне сёння, быў прыняты яшчэ ў 1992 годзе і меў назву «Аб агульных асновах дзяржаўнай моладзевай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь». Зразумела, што правілы, прапісаныя ў ім, даўно змяніліся і патрабуюць дапрацоўкі.

Фота ВЕЛТА.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусі наведалі Магілёўскую вобласць, у прыватнасці шэраг прадпрыемстваў Бялыніцкага, Круглянскага, Магілёўскага і Шклоўскага раёнаў.

Спікер Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА зазначыў: «Няма ніводнай галіны эканомікі, сацыяльнай сферы, дзе б не працавалі маладыя людзі. На сёння па рэспубліцы робіцца шмат у стварэнні ўмоў для маладых людзей, рэалізацыі іх патэнцыялу, і мы лічым, што найбольш у гэтым плане прасунулася Магілёўская вобласць, таму выбар гэтага рэгіёна — невыпадковы».

Насельніцтва Круглянскага раёна складае 16 200 чалавек, з якіх 3420 — моладзь. Адным з прыярытэтных кірункаў у раёне называюць стварэнне вытворчых брыгад з ліку моладзі, якія працуюць на будаўніцтве сацыяльна значных аб'ектаў раёна. Улічваючы высокі ўзровень зарплаты, моладзь не спяшаецца пакідаць сваю працу.

Сярэдні заробак па арганізацыях, паводле слоў **начальніка Круглянскага ПМК-266 Мікалая МАТРОНЧЫКА,** — Br 1 137. У самім г.п. Круглае працуюць дзве моладзева-вытворчыя брыгады ПМК-266, заробак якіх вагаецца ў межах Br1400-1700. «Вытворчыя брыгады — гэта матэрыяльны стымул для маладых людзей, які спрыяе здаровай канкурэнцыі ў працы?» — упэўнена **другі сакратар раённага камітэта «БРСМ» Няталля ШКАПЦОВА.**

Адзін з аб'ектаў, якія прыводзілі да парадку моладзевыя брыгады ПМК-266, сёння носіць назву моладзевага цэнтра па арганізацыі вольнага часу і забаў «Эльдарада», які быў створаны ў 2003 годзе. На сёння «Эльдарада» — адна з галоўных устаноў па арганізацыі вольнага часу дзяцей і моладзі, у ёй працуюць шматлікія гурткі і клубы па інтарэсах.

Школа ў г.п. Круглае асабліва. Пагадзіцеся, не кожная сярэднеадукацыйная ўстанова можа пахваліцца стаматалагічным кабінетам. У Круглянскай СШ № 1 ён ёсць. І гэта не мяжа. Як расказаў дырэктар школы, ніводзін з 85 работнікаў установы не курыць, чым паказвае наглядны прыклад навучэнцам. А іх у Круглянскай школе 548 чалавек. Адзін з пунктаў моладзевай палітыкі школы — заахвочванне да здаровага ладу жыцця: вялікая спартыўная зала, трэнажорная зала фізічнай гімнастыкі, зала рытмікі і танца.

А вось сярод праблем, з якімі сутыкнулася школа, дырэктар назвае праблему няўдалых сем'яў.

Як патлумачыла журналістам **намеснік старшыні Круглянскага райвыканкама Тамара АКСЁНАВА,** у раёне вядзецца праца з 67 няўдалымі сем'ямі. Дзеці ў такіх сем'ях, паводле слоў Тамары Аксёнавай, знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, і бацькі ў такіх сем'ях пазбаўляюцца бацькоўскіх правоў. Большасць няўдалых сем'яў складаюць няпоўныя сем'і, якія пражываюць пераважна ў сельскай мясцовасці. Тамара Аксёнава прапануе ўраўнаванне грашовай сацыяльнай дапамогі на дзіця да трох гадоў як у поўнай, так і няпоўнай сям'і...

Адзін з самых буйных раёнаў Магілёўшчыны — Шклоўскі — стаў другім месцам прыпынку парламентарыяў. Моладзі сярод насельніцтва ў рэгіёне — роўна трэць.

Як зазначыў **дырэктар Александрыйскага вучэбнага педагагічнага комплексу «Дзіцячы садок — сярэдняя школа» Андрэй ЛОСЕЎ,** галоўным тут лічаць выхаванне грамадзян.

Акрамя таго, у Александрыі існуе Цэнтр культуры і вольнага часу «Александрыйскі», які, паводле слоў **начальніка аддзела фізічнай культуры, спорту і турызму Шклоўскага райвыканкама Сяргея ХМЯЛЬКОВА,** аказвае 19 відаў паслуг насельніцтву. У Цэнтры праходзяць заняткі па валейболе, футболе, плаванні, існуе секцыя скалалажання і аддзяленне лыжных гонак. Летась комплекс наведала 70 тыс. чалавек, з якіх 40 працэнтаў маладыя людзі.

Фарміраванне ў маладых грамадзян актыўнай жыццёвай пазіцыі павінна стаць вызначальным у новым законе, лічыць **намеснік старшыні Шклоўскага райвыканкама Мікалай ЧАПЯЛІНСКІ.**

Вядома, што сітуацыя складваецца такім чынам, што большасць маладых людзей усё ж такі імкнецца ў горад, па больш развітую інфраструктуру, лепшы ўзровень жыцця. «Калі чалавека не падтрымаць на пачатку, не забяспечыць камфартабельным жыллём, то цяжка будзе затрымаць такога маладога чалавека ў раёне», — упэўнены Мікалай Чапялінскі. І адным з такіх спосабаў, паводле яго слоў, можа стаць унясенне ў закон прапановы адмысловай стаўкі вызваленага спецыяліста па працы з моладдзю.

Мікалай Чапялінскі лічыць, што ў законе трэба прапісаць, каб крэдытавалася не толькі вышэйшая адукацыя, але і сярэдняя спецыяльная. Таксама сярод прапаноў — больш жорсткія пакаранні за продаж моладзі піва, а таксама прыраўнаванне гэтага напою да разраду алкагольных і забарона яго ўжывання ў грамадскіх месцах.

— Перш-наперш мы павінны звярнуць увагу на тыя пытанні, якія найбольш хвалююць грамадства, — падсумаваў напрыканцы першага дня выязнога семінара **віцэ-спікер Палаты прадстаўнікоў Валерый ІВАНОЎ.** — Гэты праект закона — адзін з першых, які мы плануем прыняць на другой сесіі. Пасля, я думаю, мы будзем мець магчымасць прыехаць сюды яшчэ і прааналізаваць вынікі нашай працы па рэалізацыі моладзевага закона ў рэгіёне. Аналізуючы размовы людзей, якія скептычна ставяцца да ўсіх папярэдніх моладзевых законаў і кажуць пра тое, што ў нас мала ўвагі надаецца моладзі, і быццам бы тая сітуацыя не садзейнічае нармальнаму развіццю нашай моладзі, можна смела сказаць, што гэта не так. І тое, што мы бачылі сёння — гэтаму пацвярджэнне».

Падводзячы вынікі першага дня, **памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь галоўны інспектар па Магілёўскай вобласці Генадзь ЛАЎРАНКОЎ** падкрэсліў, што асноўнай задачай новага закона павінна стаць стварэнне ўмоў, якія спрыялі б замацаванню моладзі ў рэгіёнах. У прыватнасці, як адзначыў Генадзь Лаўранкоў, патрэбна стварыць умовы для таго, каб зацікавіць моладзь працай у вёсцы. Датычна адукацыі, Лаўранкоў не выключае, што адным з магчымых накірункаў у гэтай сферы можа стаць не 2-гадовая адпрацоўка па размеркаванні, а пяцігадовая. Таму што, паводле слоў памочніка Прэзідэнта, толькі 10-12 працэнтаў моладзі застаецца працаваць па размеркаванні.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ»)

Некаторыя пункты праекта закона «Аб асновах дзяржаўнай моладзевай палітыкі»:

♦ Пункт 4 артыкула 11: Дзяржаўная падтрымка маладых сем'яў

Маладым сем'ям у вызначаным заканадаўствам парадку даюцца льготныя крэдыты і аднаразовыя бязвыплатныя субсідыі на будаўніцтва (рэканструкцыю) альбо набыццё жылых памяшканняў, іншая фінансавая падтрымка дзяржавы.

♦ Пункт 2 артыкула 15: Садзейнічанне рэалізацыі права моладзі на аб'яднанне

Ніводнае моладзевае грамадскае аб'яднанне не мае права прэтэндаваць на манапольнае выражэнне інтарэсаў і патрэбнасцяў усёй моладзі.

Не дапускаецца прамое альбо ўскоснае прымушэнне маладых грамадзян да ўступлення ў моладзевыя грамадскія аб'яднанні, а таксама забарона на ўдзел у іх дзейнасці, заснаваны на выкарыстанні іх залежнага становішча.

♦ Пункт 3 артыкула 12: Садзейнічанне рэалізацыі права моладзі на працу

Дзяржава забяспечвае маладых грамадзян першым працоўным месцам і іншымі гарантыямі ў галіне садзейнічання занятасці ў адпаведнасці з заканадаўствам аб працы.

Табе, абітурыент!

ЦТ стартуе 15 чэрвеня

Пастановай Міністэрства адукацыі зацверджаны графік правядзення ў гэтым годзе цэнтралізаванага тэсціравання.

Першымі ў пункты правядзення ЦТ (15 чэрвеня) прыйдуць абітурыенты, якія плануюць здаваць тэст-экзамен па беларускай мове. 16 чэрвеня — тэст-экзамен па рускай мове. ЦТ па гісторыі Беларусі — 18 чэрвеня, а 19 чэрвеня — па геаграфіі, 21 чэрвеня па матэматыцы, 23 чэрвеня — па грамадазнаўстве. Сусветную гісторыю найноўшага часу абітурыенты будуць здаваць 25 чэрвеня, фізіку — 26 чэрвеня, біялогію — 28 чэрвеня, замежныя мовы — 30 чэрвеня, 1 ліпеня — хімію.

Для абітурыентаў, якія не змогуць узяць удзел у ЦТ па ўважлівай прычыне ў асноўны дзень, прадугледжаны рэзервовы дзень — 6 ліпеня. Але здаць у рэзервовы дзень можна будзе толькі адну вучэбную дысцыпліну. Пунктам правядзення ЦТ па ўсіх вучэбных дысцыплінах у рэзервовы дзень вызначаны Белдзяржуніверсітэт. Тэрміны перарэгістрацыі для ўдзелу ў ЦТ у рэзервовы дзень — з 25 чэрвеня па 2 ліпеня. Зрабіць гэта можна будзе ў Брэсцкім дзяржаўным тэхнічным універсітэце, Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Я. Купалы, Віцебскім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце, Гомельскім дзяржаўным тэхнічным універсітэце імя П. Сухога, Беларуска-Расійскім універсітэце і ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Пачатак іспытаў — 11 гадзін раніцы.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Пералік месцаў правядзення прафесійна-псіхалагічнай гутаркі

Па шматлікіх просьбах абітурыентаў, якія жадаюць зарэгістравацца на папярэдні прафадбор, мы друкуем удакладнены пералік ВНУ, на базе якіх будзе праходзіць прафесійна-псіхалагічная гутарка. І нагадваем, што рэгістравацца і праходзіць прафесійна-псіхалагічную гутарку можна ў любой ВНУ, указанай у пераліку, незалежна ад таго, куды будзе паступаць абітурыент.

Спецыяльнасць (група спецыяльнасцяў)	*Вышэйшыя навучальныя ўстановы — месцы правядзення прафесійна-псіхалагічнай гутаркі*
Дзяржаўнае кіраванне Дзяржаўнае кіраванне і права Дзяржаўнае кіраванне і эканоміка	Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт імя П.А. Сухога Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І.П. Шамякіна Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт харчавання Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна Віцебская дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны
Журналістыка Міжнародная журналістыка	Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы прыватная ўстанова адукацыі «Інстытут парламентарызму і прадпрымальніцтва»
Міжнародныя адносіны Міжнароднае права	Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт Міжнародны гуманітарна-эканамічны інстытут Міжнародны інстытут працоўных і сацыяльных адносінаў БІП — Інстытут правазнаўства
Правазнаўства Эканамічнае права	Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія Міжнародны інстытут працоўных і сацыяльных адносінаў Міжнародны гуманітарна-эканамічны інстытут Прыватны інстытут кіравання і прадпрымальніцтва БІП — Інстытут правазнаўства Мінскі інстытут кіравання
Мытная справа	Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт транспарту

ЯК ПЕРАРАЗМЕРКАВАЦЦА МАЛАДОМУ СПЕЦЫЯЛІСТУ?

Ёсць пытанне

Я адпрацавала пасля заканчэння медыцынскага каледжа па размеркаванні адзін год. Збіраюся ўзяць шлюб з мінчанінам. Ці магу я пераразмеркавацца і пераехаць да мужа ў сталіцу? Ён ужо не з'яўляецца маладым спецыялістам, ВНУ скончыў тры гады таму. І ўвогуле, якія могуць быць падставы для пераразмеркавання, акрамя змянення сямейнага становішча?

Ганна М., *Чэрвеньскі раён.*

Як патлумачылі нам у ЦК Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі, пераразмеркаванне маладых спецыялістаў рэгулюецца Палажэннем аб размеркаванні выпускнікоў установ адукацыі, якія атрымалі прафесійна-тэхнічную, сярэднюю спецыяльную або вышэйшую адукацыю, зацверджаным пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 10 снежня 2007 года № 1702. У адпаведнасці з пунктам 22 Палажэння, установы адукацыі маюць права вырашаць пытанні пераразмеркавання маладых спецыялістаў на працягу аднаго года пасля атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі, двух гадоў — пасля атрымання сярэдняй спецыяльнай або вышэйшай адукацыі і двух гадоў — пасля праходжання стажыроўкі (інтэрнатуры) выпускнікамі вышэйшых медыцынскіх устаноў адукацыі.

Згодна з гэтым дакументам, права на пераразмеркаванне магчымае ў выпадках наступлення ўжо пасля размеркавання інваліднасці I ці II групы (цяжкага захворвання маладога спецыяліста, яго мужа (жонкі) або бацькоў); калі ў размеркаванага маладога спецыяліста з'явіліся медыцынскія супрацьпаказанні да работы па атрыманай спецыяльнасці (у гэтым выпадку месца працы яму даецца з улікам стану здароўя); у выпадку наступлення цяжарнасці і нараджэння дзіцяці. Пэўнымі прэферэнцыямі карыстаюцца і сямейныя людзі. Напрыклад, жонкі асобаў, абраных на выбарную пасаду ў дзяржаўныя органы, работнікаў Міністэрства замежных спраў, накіраваных у службовую камандзіроўку, жонкі вайскоўцаў (за выключэннем вайскоўцаў, якія праходзяць тэрміновую ваенную службу і курсантаў), супрацоўнікаў Службы бяспекі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, органаў унутраных спраў, дзяржаўнай бяспекі, фінансавых расследаванняў, Камітэта дзяржаўнага кантролю, мытных органаў, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях, пракурорскіх работнікаў. Пры наяўнай магчымасці яны могуць пераразмеркавацца па месцы праходжання службы мужа.

Калі малады спецыяліст з'яўляецца жонкай (мужам) асобы, накіраванай на працу па размеркаванні раней, месца працы пры наяўнай магчымасці даецца яму ў тым жа населеным пункце. **Калі малады спецыяліст з'яўляецца жонкай (мужам) асобы, якая не валодае статусам маладога спецыяліста, месца працы вызначаецца па яго жаданні і пры наяўнай магчымасці па месцы працы або жыхарства мужа (жонкі), за выключэннем выпадкаў, калі шлюб быў заключаны з замежным грамадзянінам, што пастаянна пражывае за межамі Рэспублікі Беларусь.**

Падставай для пераразмеркавання могуць быць таксама:

— адмова наймальніка ў прыёме на працу маладому спецыялісту, накіраванаму ў адпаведнасці з заяўкай гэтага наймальніка (дагаворам аб падрыхтоўцы спецыяліста);

— немагчымасць забеспячэння месцам працы ў адпаведнасці з атрыманай спецыяльнасцю (прафесіяй) і прысвоенай кваліфікацыяй пасля заканчэння службы ва Узброеных Сілах. Прынамсі, калі малады спецыяліст прызваны на службу ў армію, то час, на працягу якога ён абараняе Айчыну, залічваецца яму ў тэрмін працы па размеркаванні. А калі пасля службы ў арміі хлопец збіраецца працаваць паводле размеркавання, ён абавязаны пісьмова папярэдзіць пра гэта наймальніка;

— спыненне працоўнага дагавора з маладым спецыялістам у выніку аднаўлення на працы работніка, які раней займаў гэту пасаду, парушэння вызначаных правілаў прыёму на працу (пункты 2 і 3 артыкула 44 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь);

— скасаванне працоўнага дагавора па ініцыятыве наймальніка ў выпадку ліквідацыі арганізацыі, спынення дзейнасці індывідуальнага прадпрымальніка, скарачэння колькасці і штату работнікаў.

Яшчэ адзін важны момант. Раней у маладых спецыялістаў не было магчымасці пераразмеркавацца, нават калі наймальнік пастаянна затрымліваў ім выплату заработнай платы. **Цяпер парушэнні наймальнікам працоўнага заканадаўства, калектыўнага ці працоўнага дагавора з'яўляюцца падставай для скасавання па патрабаванні работніка працоўнага дагавора і наступнага пераразмеркавання.** Падставай для пераразмеркавання можа быць і перавод маладога спецыяліста ад аднаго наймальніка да іншага ў адпаведнасці з атрыманай спецыяльнасцю (прафесіяй) і прысвоенай кваліфікацыяй. Праўда, такое пераразмеркаванне будзе магчымае толькі пры наяўнасці згоды наймальніка, у якога працуе паводле размеркавання малады спецыяліст. А наймальнік зусім не абавязаны яго адпускаць, як і камісія не абавязана ажыццяўляць пераразмеркаванне. Гэта іх права, а не абавязак. Зразумела, маладыя спецыялісты могуць прымаць меры, якія спрыяюць іх больш рацыянальнаму працаўладкаванню. Галоўнае — пераканаць у гэтым свайго наймальніка і камісію па размеркаванні.

Для вырашэння пытання аб пераразмеркаванні трэба звярнуцца ва ўстанову адукацыі, якая ажыццяўляла размеркаванне, з адпаведнай заявай і дадаць да яе дакументы, якія пацвярджаюць ваша права на пераразмеркаванне. Для асобаў, якія прэтэндуюць на пераразмеркаванне ў сувязі са змяненнем свайго сямейнага становішча, гэта копія пасведчання аб заключэнні шлюбу, даведка аб месцы працы (службы) мужа (жонкі), копія пасведчання аб накіраванні на працу па размеркаванні мужа (жонкі).

У тым выпадку, калі камісія прыме рашэнне аб пераразмеркаванні, малады спецыяліст атрымае новае пасведчанне аб накіраванні на працу. Часткай 7 пункта 22 Палажэння вызначана, што ў выпадку немагчымасці забеспячэння камісіяй пры пераразмеркаванні месцам працаўладкавання ў адпаведнасці з атрыманай спецыяльнасцю (прафесіяй) і прысвоенай кваліфікацыяй (прафесіяй) і прысвоенай кваліфікацыяй пасля заканчэння службы ва Узброеных Сілах. Прынамсі, калі малады спецыяліст прызваны на службу ў армію, то час, на працягу якога ён абараняе Айчыну, залічваецца яму ў тэрмін працы па размеркаванні. А калі пасля службы ў арміі хлопец збіраецца працаваць паводле размеркавання, ён абавязаны пісьмова папярэдзіць пра гэта наймальніка;

— спыненне працоўнага дагавора з маладым спецыялістам у выніку аднаўлення на працы работніка, які раней займаў гэту пасаду, парушэння вызначаных правілаў прыёму на працу (пункты 2 і 3 артыкула 44 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь);

— скасаванне працоўнага дагавора па ініцыятыве наймальніка ў выпадку ліквідацыі арганізацыі, спынення дзейнасці індывідуальнага прадпрымальніка, скарачэння колькасці і штату работнікаў.

Яшчэ адзін важны момант. Раней у маладых спецыялістаў не было магчымасці пераразмеркавацца, нават калі наймальнік пастаянна затрымліваў ім выплату заработнай платы. **Цяпер парушэнні наймальнікам працоўнага заканадаўства, калектыўнага ці працоўнага дагавора з'яўляюцца падставай для скасавання па патрабаванні работніка працоўнага дагавора і наступнага пераразмеркавання.** Падставай для пераразмеркавання можа быць і перавод маладога спецыяліста ад аднаго наймальніка да іншага ў адпаведнасці з атрыманай спецыяльнасцю (прафесіяй) і прысвоенай кваліфікацыяй. Праўда, такое пераразмеркаванне будзе магчымае толькі пры наяўнасці згоды наймальніка, у якога працуе паводле размеркавання малады спецыяліст. А наймальнік зусім не абавязаны яго адпускаць, як і камісія не абавязана ажыццяўляць пераразмеркаванне. Гэта іх права, а не абавязак. Зразумела, маладыя спецыялісты могуць прымаць меры, якія спрыяюць іх больш рацыянальнаму працаўладкаванню. Галоўнае — пераканаць у гэтым свайго наймальніка і камісію па размеркаванні.

Для вырашэння пытання аб пераразмеркаванні трэба звярнуцца ва ўстанову адукацыі, якая ажыццяўляла размеркаванне, з адпаведнай заявай і дадаць да яе дакументы, якія пацвярджаюць ваша права на пераразмеркаванне. Для асобаў, якія прэтэндуюць на пераразмеркаванне ў сувязі са змяненнем свайго сямейнага становішча, гэта копія пасведчання аб заключэнні шлюбу, даведка аб месцы працы (службы) мужа (жонкі), копія пасведчання аб накіраванні на працу па размеркаванні мужа (жонкі).

У тым выпадку, калі камісія прыме рашэнне аб пераразмеркаванні, малады спецыяліст атрымае новае пасведчанне аб накіраванні на працу. Часткай 7 пункта 22 Палажэння вызначана, што ў выпадку немагчымасці забеспячэння камісіяй пры пераразмеркаванні месцам працаўладкавання ў адпаведнасці з атрыманай спецыяльнасцю (прафесіяй) і прысвоенай кваліфікацыяй (прафесіяй) і прысвоенай кваліфікацыяй пасля заканчэння службы ва Узброеных Сілах. Прынамсі, калі малады спецыяліст прызваны на службу ў армію, то час, на працягу якога ён абараняе Айчыну, залічваецца яму ў тэрмін працы па размеркаванні. А калі пасля службы ў арміі хлопец збіраецца працаваць паводле размеркавання, ён абавязаны пісьмова папярэдзіць пра гэта наймальніка;

— спыненне працоўнага дагавора з маладым спецыялістам у выніку аднаўлення на працы работніка, які раней займаў гэту пасаду, парушэння вызначаных правілаў прыёму на працу (пункты 2 і 3 артыкула 44 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь);

— скасаванне працоўнага дагавора па ініцыятыве наймальніка ў выпадку ліквідацыі арганізацыі, спынення дзейнасці індывідуальнага прадпрымальніка, скарачэння колькасці і штату работнікаў.

Яшчэ адзін важны момант. Раней у маладых спецыялістаў не было магчымасці пераразмеркавацца, нават калі наймальнік пастаянна затрымліваў ім выплату заработнай платы. **Цяпер парушэнні наймальнікам працоўнага заканадаўства, калектыўнага ці працоўнага дагавора з'яўляюцца падставай для скасавання па патрабаванні работніка працоўнага дагавора і наступнага пераразмеркавання.** Падставай для пераразмеркавання можа быць і перавод маладога спецыяліста ад аднаго наймальніка да іншага ў адпаведнасці з атрыманай спецыяльнасцю (прафесіяй) і прысвоенай кваліфікацыяй. Праўда, такое пераразмеркаванне будзе магчымае толькі пры наяўнасці згоды наймальніка, у якога працуе паводле размеркавання малады спецыяліст. А наймальнік зусім не абавязаны яго адпускаць, як і камісія не абавязана ажыццяўляць пераразмеркаванне.

ЯК ЗАМАЦАВАЦЬ МОЛАДЗЬ У РЭГІЁНАХ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Насельніцтва горада складае на сёння 371 тысячу чалавек, 31,5 працэнта ад гэтай колькасці — маладыя людзі. 55 тысяч — моладзь працоўная. У горадзе 5 ВНУ, 8 ССВУ, 12 ПТВ, 30 інтэрнатаў.

Прадугледзець больш значныя льготы для тых арганізацый, якія прымаюць да сябе на працу студэнцкія атрады, прапаноўвае **начальнік аддзела па справах моладзі Магілёўскага гарвыканкама Таццяна ДЗЕНІСЕНКА**. «Студэнты працуюць на значных аб'ектах у нашым горадзе. Але не шмат арганізацый рашаецца на тое, каб узяць да сябе атрады, таму што баіцца адказнасці».

У горадзе заведзены рэестр моладзевых грамадскіх арганізацый, але асноўнай падтрымкай і фінансавай дапамогай карыстаюцца тры моладзевыя арганізацыі: Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі, беларуская піянерская арганізацыя, моладзевая арганізацыя выратавальнікаў-пажарных. Створана 20 дабраахвотных моладзевых дружын.

Вядучы ўніверсітэт горада — МДУ. Толькі не маскоўскі, а магілёўскі: Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. Куляшова. «Адзін з прыярытэтных кірункаў універсітэта, — кажа **начальнік управління па выхаваўчай рабоце з моладдзю МДУ імя А. Куляшова Таццяна КУЗЬМІНА**, — выхаванне грамадзяніна і прафесіянала. 98 працэнтаў студэнтаў — члены прафсаюзаў, больш за 50 працэнтаў студэнтаў — члены БРСМ».

Паводле слоў **рэктара ўніверсітэта Канстанціна БАНДАРЭНКІ**, 87 працэнтаў студэнтаў моладзі забяспечаны інтэрнатам. На базе ВНУ працуе 10 навуковых школ, 7 навуковых лабараторый. За час дзеяння ўніверсітэта было падрыхтавана 55 тысяч спецыялістаў.

Напрыканцы паездкі парламентарыі завіталі на ААТ «Бабулін гладыш», дзе сярэдні ўзрост работнікаў прадпрыемства — 27 гадоў. Сярэдні заробак складае 700 тысяч, максімальны — 1 млн 300 тысяч, — расказвае **начальнік цэха дзіцячага харчавання Дзмітрый КРАЎЦОЎ**.

— Па ўсіх паказчыках развіцця адукацыі мы знаходзімся на ўзроўні развітых краін свету, — адзначыў **спікер Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА**, адкрываючы пленарнае пасяджэнне па выніках выязнога семінара. — На сёння створана новая заканадаўчая база ў сферы адукацыі. Адзін з прыярытэтаў моладзевай палітыкі — прапаганда здаровага ладу жыцця, развіццё масавых спорту і турызму сярод дзяцей і моладзі.

Беларусь першай сярод краін СНД прыняла закон аб дэмаграфічнай бяспецы. Кіраўніком дзяржавы зацверджана нацыянальная праграма дэмаграфічнай бяспекі. У краіне створана цэласная сістэма падтрымкі маладой сем'і, якая прадугледжвае ў тым ліку дзяржаўную падтрымку сем'ям, ільготнае крэдытаванне на будаўніцтва, фінансавую дапамогу ў пагашэнні запазычанасці па гэтых крэдытах.

Як паведаміў Уладзімір Андрэйчанка, работа над законапраектам «Аб асновах дзяржаўнай моладзевай палітыкі» яшчэ толькі пачалася.

— У камісію па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі (якая непасрэдна займаецца распрацоўкай законапраекта. — **І.Л.**) паступае значная колькасць прапаноў ад моладзевых грамадскіх аб'яднанняў, маладых грамадзян Беларусі, у тым ліку і ад апазіцыйна настроеных, — падкрэсліў парламентарый. — Усе гэтыя прапановы будуць разглядацца ў працэсе работы над законапраектам.

— Больш за 2,5 млн насельніцтва Беларусі складаюць маладыя людзі ва ўзросце да 31 года, — адзначыў падчас пленарнага пасяджэння **міністр адукацыі Аляксандр РАДЗЬКОЎ**. — З іх 71 працэнт — жывуць у горадзе, а 21 працэнт — у вёсцы.

Колькасць студэнтаў у ВНУ на 10 тысяч насельніцтва складае 420 тысяч чалавек — гэта адзін з самых высокіх паказчыкаў сярод еўрапейскіх краін. У Беларусі вучацца студэнты з 82 краін (лідзіруюць Расія і Кітай). Іх колькасць складае 7600 чалавек.

У 2008 годзе на краіне было працаўладкавана 206 609 чалавек, у складзе будатрадаў — 30 тысяч, валанцёрскіх атрадаў — 38 тысяч чалавек.

— Мы павінны не толькі падтрымліваць, але і паспрабаваць «стварыць моду» на вялікую сям'ю, — адзначыў міністр адукацыі.

Дырэктар Магілёўскага інстытута рэгіянальных сацыяльна-палітычных даследаванняў Мікалай ЛІХАЧОЎ паведаміў, што беларускую нацыю, па звестках ААН, можна аднесці да народаў, якія выміраюць. Як зазначыў выступоўца, па звестках даследавання, толькі 11 працэнтаў моладзі хоча мець у сваёй сям'і больш за траіх дзяцей. За мінулы год у Магілёўскай вобласці шлюбаў было зарэгістравана на 16 працэнтаў менш, чым у 2007 годзе.

Выступоўца прапанаваў таксама дапоўніць праект закона шэрагам пунктаў, адным з якіх павінна стаць **неабходнасць абавязковага прадастаўлення кіраўнікамі прадпрыемстваў працоўных месцаў для праходжання практыкі студэнтам ВНУ і ССНУ**.

Напрыканцы семінара шэраг прапаноў па праекце закона ўнеслі прадстаўнікі БРСМ і піянерскай арганізацыі ад Магілёўскай вобласці. У прыватнасці, Беларуская рэспубліканская піянерская арганізацыя вобласці прапануе дзіцячыя грамадскія аб'яднанні далучыць да суб'ектаў дзяржаўнай моладзевай палітыкі. А актыў БРСМ Магілёўскай вобласці прапануе вызначыць у законе статус маладога спецыяліста, яго сацыяльныя гарантыі; вызваліць моладзевыя арганізацыі ад арэнднай платы за памяшканні; вызначыць базавыя ВНУ, якія рыхтавалі б адмысловых спецыялістаў па працы з моладдзю, а таксама стварыць навукова-даследчы Інстытут па праблемах моладзі пры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Падсумоўваючы вынікі семінара, у каментарыі журналістам **віцэ-спікер Палаты прадстаўнікоў Валерый ІВАНОЎ** адзначыў, што семінар даў штуршок да вывучэння законапраекта найперш у моладзевых колах. Праект закона быў разасланы ва ўсе моладзевыя арганізацыі раёнаў і абласцей.

— Пакуль цяжка сказаць пра якіясьці канкрэтныя змены, якія будуць унесеныя ў законапраект, — адзначыў віцэ-спікер, — таму што праца над ім яшчэ ідзе. Гэты закон — на перспектыву, і на сёння даволі актуальны. Ён вельмі няпросты і мы лічым яго адным з найважнейшых законаў, над якімі працуе зараз дэпутацкі корпус.

Законапраект будзе прапанаваны дэпутатамі да прыняцця ў першым чытанні на другой сесіі Палаты прадстаўнікоў, якая адкрыецца 2 красавіка.

Ілья ЛАПАТО.

Магілёўская вобласць.

Арыенцір для абітурыентаў ВНУ

Вызначыцца з прафесійным выбарам сёлетнім выпускнікам дапаможа даведнік для абітурыентаў вышэйшых навучальных устаноў 2009 года, які выйшаў у выдавецтве «Вышэйшая школа».

Як паведаміла вядучы спецыяліст адзела маркетынгу выдавецтва «Вышэйшая школа» Алена Шчарбак, у даведніку ўтрымліваюцца новыя праграмы ўступных іспытаў, якія распрацоўваліся з улікам пераходных вучэбных праграм 11-х штрых-класаў, а таксама новы парадак прыёму для кожнай ВНУ. Там жа можна знайсці адрасныя звесткі і web-сайты вышэйшых навучальных устаноў, інфармацыю аб спецыяльнасцях і спецыялізацыях, тэрмінах і формах навучання, уступных іспытах і прахадных балах, планах прыёму і арыенціровачным кошце навучання, формах даўніверсітэцкай падрыхтоўкі і магчымасці атрымаць другую вышэйшую адукацыю, у тым ліку і паралельна.

У найбліжэйшы час, як абяцаюць у выдавецтве «Вышэйшая школа», у кнігагандлёвую сетку паступяць таксама даведнікі для абітурыентаў сярэдніх спецыяльных і прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Это ваш шанс!!!

БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ ИНСТИТУТ ЖУРНАЛИСТИКИ

Факультет повышения квалификации журналистских кадров объявляет набор на двухгодичную переподготовку слушателей с непрофильным высшим образованием по специальности «Средства массовой информации».

По окончании обучения выдается диплом государственного образца о присвоении квалификации «Журналист».

Зачисление по результатам собеседования.

Обучение платное заочное.

Документы принимаются до 26.03.2009 г.

Контактные телефоны: 209 57 45, 209 57 46, факс: 209 57 40, e-mail: jorn_fpk@bsu.bu

«ОАО «ПИВЗАВОД ОЛИВАРИЯ»

извещает своих акционеров о проведении годового собрания акционеров ОАО «Пивзавод Оливария», которое состоится 26 марта 2009 года в 12.00 в конференц-зале ОАО «Пивзавод Оливария» по адресу: город Минск, проспект Машерова, дом 19.

Форма проведения годового собрания акционеров – очная.

ПОВЕСТКА ДНЯ ГОДОВОГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ:

1) Утверждение итогов финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Пивзавод Оливария» за 2008 г.
2) Утверждение отчета Наблюдательного совета о работе в 2008 г
3) Утверждение отчета Ревизионной комиссии о работе в 2008 г
4) Утверждение заключения Ревизионной комиссии по результатам проверки деятельности ОАО «Пивзавод Оливария» за 2008 г.
5) Утверждение результатов распределения прибыли и убытков ОАО «Пивзавод Оливария», выплаты дивидендов по итогам работы за 2008 г.
6) Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков ОАО «Пивзавод Оливария».
7) Избрание членов Наблюдательного совета.
8) Избрание членов Ревизионной комиссии.
9) Утверждение размера вознаграждения и компенсации членам Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии ОАО «Пивзавод Оливария».
10) Предоставление безвозмездной (спонсорской) помощи.

Список лиц, имеющих право на участие в годовом собрании акционеров ОАО «Пивзавод Оливария» **26 марта 2009 года**, составлен на основании реестра акционеров ОАО «Пивзавод Оливария» по состоянию на 6 марта 2008 года.

Материалы к годовому собранию акционеров ОАО «Пивзавод Оливария» от **26 марта 2009 года** будут представлены для ознакомления акционерам с **20 марта 2009 года** на информационном стенде в административном здании ОАО «Пивзавод Оливария» по адресу: г. Минск, проспект Машерова, дом 19.

Регистрация акционеров для участия в годовом собрании ОАО «Пивзавод Оливария» будет осуществляться **26 марта 2009 года** с 10.50 до 11.50 в помещении конференц-зала ОАО «Пивзавод Оливария» по адресу: г. Минск, проспект Машерова, дом 19. Регистрация проводится при предъявлении документа, подтверждающего полномочия на участие в собрании (доверенность) и/или паспорта.

УНП 100128525

«А ДАВАЙЦЕ ЯЕ НЕ АДПУСЦІМ!», або Як студэнтка ператварылася ў школьніцу

Выраз «навічкам заўсёды шанцуе» даўно стаў своеасаблівай аксіёмай. Вельмі ж часта даводзіцца чуць, што нехта, першы раз купіўшы латарэйны білет, выйграў кватэру, або, выпадкова завітаўшы ў казіно, сарваў джэк-пот. Таму не пагадзіцца з ім і сапраўды складана, калі б не адна акалічнасць: навічком можна быць не толькі ў гульні, але і ў жыцці. Ніхто з нас не застрахаваны ад таго, што магчыма ўжо заўтра яму давядзецца змяніць месца працы або вучобы. А значыць трапіць у зусім новы, незнаёмы калектыў. А тут, прызнацца, яму не заўсёды будуць рады. Дарослым-навічкам у гэтай сітуацыі крыху прасцей — галоўнае змірыцца з тым, што ў чужым манастыры давядзецца жыць па чужым статуце. Дзецям-навічкам або падлеткам-навічкам прыходзіцца значна цяжэй. Бо ў іх калектыве няма пастаянных, уласнавызначаных правілаў паводзінаў: сёння можа быць адно, а заўтра — зусім іншае. Тут, як кажуць, галоўны заканадаўца — настрой. Але ж, хутчэй за ўсё, нават у гэтай складанай задачы ёсць сваё вельмі простае рашэнне. Што ж, паспрабую яго знайсці. Вось толькі для пачатку мне спатрэбіцца адгарнуць сваё жыццё на два гады назад, і, абмяняўшы залікоўку студэнткі другога курса на школьны дзённік, зноў на некалькі дзён стаць звычайнай адзінаццацікласніцай.

За дзень да «першага» званка

Па новыя веды я вырашыла адправіцца ў СШ № 3 Маларыты. Тэлефаную дырэктару, каб дамовіцца пра сваё двухдзённае навучанне.

— Чаму б і не? — пагадзілася са мной Наталля Віктараўна Пракапук, дырэктар школы.

— Тады папярэдзьце, калі ласка, настаўніка, што ў чацвер і пятніцу ў 11-м класе будзе на адну дзяўчынку болей, — прашу я.

Цяпер самы складаны этап — падрыхтоўка да ўрокаў. Вось толькі для пачатку мне патрэбна атрымаць падручнікі (якіх, дарэчы, на два дні мне выдалі 11 штук!), перапісаць расклад і даведацца, якое хатняе заданне мне патрэбна будзе падрыхтаваць ужо назаўтра.

Знайсці нумар тэлефона кагонебудзь з маіх «аднакласнікаў» аказалася вельмі проста.

— Прывітанне, Інэса, мяне завуць Каця. З заўтрашняга дня я буду вучыцца ў вашым класе. Скажы, якія ўрокі трэба рыхтаваць, — пытаю я.

Інэсу не вельмі здзівіў мой званок. Яна хуценька прадыктавала спіс заданняў і, прапанаваўшы заўтра абавязкова пазнаёміцца, паклала трубку.

На жаль, новай сяброўкі ў мяне пакуль што не з'явілася, а вось работы на вечар… Беларуская мова, літаратура, фізіка, матэматыка, біялогія. Ёсць чым заняцца. Тым больш што калі з гуманітарнымі прадметамі ў мяне асаблівых праблем не ўзнікне, то з законамі Ома і трыганаметрычнымі формуламі ўсё будзе далёка не проста, падумала я. І, прызнацца, як у ваду глядзела. Дзіўна, але тое, што ў дзясятым класе здавалася такім простым, цяпер ні зразумець, ні ўспомніць я не магла. Гартаю папярэднія параграфы і разумею: чалавечая галава не камп'ютар, таму інфармацыя, з якой пастаянна не сутыкаешся, некуды знікае. Увогуле, каб якасна падрыхтавацца да заўтрашніх урокаў і не выглядаць у вачах маіх аднакласнікаў ні авечкай, ні зубрылкай (у школе не асабліва паважаюць ні першых, ні другіх) мне спатрэбілася прыблізна чатыры гадзіны.

Яшчэ раз у 11-ы клас

— Знаёмцеся, дзеці, — гэта Каця Панцялеева, з сённяшняга дня яна будзе вучыцца разам з вамі, — пазнаёміла са мной маіх новых аднакласнікаў Наталля Віктараўна.

Шчыра кажучы, яны не вельмі ўзрадаваліся папаўненню ў сваім шэрагу. Таму і ахвотных запрасіць мяне сесці побач з сабой таксама не знайшлося. Што ж, падумала я, давядзецца заняць адзіны бязлюдны востраў у гэтым класе — першую парту ля настаўніцкага стала. У гэты момант я адчувала сябе адзінокім мараком, лодка якога згубілася дзесьці ў бязмежным моры. Вось толькі замест шуму хваляў — шэпт аднакласнікаў, што абмяркоўваюць паміж сабой праблемы, якія накапіліся за ўчарашні вечар. Першы блін заўсёды камяком, вырашыла я і пачала рыхтавацца да занятку. У гэты момант у клас убегла бялявая дзяўчынка. Хуценька прамінуўшы адлегласць ад дзвярэй да першай парты, яна села ля мяне.

— Прывітанне, я новенькая, мяне Каця завуць, — знаёмлюся я.

— Я Ліля, — адказала дзяўчынка, — калі хочаш, можаш сядзець побач са мной: тут усё роўна пустое месца, — прапанавала яна.

Першы ўрок — беларуская мова. Тэма — гутарковы стыль. У прынцыпе, нічога новага і асабліва цікавага для мяне не было, пакуль мы не пачалі працаваць з фразеалагізмамі. Заданне было такім: скласці сказ з адным з дадзеных устойлівых выразаў.

— Гэтыя двое для мяне на адзін капыл (аднолькавыя), — сказала я пра братоў-блізнят, што сядзелі на задняй парце.

— А яна для мяне як «лупаты» мерседэс! — амаль выкрыкнуў адзін з аднолькавых братоў.

Усе рассмяяліся. Так, любві з першага позірку паміж мной і новымі аднакласнікамі адназначна не атрымалася. Хоць жарт на жарт — 1:1, падумала я сама сабе і, прызнацца, мне было не менш смешна, чым вучням з майго новага класа.

Дзесяць хвілін і яшчэ адна спроба пазнаёміцца

На перапынку мной «занялася» Ліля.

— Ты перапісала расклад? Давай падзелім папалам падручнікі, каб кожны дзень не цягаць у школу вялізную цяжкую сумку, — сказала мая суседка. — А факультатывы ты ўжо выбрала? Хочаш я з табой схаджу, каб напісаць заявы? — не спынялася яна.

На ўсе яе прапановы я толькі і паспявала, што махаць галавой.

— Ты новенькая, табе, напэўна, складана сярод незнаёмых людзей? — пыталася ў мяне Ліля, — але не хвалюйся, я табе дапамагу. Тым больш што настаўнікі ў нас класныя. Калі хочаш, я раскажу, хто з іх што патрабуе, да каго як трэба рыхтавацца, — казала яна.

На жаль, больш мая асоба нікога не зацікавіла. Яно і зразумела: сваіх клопатаў хапае, што яшчэ пра кагосьці думаць. Але пасля наступнага ўрока з роляй навічка-невідзімкі можна было смела развітацца. Да нашай з Ліляй парты падцягнулася некалькі дзяўчат.

— А ты з якой школы, дзе жывеш? — пыталіся яны.

Легенда ў мяне была даволі простая: мы з бацькамі пераехалі ў Маларыту з вёскі Олтуш, што знаходзіцца ў гэтым жа раёне, і пакуль жывём у сваякоў. Падчас гэткай бестурботнай размовы мне здавалася, што дзяўчаты і сапраўды хочуць са мной пасябраваць. Яны пыталіся нешта пра мяне і расказвалі што-небудзь пра сябе. Мы смяяліся, жартавалі. Здавалася, усё было добра, нават ідэальна, каб не адно але.

— Ты ведаеш Наташу? — спытаў Міша, хлопец з майго новага класа.

— А хто гэта? — неяк не адразу дацяміла я.

— Як, ты яе не ведаеш? Яна ж вучыцца ў Олтушы ў 11-м класе, — здзіўлены маім адказам працягваў хлопец.

«Пагарэла на пустым месцы», адчула я і хуценька змяніла тэму размовы. Міша нічога не сказаў, але гаварыць са мной больш не захацеў і пайш

ПАНЯДЗЕЛАК, 9 САКАВІКА

5.30 Дак. серыял «Таямнічы свет жывёл».
6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55 Навіны.
6.05, 7.05, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
6.45, 7.45, 18.50, 1.00 Зона Х.
7.30, 8.25, 11.50 Дзелавое жыццё.
8.20 Гатуем разам.
8.30 У свеце матораў.
9.05, 13.55 «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
9.10 Nota Bene.
9.35 Здароўе.
10.05 Жаночае ток-шоу «Жыццё як жыццё». «Як выхаваць сапраўднага мужчыну».
11.05, 17.50 Серыял «Родныя людзі».
12.10 Меладрама «8 Сакавіка».
14.05 «Будныя дні чэмпіёнаў». Зборная Беларусі па фрыстайле.
14.30 Відэафільм АТН «Маё каханне — маё багацце».
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.30 Культурныя людзі.
16.05 Гульнявае шоу «Інтуіцыя».
16.55 Серыял «Гарачы лёд».
19.35 Арэна.
19.55 Ток-шоу «Ход у адказ».
21.00 Панарама.
21.50, 1.20 Серыял «Доктар Хаўс».
22.55 Баявік «Смяротная зброя».
1.10 Дзень спорту.

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00. **20.30, 22.55, 0.45** Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 Контуры.
10.10 Тэорыя неверагоднасці. «Вольга Аросева. Сакрэты пані Монікі».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.10, 1.00 Навіны спорту.
11.10, 13.10 Камедыя «Вялікі перапынак».
16.15 Серыял «Агонь кахання».
18.20 Серыял «Хто ў доме гаспадар?».
18.55 Серыял «Рыжая».
20.00 Час.
21.05 Ток-шоу «Выбар».
22.00 Серыял «Група Zeta».
23.15 «Адваротны адлік». «У пераплётах пашпартызацыі».
23.45 Прафесійны бокс. Аляксандр Дзевон — Мігель Коліст.

6.55 Ранішняя падзарадка.
7.55, 17.00 Смачна з Барысам Бурдой.
8.20 Тэлебарометр.
8.40 Усё пра бяспеку.
9.05 У гэты дзень.
9.10 Гадзіна суда. Справы сямейныя.
9.55, 17.35 Серыял «Спадчынніца».
10.50 Драма «Місіс Браўн».
12.35 Гаспадар.
13.05 Серыял «Расплата за грахі».
13.55 Бухта капітанаў.
14.35 Мультсерыял «Сонік Iкс».
14.55 Пазакласная гадзіна.
15.05 Тайны смак.
15.40 «Шунін і бландзінкі».
16.05 Гадзіна суда з Паўлам Астахавым.
18.35 Навіны культуры.
18.50 Серыял «Забойная сіла-5».
19.55 Беларуская часінка.
20.55 Калыханка.
21.15 Камедыя «Вольны вецер». 1-я серыя.
22.35 Хакей. Формула гульні.
23.05 Хакей. Адкрыты чэмпіянат Беларусі. Плей-оф.

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.40 «Раніца. Студыя добрага настрою».
8.30 «Тыдзень».
9.30 «Вялікае сняданне».
10.00 «Пяць гісторый».
10.55 Серыял «Танга ўтраіх».
11.45, 18.25 Серыял «Багатая і любімая».
12.40, 17.30 «Званая вячэра».
13.50 Маст. фільм «Чаго хочуць жанчыны».
16.00 «Культурнае жыццё».
16.50 «Я — падарожнік».
17.10 «Наша справа».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
20.15 «Добры вечар, малы».
20.30 Маст. фільм «Мужчынская інтуіцыя».
23.00 «Гарачы лёд».
23.25 Серыял «Салдаты. Новы прызыў».
0.20 «Гучная справа».

5.00, 6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 20.00, 21.00, 22.00, 23.00, 0.00, 1.00 Навіны Садружнасці.
5.05, 6.05, 7.05 Садружнасць live.
5.30 «Культурны слой з Львом Лур'е».
6.35 «Удачная пакупка».
6.45 «Цік-так».
7.30, 19.30 «Агульны інтарэс».
8.05, 1.45 Дак. серыял «Падводная адысея каманды Кусто».
9.05 «Разам».
10.05 Маст. фільм «Жанчын крыўдзіць не рэкамендуецца».
12.05, 0.05 Маст. фільм «Каракумы, 45 градусаў у цені».
14.05 Мультсерыял «Рэдвол».
14.30 Серыял «Прыгоды Сіндбада».
15.20 Простыя лічбы «Мікаэл Тарывердзіеў».
15.55 «Білет на сёння».
16.05, 3.50 «Гадзіна суда. Справы сямейныя».
17.05 Серыял «Каханне як каханне».
18.20 «Акцэнты».
18.30 Серыял «Дзяўчынка з поўначы».
20.05 Ток-шоу «Слова за слова».
21.20, 2.50 Серыял «Мужчыны не плачуць-2».
22.20 «Свет спорту».
23.15 Дак. фільм «Кома гэта праўда».

7.00 10.50 Навіны кіно.
7.10 «На рыбалку з Юрыем Заслаўскім».
7.25 «Метэапрагноз».
7.30 Маст. фільм «Яе звалі Мікіта».
9.00 «Клуб-700».
9.30 «К-відэа для дзяцей».
9.50, 19.45 Серыял «Салодкі плод».
11.00 Серыял «Сям'я Кардзье».
12.45 «8 самых».
13.00 «Дзённы тэлечат».
16.30 «Мультпарад».
16.50 «Ін-фармацыя».
17.00 Серыял «Свавольнікі».
17.30 Серыял «Лейтэнант Каломба».
19.15 «Мой любімы гадаванец».
20.45 «Вечарніца».
21.00 «К-відэа» для ўсёй сям'і.
21.05 Інфармбюро «Міжнароднае».
21.10, 23.20 Астра-, метэапрагноз.
21.15 Трылер «Вампіры».
23.00 «Стары магнітафон».

7.00 Маст. фільм «Бейбарс».
9.50 Пакой смеху.
10.30 «Ранішняя пошта».
11.00, 14.00 Весткі.
11.15 Маст. фільм «Пад купалам цырка»
13.50, 16.50, 18.50, 23.00 Навіны—Беларусь.
14.20 «Кулагін і партнёры».
14.55 Дак. фільм «Маналог у чатырох частках». Сяргей Салаўёў.
17.00 Дак. фільм «Цана зорнай ролі».
17.55 Серыял «Жанчына без мінулага».
19.00 Весткі тыдня.
20.05 Маст. фільм «8 Сакавіка».
22.00 «Дзяжурны па краіне».
23.10 Маст. фільм «Стралец непрыкаяны».

6.55 Маст. фільм «Бейбарс».
9.40 Мультфільмы.
10.00, 13.00 Весткі.
10.10 Весткі—Масква. Тыдзень у гарадзе.
10.50 Маст. фільм «Стралец непрыкаяны».
12.20 Сам сабе рэжысёр.
13.15 «Гарадок».
13.40 Маст. фільм «Здзейка».
15.15 «Я хачу дабра. Мікаэл Тарывердзіеў». Кінаканцэрт.
15.45 Камедыя «Прывітанне, я ваша цётка!».
17.30 «Ізмайлаўскі парк». Канцэрт.
19.00, 3.00 Весткі тыдня.
20.05, 3.55 Святочнае шоу Валянціна Юдашкіна.
22.10 Камедыя «Дзевяць прыкметаў здрады».
23.45 «Мы напарадзе планеты ўсёй...». Юрый Візбар.
0.55 «Я хачу дабра. Мікаэл Тарывердзіеў». Кінаканцэрт.
1.20 Камедыя «Прывітанне, я ваша цётка!».
6.00 «Спявае Алег Пагудзін».

6.30 Камедыя «Як жаніцца і застацца халасцяком».
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.15 «Дачны адказ».
9.10 «Крамлёўскія пахаванні». Надзея Алілуева.
10.20 «Кулінарны паядынак».
11.15 «Кватэрнае пытанне».
12.10 «Следства вялі...».
13.25, 16.20 Серыял «Мамачка, я кілера кахаю».
19.30 Серыял «Карамболь».
21.30 Камедыя «Не нарадзіся прыгожым».
23.20 Серыял «Лічбы».

7.15 Маст. фільм «Тэрмінова патрабуецца Дзед Мароз».
8.35 «Закаханая вясна». Канцэрт.
9.30, 18.30, 2.55 Серыял «Трымай мяне мацней».
10.15, 19.20 Мультфільм.
10.30, 19.30, 1.00 Падзеі.
10.45 Маст. фільм «Жанчыны».
12.20, 3.40 Дак. серыял «Непрыручаная прырода Азіі».
12.50, 20.05 Серыял «Каманда».
13.45 «Пастскрыптум».
14.45 «Утаймаванне ўпартых». Спецрэпартаж.
15.00, 6.05 Серыял «Жонка Іуды».
15.50 «Геній Места».
16.15, 5.30 «Я спяваў усім сэрцам...». Леанід Уцёсаў.
16.50, 1.55 Серыял Інспектар Дэрык».
17.50 Дак. фільм «Лідзія Шукшына. Непрадказальная роля».
20.50 «Лінія абароны».
21.25 «Рэпарцёр».
21.45, 4.05 Серыял «Галіна».
22.35 «Момант ісціны».
23.15 Маст. фільм «Парашчасця».
1.15 «Нічога асабістага». Культура без падтрымкі.
5.00 Гісторыя рускіх цароў. «Цары смутнага часу».

9.30 Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг».
10.30 Агляд снежнага ўік-энда.
10.45 Лыжныя гонкі. Кубак свету.
11.30, 17.30, 20.30, 1.30 Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
13.00 Шорт-трэк. Чэмпіянат свету.
14.00 Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў памяшканні.
16.00 Веласпорт. Парыж — Ніца.
19.30, 0.45 Футбол. Еўрагалы.
20.15, 0.30 Футбол. Еўрагалы. Давід Вілья.
21.15 Вось гэта дзіва!!!
21.30 Армрэстлінг.
22.00 Пра рэстлінг.
23.30 Байцоўскі клуб.

15.45 ФІЛЬМ ДНЯ

«ПРЫВІТАННЕ, Я ВАША ЦЁТКА!» (СССР, 1975 г.)

Англія пачатку XX стагоддзя... Беспрацоўны Бабс падпадае ў багаты дом, дзе вымушаны, ратуючыся ад пераследу паліцэйскіх, іграць ролю цётачкі-мільянеркі, каб дапамагчы двум юнакам жаніцца, зачараваўшы апекуна дзяўчат.

Рэжысёр — Віктар Цітоў. **У ролях:** Аляксандр Калягін, Тамара Носава, Таццяна Ведзянеева, Валянцін Гафт, Міхаіл Казакоў, Армен Джыгарханян, Таццяна Васільева, Алег Шклоўскі.



АЎТОРАК, 10 САКАВІКА

5.05, 16.05 Серыял «Два лёсы».
6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55 Навіны.
6.02, 7.05 Прэс-агляд.
6.05, 23.40 Дзень спорту.
6.15, 7.10, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
6.45, 7.45, 18.50, 0.00 Зона Х.
7.30, 8.30, 11.50 Дзелавое жыццё.
8.20 Гатуем разам.
8.35 «Арэна».
9.05, 13.55 «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
9.10, 19.55 Серыял «Монтэкрыста».
10.05, 16.55 Серыял «Гарачы лёд».
10.50, 17.50 Серыял «Родныя людзі».
11.40 «Зямля беларуская». «Клецк».
12.10 Гульнявае шоу «Інтуіцыя».
13.05 Серыял «Монк».
14.05 Ток-шоу «Ход у адказ».
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.25 Дак. цыкл «Нябачны фронт».
19.30 Сфера інтарэсаў.
21.00 Панарама.
21.35 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Ювентус — Чэлсі.
0.10 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Агляд тыдня.
0.55 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Ліверпуль — Рэал.

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.00, 1.10 Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05, 18.55 Серыял «Рыжая».
10.05 «Былыя жонкі».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.15, 1.25 Навіны спорту.
11.10 «Адзін супраць усіх».
12.00 «Малахаў+».
13.10 «Зразумець. Дараваць».
13.45 «Модны прыгавор».
14.50 «Песні для любімых».
16.15 Серыял «Агонь кахання».
17.10 «Няхай гавораць».
18.20 Серыял «Хто ў доме гаспадар?».
20.00 Час.
21.05 Серыял «Жыццё, якога не было».
22.05 Серыял «Дзялкі».
23.20 «Усмешка Гагарына».
0.20 Серыял «Місія празорлівасці».

6.55 Ранішняя падзарадка.
7.55, 17.00 Смачна з Барысам Бурдой.
8.20 Серыял «Забойная сіла-5».
9.15 У гэты дзень.
9.20 Гадзіна суда. Справы сямейныя.
10.05, 17.35 Серыял «Спадчынніца».
10.50 Хакей. Формула гульні.
11.15, 21.20 Камедыя «Вольны вецер».
12.25 Серыял «Расплата за грахі».
13.15 Дак. фільм «Часы мяняюцца».
14.45 Мультсерыял «Сонік Iкс».
15.05 Пазакласная гадзіна.
15.15 Бітва экстрасэнсаў.
16.10 Гадзіна суда з Паўлам Астахавым.
18.35 Навіны культуры.
18.50 Серыял «Забойная сіла-6».
19.55 Беларуская часінка.
20.55 Калыханка.
22.35 Спорт-кадр.
23.05 Хакей. НХЛ. Караліна — Нью-Ёрк Рэйнджэрс.

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.40 «Раніца. Студыя добрага настрою».
8.30 Маст. фільм «Мужчынская інтуіцыя».
10.05 «Пяць гісторый».
10.55 Серыял «Танга ўтраіх».
11.45, 18.25 Серыял «Багатая і любімая».
12.40, 17.30 «Званая вячэра».
13.50 «Новыя падарожжы дылетанта».
14.20 «Далёкія сваякі».
14.40 Серыял «Брыдкае качаня».
15.30, 23.25 Серыял «Салдаты. Новы прызыў».
16.50 «Гарачы лёд».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 «Добры вечар, малы».
20.30 Серыял «Атрад».
21.40 «Аўтапанарама».
22.00 «Рэпарцёр СТБ».
23.00 StartUp!».
0.20 «Надзвычайныя гісторыі».

5.00, 6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 20.00, 21.00, 22.00, 23.00, 0.00, 1.00 Навіны Садружнасці.
5.05, 7.05 Садружнасць live.
5.30 Простыя лічбы. «Мікаэл Тарывердзіеў».
6.05 «Свет спорту».
6.35 «Удачная пакупка».
6.45 «Цік-так».
7.30 «Каму на Русі жыць добра...».
8.05, 1.45 Дак. серыял «Падводная адысея каманды Кусто».
9.05, 20.05 Ток-шоу «Слова за слова».
10.05 Серыял «Скрыжаванне».
11.05, 18.30 Серыял «Дзяўчынка з поўначы».
12.05, 0.05 Маст. фільм «Узыходжанне на Фудзіяму».
14.05 Мультсерыял «Рэдвол».
14.30 Серыял «Прыгоды Сіндбада».
15.20 «Дыялог з усім светам».
15.55 «Білет на сёння».
16.05, 3.50 «Гадзіна суда. Справы сямейныя».
17.05 Серыял «Спадчынніца».
18.20 «Акцэнты».
19.30 «Руская версія».
21.20, 2.50 Серыял «Мужчыны не плачуць-2».
22.30 «Тэатр пачынаецца».
23.15 Дак. фільм «Кома гэта праўда».

7.00, 19.40 «К-гульні».
7.10 «Метэапрагноз».
7.15 Серыял «Гардэмарыны, наперад». 1-я серыя.
8.30 Дак. серыял «Іран».
9.00 «Клуб 700».
9.30, 19.00 «Кіно—кліп—парад».
9.50, 19.45 Серыял «Салодкі плод».
10.40 «Навіны кіно».
10.50 Інфармбюро «Міжнароднае».
10.55, 23.40 «Астра-, метэапрагноз».
11.00 Маст. фільм «Цыклон».
13.00 «Дзённы тэлечат».
16.30 Мультпарад.
17.00 Серыял «Штрафнікі».
17.50 «Ін-фармацыя».
18.00 Серыял «Астанкі, якія гавораць».
18.45 «На рыбалку з Юрыем Заслаўскім».
19.15 Дак. серыял «Грэцыя вачыма гурмана».
20.45 «Вечарніца».
21.00 «К-гульні» — юніёр.
21.10 Трылер «Калі ласка ў рай».
23.05 Вячэрні канцэрт тэлечата.

7.00 Добрай раніцы, Расія!
9.30 Маст. фільм «Будзьце маёй цешчай».
11.00, 14.00, 17.00, 19.00 Весткі.
11.40 Пакой смеху.
12.10 Маст. фільм «Злаадзейка».
13.50, 16.50, 18.50, 23.35 Навіны — Беларусь.
14.20, 22.40 «Кулагін і партнёры».
14.55 Дак. фільм «Алена Абразцова. Людзі, опера, жыццё».
17.25 «Падарожжы натуралісta».
17.55 Серыял «Жанчына без мінулага».
19.30 Серыял «Кармеліта».
20.30 Серыял «Даішнікі».
21.40 Серыял «Трое супраць усіх».
23.15 «Весткі+».
23.45 Дак. фільм «Наша Фелічыта».

7.00 Добрай раніцы, Расія!
10.00, 17.30, 0.25 Серыял «Родныя людзі».
10.45, 18.15, 1.10 Серыял «Лэдзі Бомж».
11.30 Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
12.10, 20.30, 3.45 Серыял «Даішнікі».
13.00, 16.00, 19.00, 3.00 Весткі.
13.20 Весткі—Масква.
13.35 Серыял «Сітуацыя 202. Хвароба руху».
14.25 Мультфільм.
14.45 «Маналог у чатырох частках». Павел Чухрай.
15.15 «Сярожа Парамонаў. Савецкі Раберціна Ларэці».
16.20 Весткі—Маскоўская вобласць.
16.45, 0.10, 6.40 Весткі—спорт.
17.00, 5.40 «Тры тайны адваката Плевако».
19.45, 1.55 Серыял «Кармеліта».
21.20, 4.55 «Далікатны патрашыцель. Урмас От».
22.10 Весткі—Санкт-Пецярбург.
22.25 «Эпізоды». Лілія Талмачова.
23.05, 4.40 «Весткі+».
23.20, 2.40 Навіны культуры.
23.40, 6.10 «Начны палёт».

6.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
6.05 «Сёння раніцай».
9.00 «Праграма Максімум».
10.25 «Чыстасардэчнае прызнанне».
10.55 «Quattroruote».
11.20 Серыял «Сакрэтныя даручэнні».
12.10 «Крамлёўскія пахаванні». Сяргей Кірай.
13.30 Серыял «Сышчыкі-4».
15.30, 18.30 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
19.40 Серыял «Карамболь».
21.40 «Вочная стаўка».
22.40 Серыял «Сола для пісталета з аркестрам».
0.20 Серыял «Лічбы».

7.15 Канал «Настрой».
9.25 «Энцыклапедыя». Аль Біруні.
9.30, 18.30, 2.55 Серыял «Трымай мяне мацней».
10.15, 19.20 Мультфільм.
10.30, 13.30, 16.30, 19.30 Падзеі.
10.45 Маст. фільм «Мядовы месяц».
12.15, 3.40 Дак. серыял «Непрыручаная прырода Азіі».
12.45 Серыял «Каманда».
13.45 «У цэнтры падзей».
14.35 «Маскоўскія прыгажуні». Яўгенія Алілуева.
15.00, 6.05 Серыял «Жонка Іуды».
15.50 «Нічога асабістага». Культура без падтрымкі.
16.50, 1.55 Серыял «Інспектар Дэрык».
17.50 Дак. фільм «Канец цудоўнай эпохі. Бродскі і Даўлатаў».
19.30 «Рэзананс».
20.05 Серыял «Каманда».
20.50 «Скандальнае жыццё» з Вольгай Б. Сярод гор смецця.
21.30 «Рэпарцёр».
21.45, 4.05 Серыял «Галіна».
22.35, 5.25 Дак. фільм «Жывёлы на вайне».
23.15 Маст. фільм «Зімняя вішня».
0.45 Падзеі. 25-я гадзіна.
1.15 Дак. фільм «Лідзія Шукшына. Непрадказальная роля».
5.00 «Pop Corn-TV».

9.30 Экстрэмальны спорт.
10.00, 17.30, 20.45, 1.45 Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
11.00, 15.15, 19.45 Футбол. Еўрагалы.
11.45, 13.45 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу.
13.30 Футбол. Еўрагалы. Давід Вілья.
15.00 Вось гэта дзіва!!!
16.00 Веласпорт. Парыж — Ніца.
22.00 Бокс.
0.00 Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг».
0.30 Ралі. Серыя IRC.
1.00 Тэст-драйв.

23.15 ФІЛЬМ ДНЯ

«ЗІМНЯЯ ВІШНЯ» (СССР, 1985 г.)

Пры ўсёй сваёй неабароненасці і жаноцкасці мэтанакіраваная гераіня марыць выйсці замуж і быць шчаслівай. А пакуль кахае жанатага і дакладна ведае, што ён не пакіне дзеля яе жонку.

Рэжысёр — Ігар Масленнікаў. **У ролях:** Алена Сафонава, Віталь Саломін, Ала Асіпенка, Івар Калныньш, Аляксандр Лянькоў, Антаніна Шуранава, Ларыса Удавічэнка, Ніна Русланава.

СЕРАДА, 11 САКАВІКА

5.05, 16.05 Серыял «Два лёсы».
6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55 Навіны.
6.02, 7.05 Прэс-агляд.
6.05, 23.40 Дзень спорту.
6.15, 7.10, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
6.45, 7.45, 18.50, 0.00 Зона Х.
7.30, 8.25, 11.50 Дзелавое жыццё.
8.20 Гатуем разам.
8.35 Сфера інтарэсаў.
9.05, 13.55 «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
9.10, 19.55 Серыял «Монтэкрыста».
10.05, 16.55 Серыял «Гарачы лёд».
10.50, 17.50 Серыял «Родныя людзі».
11.40 «ЕўраФэст. Дзень за днём».
12.10 Гульнявое шоу «Інтуіцыя».
13.05 Серыял «Монк».
14.05 Альманах падарожжаў.
14.30 Серыял «Офіс».
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.25 Дак. цыкл «Нябачны фронт».
19.30 Зямельнае пытанне.
20.50 «Спартлато 5 з 36».
21.00 Панарама.
21.35 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Манчэстэр Юнайтэд — Інтэр.
0.10 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Агляд дня.
0.55 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Барселона — Ліон.

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.00, 1.10 Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05, 18.55 «Рыжая». Серыял.
10.05 «Жыццё, якога не было». Серыял.
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.15, 1.25 Навіны спорту.
11.10 «Кантрольная закупка».
12.00 «Малахаў+».
13.10 «Зразумець. Дараваць».
13.45 «Модны прыгавор».
15.00, 22.05 «Дзялкі». Серыял.
16.15 «Агонь кахання». Серыял.
17.10 «Няхай гавораць».
18.20 Серыял «Хто ў доме гаспадар?».
20.00 Час.
21.05 Меладрама «Пан».
23.20 «Прыгажосць — страшная сіла».
0.20 «Місія празорлівасці». Серыял.

6.55 Ранішняя падзарадка.
7.55, 16.55 Смачна з Барысам Бурдой.
8.20 Серыял «Забойная сіла-6».
9.20 У гэты дзень.
9.25 Гадзіна суда. Справы сямейныя.
10.10, 17.30 Серыял «Спадчынніца».
10.55 Свая музыка.
11.25 ПРАсоўванне+.
11.50 Спорт-кадр.
12.20 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Панацінаікас — Вільярэал.
13.55 Бухта капітанаў.
14.35 Мультсерыял «Сонік Iкс».
14.55 Пазакласная гадзіна.
15.10 «Космаполітэн». Відэаверсія.
16.00 Гадзіна суда з Паўлам Астахавым.
18.30 Навіны культуры.
18.45 Жаночая ліга.
19.10 Біятлон. Кубак свету. Індывідуальная гонка. Жанчыны.
20.55 Калыханка.
21.15 Беларуская часінка.
22.15 «Іншыя». «Выхаваўчая кувалда».
22.45 Баявік «Двайны захоп».
0.25 Біятлон. Кубак свету. Індывідуальная гонка. Мужчыны.

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.40 «Раніца. Студыя добрага настрою».
8.30 «Аўтапанарама».
8.50, 20.30 «Атрад». Серыял.
10.00 «Пяць гісторый».
10.40 «Танга ўтраіх». Серыял.
11.45, 18.25 «Багатая і любімая». Серыял.
12.40, 17.30 «Званая вячэра».
13.50 «Зоркі спорту».
14.45 «Брыдкае качаня». Серыял.
15.30, 23.25 «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
16.50 «Рэпарцёр СТБ».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
20.15 «Добры вечар, малы».
21.40 «Скардзіцца дазволена».
22.00 «Мінск і мінчане».
23.00 «StartUp».
0.20 «Дэтэктыўныя гісторыі».

5.00, 6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 20.00, 21.00, 22.00, 23.00, 0.00, 1.00 Навіны Садружнасці.
5.30 «Дыялог з усім светам».
6.35 «Удачная пакупка».
6.45 «Цік-так».
7.30, 19.30 «Дзень пасла».
8.05, 1.45 Дак. серыял «Падводная адысея каманды Кусто».
9.05, 20.05 Ток-шоу «Слова за слова».
10.05 Серыял «Скрыжаванне».
11.05, 18.30 Серыял «Дзяўчынка з поўначы».
12.05, 0.05 Маст. фільм «Узыходжанне на Фудзіяму».
14.05 Мультсерыял «Рэдвол».
14.30 Серыял «Прыгоды Сіндбада».
15.20 «Дэтэктыўныя гісторыі».
15.55 «Білет на сёння».
16.05, 3.50 «Гадзіна суда. Справы сямейныя».
17.05 Серыял «Каханне як каханне».
18.20 Акцэнты.
21.20, 2.50 Серыял «Мужчыны не плачуць-2».
22.30 «Гісторыя стварэння».
23.15 Дак. фільм «Кома гэта праўда».

7.00, 10.40 «Навіны кіно».
7.10, 10.50, 23.30 «Астра-, метэапрагноз».
7.15 Серыял «Гардэмарыны, наперад!».
8.30, 18.45 Дак. серыял «Грэцыя вачыма гурмана».
9.00 «Адшукваецца адпачынак».
9.20 «8 самых».
9.30 «К-відэа для дзяцей».
9.50, 19.45 Серыял «Салодкі плод».
11.00 Трылер «Калі ласка ў рай».
13.00 «Дзённы тэлечат».
16.30 «Мультпарад».
17.00 Серыял «Штрафнікі».
17.50 «Ін-фармацыя».
18.00 Серыял «Астанкі, якія гавораць».
19.10 «К-гульні».
19.15 Дак. серыял «Іран».
20.45 «Вечарніца».
21.00 «К-відэа для ўсёй сям'і».
21.05 Інфармбюро «Міжнароднае».
21.10 Трылер «Бітва за будучыню».
23.10 «Стары магнітафон».

7.00 Добрай раніцы, Расія!
9.10, 19.30 Серыял «Кармеліта».
10.00, 20.30 Серыял «Даішнікі».
11.00, 14.00, 17.00, 19.00 Весткі.
11.40, 21.40 Серыял «Трое супраць усіх».
12.30 Маст. фільм «Падарунак адзінокай жанчыне».
13.50, 16.50, 18.50, 23.35 Навіны—Беларусь.
14.20, 22.40 «Кулагін і партнёры».
14.55 «Урачэбная тайна». «Суслаў. Шэры кардынал». Дак. фільм.
17.25 «Міражы». Вера Халодная.
17.55 «Жанчына без мінулага». Серыял.
23.15 «Весткі+».
23.45 «Крыж над Балканамі». Дак. фільм.

7.00 «Добрай раніцы, Расія!».
10.00, 17.30, 0.25 «Родныя людзі». Серыял.
10.45, 18.15, 1.10 Серыял «Лэдзі Бомж».
11.30 Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
12.10, 20.30, 3.45 Серыял «Даішнікі».
13.00, 16.00, 19.00, 3.00 Весткі.
13.20 Весткі—Масква.
13.35 Серыял «Сітуацыя 202. Страшная сіла». 1-я серыя.
14.25 Мультфільм.
14.45 «Маналог у чатырох частках». Павел Чухрай.
15.15 «Гібель «Паветранага Тытаніка». Стратанаўты».
16.20 Весткі—Маскоўская вобласць.
16.45, 0.10, 6.40 Весткі—спорт.
17.00, 5.40 «Царская муза ў сям'і Раманавых». Мікалай I.
19.45, 1.55 Серыял «Кармеліта».
21.20, 4.55 «Містэрыя жыцця. Народны мастак Ілья Глазуноў».
22.10 Весткі—Санкт-Пецярбург.
22.25 «Рамантыка раманса».
23.05, 4.40 «Весткі+».
23.20, 2.40 Навіны культуры.
23.40, 6.10 «Начны палёт».

6.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.00 Сёння.
6.05 «Сёння раніцай».
9.05 «Вочная стаўка».
10.20 «Асабліва небяспечны!».
10.55 «Галоўная дарога».
11.25 Серыял «Сакрэтныя даручэнні».
12.10 Серыял «Сола для пісталета з аркестрам».
13.30 Серыял «Сышчыкі-4».
15.10 Прафесія — рэпарцёр.
15.30, 18.30 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
16.30 Серыял «Марскія д'яблы-2».
19.40 Серыял «Карамболь».
21.35 «І зноў прывітанне!».
22.35 «Ты не паверыш! Ньюс».
23.25 Серыял «Сола для пісталета з аркестрам».
0.15 Серыял «Лічбы».

7.15 Канал «Настрой».
9.25 «Энцыклапедыя». «Меніны». Дыега Веласкес.

22.45 ФІЛЬМ ДНЯ

«ДВАЙНЫ ЗАХОП» (ЗША, 2001 г.)

Украсці пашпарт у падобнага хлопца і выдаць сябе за яго — гэта ідэя падалася Дэрылу ўдачнай. Зусім нядаўна Дэрыл працаваў у буйной кампаніі, жыў у дарагой кватэры і насіў шыкоўныя касцюмы, але ўсё гэта прапала ў адзін дзень, калі ён прыйшоў да сваёй сакратаркі дамоў і знайшоў замест яе труп, а побач — непрыемнай знешнасці грамілу.

Рэжысёр — Грэгары Гало. **У ролях:** Арланда Джонс, Эдзі Графін, Эдвард Герман, Гары Грабс, Дэніэл Робак, Беніні Ніуз.

ЧАЦВЕР, 12 САКАВІКА

5.05, 16.05 Серыял «Два лёсы».
6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55 Навіны.
6.02, 7.05 Прэс-агляд.
6.05, 0.40 Дзень спорту.
6.15, 7.10, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
6.45, 7.45, 18.50, 0.35 Зона Х.
7.30, 8.30, 11.50 Дзелавое жыццё.
8.20 Гатуем разам.
8.35 Зямельнае пытанне.
9.05, 13.55 «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
9.10, 19.55 Серыял «Монтэкрыста».
10.05, 16.55 Серыял «Гарачы лёд».
10.50, 17.50 Серыял «Родныя людзі».
11.40 «Зямля беларуская». «...Прасвятліўшы зямлю Полацкую».
12.10 Гульнявое шоу «Інтуіцыя».
13.05 Серыял «Монк».
14.05 Уласнай персонай.
14.30 Серыял «Офіс».
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.25 Дак. цыкл «Нябачны фронт».
19.30 Сфера інтарэсаў.
21.00 Панарама.
21.50, 0.50 Серыял «Доктар Хаўс».
23.00 Камедыя «Мама, не бядуй».

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.00, 1.10 Нашы навіны.
6.05 «Наша рані

ВА ЎНІВЕРМАГУ «БЕЛАРУСЬ» — ЗНОЎ ЗНІЖКІ І ЗНОЎ СВЯТОЧНЫ НАСТРОЙ!

Прадавец Алена ЦІМАНОВІЧ працуе ў секцыі беларускіх сувеніраў — тут вы набудзеце добры падарунак да свята.

Універмаг «Беларусь» на Партызанскім праспекце.

Універмаг «Беларусь» называюць тварам сталіцы і краіны. Трэба сказаць, што гэта адно з самых буйных гандлёвых прадпрыемстваў рэспублікі цалкам адпавядае сваёй высокай назве. Тут сапраўды ёсць усё, што вырабляецца на беларускіх прадпрыемствах. Аднак гэтага было б недастаткова, калі б не была створана асаблівая, надзвычай гасцінная, святочная і цёплая атмасфера для пакупнікоў. Вялізныя плошчы, светлыя залы, зручна размешчаныя тавары, высокапрафесійныя прадаўцы-кансультанты, самыя сучасныя тэхналогіі продажу — усё гэта ўнівермаг «Беларусь». Як вынік — нязменна высокі таварааварот. Штодня сюды прыходзіць больш за 35 тысяч пакупнікоў і кожны выходзіць задаволены.

За гэтым стаіць зладжаная і гнуткая сістэма работы з пастаўшчыкамі, якіх больш за паўтары тысячы. Універмаг імкнецца напрамую працаваць з вытворцамі, што дазваляе прапанаваць тавар гарантаванай якасці людзям з любым узроўнем дастатку. Сюды можна прыйсці не проста каб нешта набыць, але і каб даведацца пра навінкі, асаблівасці матэрыялаў, напрамкі моды. Універмаг практыкуе сумесныя з вытворцамі выстаўкі-продажы, на якіх спецыялісты прадпрыемстваў даюць кансультацыі пакупнікам. Як правіла, такія акцыі суправаджаюцца розыгрышамі, дэманстрацыямі, уручэннем прызоў і падарункаў.

У гэтыя дні пачатку сакавіка ўнівермаг прапануе зніжкі на халадзільнікі, маразільнікі, пральныя машыны, шпалеры, хрусталь, жаночыя скураныя пальчаткі... У вясновыя перадсвяточныя і святочныя дні тут адбываецца пашыраны продаж з уручэннем падарункаў касметычнай і парфумернай прадукцыі, сталовай бялізны. На ўвесь сакавік разлічаны пашыраны продаж жаночага адзення, курток, мужчынскага абутку, дзіцячай бялізны, панчошна-шкарпэтачных вырабаў, сумак і г.д.

Універмаг «Беларусь» — гэта не толькі надзвычай шырокі асартымент тавараў, гэта яшчэ зручнасць і камфорт. Тут працуе дзіцячы пакой, утульная кавярня, усталяваны банкаматы, пункты абмену валют, тэрміналы для аплаты па пластыкавых картках, бясшумныя эскалатары, кандыцыянеры, месцы адпачынку. Пакупнікам ва ўнівермагу раскрояць тканіну, падгоняць толькі што набытае адзенне, апрацуюць аверлокам дывановую дарожку, бясплатна даставяць крупнагабарытны тавар дадому. У сценах «Беларусі» прапануецца больш за 50 дадатковых паслуг.

Асаблівы гонар — прадуктовы аддзел, які, апроч іншага, прапануе хлебабулачныя вырабы ўласнай вытворчасці (за пасхальнымі кулічамі сюды прыходзіць увесь Заводскі раён горада). Метад самаабслугоўвання ў гэтым аддзеле дазваляе зэканоміць час — тут практычна не бывае чэргаў.

Яшчэ адна важная ўмова паспяховай работы ўнівермага — калектыў. Летась ён адзначыў 30-годдзе свайго прадпрыемства. Тады, у 1978-м, была закладзена аснова, якая дазваляе гэтаму гандлёваму гіганту заставацца даволі гнуткім і бліскуча пераважваць любыя часы. Напэўна, адна з галоўных традыцый, на якіх трымаецца ўнівермаг, — ашчадныя адносіны да супрацоўнікаў і як вынік — высокая культура абслугоўвання пакупнікоў. Універмаг мае цудоўныя спартыўную, актавую і чытальную залы, бібліятэку, цырульню, сталовую. Ёсць тут і з густам абсталяваны пакой кароткатэрміновага адпачынку і рэлаксацыі працаўнікоў універмага пад кіраўніцтвам штатнага псіхолага. Асаблівая тэма — медыцынскі блок. Тут не толькі працуе ўласны доктар і фельчар, якіх супрацоўнікі крамы заслужана называюць сваімі сямейнымі лекарамі. Ёсць працэдурны пакой, усталяваны масажныя кушэтка і фатэль, сучасны фізіякабінет.

Кожны чалавек, які працуе ва ўнівермагу, можа раскрыць свае здольнасці, самарэалізавацца. Самадзейны калектыў «Беларусі» займае прызавыя месцы на гарадскіх і рэспубліканскіх конкурсах.

Філіял на вуліцы Маскоўскай: больш зручна і больш індывідуальна

Універмаг «Беларусь» мае тры філіялы. Усе яны паспяхова працуюць. Гэта — «Прамысловыя тавары» на вуліцы Сяліцкага (м-н Шабаны) і «Прадуктовыя тавары» на вуліцы Тухачэўскага. Трэці філіял адкрыўся нядаўна — 1 ліпеня 2008 года. Гэта былы гандлёвы дом «Кастрычніцкі» на вуліцы Маскоўскай, які да моманту далучэння да ўнівермага доўгі час працаваў са стратамі. І вось чаканы цуд адбыўся — новы філіял за паўгода работы павысіў свой таварааварот болей чым у два разы, працуе без страт і набірае абароты. Змяніўся знешні выгляд, заблішчэлі вітрыны, прывабна засвяцілася новая газасветлавая рэклама «Універмаг «Беларусь».

У чэрвені тут быў цалкам зменены асартымент. Па групах тавару адкрыты такія ж самыя аддзелы, як і ва ўнівермагу: гаспадарчы, мужчынскі, жаночы, дзіцячы, галантарэя і парфумерыя. Чалавек можа прыйсці сюды, апрануць сябе і сям'ю, ды яшчэ і купіць усё патрэбнае ў дом, пачынаючы ад зубной шчоткі і заканчваючы складанай бытавой тэхнікай.

Прадавец Надзея СІДАК выдатна ведае асартымент айчынных і замежных вытворцаў парфумерыі.

Крама працуе па прынцыпе самаабслугоўвання. Любы тавар можна ўзяць у рукі, разгледзець, памацаць. Прадаўцы-кансультанты дапамогуць спыніць свой выбар, адкажуць на ўсе пытанні, раскажуць пра матэрыял, яго практычныя якасці, парэкамендуюць тое, што найбольш адпавядае модзе і пасуе.

Тавары тут выстаўлены так, каб іх зручна было падабраць адно пад адно. Напрыклад, у мужчынскай секцыі разам з сарочкай абавязкова будзе прапанаваны гальштук, найбольш адпаведны для яе па колеры і стылі. Тут жа гальштук завяжуць, падбяруць рэмень. На гэтай жа тэрыторыі выстаўлены касцюмы, штаны, бялізна, трыкатаж, махровыя халаты і шкарпэткі. Такім чынам, мужчына ў гэтай краме можа набыць сабе поўны гардэроб з «нуля» практычна ў адным месцы і за кароткі час.

Сувязь з асноўным універмагам дазваляе краме часта мяняць асартымент. Тавар тут не залежваецца. Тут заўсёды можна знайсці самыя новыя мадэлі і апошнія навінкі. Адначасова філіял імкнецца дагадзіць тым, хто любіць эканоміць. Дзякуючы прамым дагаворам з вытворцамі, нярэдка з'яўляецца тавар за невялікія грошы. Напрыклад, у канцы лютага было атрымана больш за 1000 адзінак трыкатажных вырабаў з Пінска, на якія зніжкі ўсталяваў сам вытворца. Тут можна было знайсці касцюмы за... 4-5 тысяч беларускіх рублёў! Зразумела, іх раскупілі ўмомант. Падобныя падарункі пакупнікам філіял наладжвае рэгулярна.

Універмаг «Беларусь» прапануе наведвальнікам вырабы з каштоўных металаў, зробленыя майстрамі з Мінска, Бабруйска, Масквы, Кіева. Дарадцамі ў выбары стануць прадаўцы Юлія БАЛАХОНАВА і Аксана СТАРЫЧКОВА.

Ёсць тут і нятанныя вырабы прэстыжных брэндаў, і не менш якасныя — іх канкурэнтаў, яшчэ пакуль не настолькі вядомых, таму не такія дарагія.

Філіял універмага «Беларусь» па вуліцы Маскоўскай, 1/2 добра ведае сваіх пастаянных кліентаў. Тут купляюць джэмперы вядомага беларускага вытворцы супрацоўнікі буйнога медыцынскага цэнтра, дарагія расійскія касцюмы — выкладчыкі вышэйшых навучальных установ, абутак — служачыя.

Вуліца Маскоўская, на якой знаходзіцца крама, з'яўляецца магістральнай у сталіцы. Гэта адміністрацыйны раён, тут шмат офісаў, кантор, навучальных і лячэбных устаноў. Гэта значыць, што часта пакупнік сюды заходзіць падчас абедзенняга перапынку, пасля працы, ён шкадуе свой час, і задача прадаўцоў — дапамагчы хутка знайсці тое, што ён шукае.

Трэба сказаць, што прадаўцы тут працуюць высокакваліфікаваныя, яны выдатна робяць сваю справу. Іх крэда: задаволіць любога пакупніка, адчуць, што чалавеку патрэбна. Практычна ўвесь калектыў захаваны з часоў гандлёвага дома «Кастрычніцкі». У 1980-90-я гады ён быў адным з найлепшых у горадзе. Цяпер супрацоўнікі крамы быццам акрыялі, яны зноў адчулі пад'ём. Многіх пакупнікоў яны ведаюць у твар, сустракаюць як старых знаёмых, не менш рады і новым людзям, незалежна ад узросту і сацыяльнага статусу. Да ўсіх — з вялікай увагай і шанаваннем. Можа, таму тут пануе ўтульная псіхалагічная атмасфера, расставацца з якой шкада. І не дзіўна, што калектыў гэтай крамы атрымлівае шмат падзяк ад наведвальнікаў.

Гэту краму паспелі прыкмеціць і палюбіць госці сталіцы. Яны знаходзяць тут у надзвычай шырокім асартыменце якасны, даступны і яскравы беларускі тавар. Асаблівай папулярнасцю ў іх карыстаюцца наш трыкатаж і абутак.

Крама імкнецца задаволіць кожнага патэнцыйнага пакупніка. Калі здараецца такое, што патрэбнай рэчы няма, дастаткова пакінуць заяўку. Таваразнаўцы знойдуць тое, што вы шукаеце, пераздоняць вам на кантактны тэлефон і прапануюць зайсці і набыць. Такім чынам, любы чалавек тут можа адчуць сябе віп-персонай.

Тут умеюць лічыцца і з нешматлікімі пакупнікамі. Напрыклад, у дзіцячым аддзеле і аддзеле канцтавараў пакуль не багата кліентаў, аднак паблізу няма крамаў, дзе можна было б набыць цацкі, дзіцячае адзенне, а таксама сшыткі і пісьмовыя прыналежнасці. А для прыезджага, які апынуўся на суседняй вуліцы Дружнай, апошняе можа быць неабходным. Гэта значыць, што яго інтарэсы таксама павінны быць задаволены. Спецыфіка гэтай крамы ў тым, што інтарэсы чалавека тут стаяць на першым месцы.

З гэтай прычыны абнавілі тэрміналы для счытвання грошай з пластыкавых картак і павялічылі іх колькасць. Тут можна набыць тавар па безнаяўным разліку, чым нярэдка карыстаюцца арганізацыі.

Для большай зручнасці пакупнікоў кіраўніцтва крамы дамаглося дазволу зрабіць непадалёк прыпынак гарадскіх аўтобусаў. Зараз вырашаецца пытанне і пра дадатковы тралейбусны прыпынак.

Такім чынам, і сам універмаг, і яго філіялы заваёўваюць сэрцы мінчан і гасцей сталіцы. Набыць нешта новае і пры гэтым атрымаць каласальнае задавальненне ад чалавечых зносінаў — гэта тут, у «Беларусі»!

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА, Алена ДАЎЖАНОК. Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

УНП 100098469

Студэнтка Людміла КОЎШЫК завітала ва ўнівермаг па пакупкі для свайго пакоя ў інтэрнаце. Прадавец Анастасія МАРЫНОХА ведае, як танна і рацыянальна ўпрыгожыць моладзевае жытло.

Загадчык секцыі Віталій ГАЛІЦКІ — кампетэнтны знаўца складанай бытавой тэхнікі, ад яго мінчанін Уладзімір КАПУСТА даведаўся пра «сакрэты» кухоннага электраабсталявання.

Універмаг «Беларусь» на вуліцы Маскоўскай.

НЕСАПРАЎДНЫ ПАШПАРТ

Я нядаўна выйшла замуж і памяняла сваё прозвішча на прозвішча мужа. Мне паставілі адзнаку ў пашпарце, што ён падлягае абмену. На працягу якога тэрміну я магу карыстацца старым пашпартам, ці ёсць якая-небудзь адказнасць, калі я не памяняю яго ў бліжэйшыя паўгода.

Жанна Р., г. Гомель

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 294 «Аб дакументаванні насельніцтва Рэспублікі Беларусь» ад 3 чэрвеня 2008 года зацверджана Палажэнне аб дакументах, якія пацвярджаюць асобу. Гэтым Палажэннем вызначаны парадак выдачы, выкарыстання, абмену, прызнання несапраўднымі, адабрання, захоўвання, знішчэння дакументаў, якія пацвярджаюць асобу.

Пунктам 23 Палажэння (абзац 2), вызначана, што змяненне (перамена) прозвішча, уласнага імя, імя па бацьку ўладальніка пашпарта з'яўляецца падставай для яго абмену. Пунктам 8 Палажэння пералічаны выпадкі, пры наступленні якіх дакумент, які пацвярджае асобу, з'яўляецца несапраўдным. Так, згодна з гэтым пунктам, пашпарт з'яўляецца несапраўдным у выпадку неабходнасці яго абмену на падставе, што названа ў другім абзацы пункта 23 Палажэння, пасля заканчэння аднаго месяца з дня змянення (перамены) прозвішча, уласнага імя, імя па бацьку ўладальніка дакумента, які пацвярджае асобу. Пашпарт для пастаяннага пражывання за межамі Рэспублікі Беларусь з'яўляецца несапраўдным пасля заканчэння трох месяцаў з дня змянення (перамены) прозвішча, уласнага імя, імя па бацьку ўладальніка гэтага дакумента.

Выдача і абмен пашпарта грамадзяніну, які пражывае ў Рэспубліцы Беларусь, ажыццяўляецца органамі ўнутраных спраў па месцы жыхарства (пункт 24 Палажэння). Грамадзяне, якія выехалі з месца жыхарства на вучобу ў межах Рэспублікі Беларусь, падаюць дакументы ў падраздзяленні па грамадзянстве і міграцыі па месцы знаходжання пры ўмове наяўнасці ў іх пасведчання аб рэгістрацыі па месцы знаходжання. Прыём дакументаў ад грамадзян, якія жывуць у дамах, што абслугоўваюць арганізацыі, якія ажыццяўляюць эксплуатацыю жыллёвага фонду, ажыццяўляецца асобамі, упаўнаважанымі гэтымі арганізацыямі.

Для абмену пашпарта ў сувязі з пераменай прозвішча, уласнага імя, імя па бацьку грамадзянін падае заяву, пашпарт, які падлягае абмену, чатыры каляровыя здымкі, пасведчанне аб нараджэнні, пасведчанне аб заключэнні шлюбу (для грамадзян, якія знаходзяцца ў шлюбе), пасведчанне або рашэнне суда аб скасаванні шлюбу (калі гэта адбывалася), пасведчанне аб перамене прозвішча, уласнага імя, імя па бацьку, дакумент, які пацвярджае аплату дзяржаўнай пошліны (0,5 базавай велічыні для грамадзян Рэспублікі Беларусь). Падрабязней наборам неабходных дакументаў трэба цікавіцца па месцы іх прыёму для абмену пашпарта.

За карыстанне старым пашпартам вас могуць аштрафаваць. Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях за гэта ўстаноўлена адказнасць. Згодна з пунктам 3 артыкула 23.53 гэтага Кодэкса, пражыванне без пашпарта або па несапраўдным пашпарце цягне накладанне штрафу ў памеры ад двух да чатырох базавых велічынь. На цяперашні час памер базавай велічыні складае 35 тысяч беларускіх рублёў. Пратаколы аб гэтым правапарушэнні складаюць упаўнаважаныя асобы органаў унутраных спраў.

Факт

НА 1000 МУЖЧЫН ПРЫПАДАЕ 1144 ЖАНЧЫНЫ

У Беларусі, паводле папярэдніх даных, на 1 студзеня гэтага года жанчын налічвалася 5 млн 160,1 тыс. (53,4 працэнта насельніцтва краіны). Як паведаміла карэспандэнту БЕЛТА прэс-сакратар Нацыянальнага статыстычнага камітэта Алена Кандраценка, большасць жанчын — жыхаркі гарадоў і гарадскіх пасёлкаў (74,1 працэнта).

На 1000 мужчын у рэспубліцы прыпадае 1144 жанчыны. Калі ў гарадах на 1000 мужчын прыпадае 1150 жанчын, то ў сельскай мясцовасці — толькі 1126. Сярод гараджан колькасць мужчын перасягае колькасць жанчын ва ўзроставых групах да 30 гадоў, у сельскай мясцовасці мужчыны пераважаюць ва ўзроставых групах да 55 гадоў.

Найбольшая дыспрапорцыя па полу назіраецца ў пажылых узростах. Колькасць жанчын ва ўзросце 60-69 гадоў на 1000 мужчын складае ў гарадскіх паселішчах 1500 чалавек, у сельскай мясцовасці — 1554 чалавекі, а ва ўзросце 70 гадоў і старэйшых жанчын амаль у 2,5 раза больш, чым мужчын (прычым і ў гарадах, і ў вёсцы).

На полаўзроставую структуру насельніцтва вялікі ўплыў аказвае працягласць жыцця мужчын і жанчын. Паводле ацэнкі ПРААН, натуральнай розніцай прынята лічыць 5 гадоў. У Беларусі ж захоўваецца значная розніца ў працягласці жыцця мужчын і жанчын. Яна склала ў 2007 годзе амаль 12 гадоў (мужчыны жывуць у сярэднім 64,5 года, жанчыны — 76,2 года).

БЕЛТА.

Дзве даты

6 сакавіка

1460 год — нарадзіўся Канстанцін Іванавіч Астрожскі, ваеначальнік, гетман, вядомы дзеяч Вялікага Княства Літоўскага. Узначальваў паходы супраць крымскіх татараў, атрымаў перамогі ў 60 бітвах. Быў актыўным абаронцам праваслаўя, будаваў цэрквы ў беларускіх гарадах. Ажаніўшыся на слуцкай князёўне Аляксандры, атрымаў вялікія ўладанні па ўсёй Беларусі — Гальшаны, Глуск, Смалявічы, Свіраны, Дзятлава, Тураў і інш.

1475 год — нарадзіўся Мікеланджэла Буанароці, італьянскі скульптар, жывапісец, архітэктар («Аплакванне Хрыста» — на здымку, «Страшны суд», «Давід», «Клеапатра» і інш).

Цытата дня:

«Армейская дысцыпліна цяжкая, але гэта цяжар шчыта, а не ярма».

Антуан дэ Рыварoль (1753—1801), французскі пісьменнік.

ІУДА

Сярод славян хадзіла думка, што 1 сакавіка Іуда, які здрадзіў Хрысту, здзейсніў самагубства. Можа, таму гэта адзін з самых нешчаслівых дзён для нараджэння чалавека.

● Згодна з народнымі ўяўленнямі, той, хто будзе зачаты ў посны дзень, стане злодзеем і забойцам. У паданнях пра яшчэ і смерць Іуды гаворыцца пра тое, што ён быў зачаты ў пятніцу, а маці была цяжарнай цэлы год. Такім чынам Іуда трапіў у рукі злога анёла.

● Іуда нарадзіўся рыжым, што пацвярджае яго злосны нораў. Дзень яго нараджэння — 1 красавіка, таму і гэты дзень стаў нешчаслівым, неспрыяльным у народнай культуры.

● Бацькі пасадзілі сына ў бочку і кінулі ў мора, таму што ўбачылі сон, у якім іх дарослы сын заб'е бацьку і ажэніцца з маці. Але Іуда выжыў і праз шмат гадоў здзейсніў забойства і кровазмяшэнне. Іуда пакаяўся і 33 гады насіў ваду на вяршыню гары: паліваў сухую галінку, пакуль тая не заквітнела. Іуда быў дараваны і прыняты ў лік вучняў Хрыста.

● У народнай культуры і сёння існуе шэраг забаронаў, якія звязаны з паводзінамі Іуды на Тайнай Вячэры і з яго здрадай:

- нельга браць соль з салонкі пальцам;
- нельга мачаць лусту хлеба ў салонку;
- нельга класці лыжку «дагары дном»;
- за святочным сталом не павінна сядзець адначасова 13 чалавек, колькі было падчас Тайнай Вячэры.

● Пасля ўчыненай здрады Іуда скончыў жыццё самагубствам. Паводле славянскіх паданняў, Іуда павесіўся на асіне, з-за чаго яна ўвесь час дрыжыць. Раней жа ён абраў бярозу, якая збялела ад жаху, але змяніў сваё рашэнне. Кроў Іуды трапіла на вольху, з-за чаго яе драўніна набыла чырвонае адценне. Ісус Хрыстос дараваў здраду свайму вучню і звяў яго ў рай, але Іуда адмовіўся, і тады Ісус пасяліў Іуду ў пекла.

● З тых часоў душа Іуды вандруе па зямлі і трапляе ў тых, хто не прытрымліваецца посту на Страсным тыдні, выклікае хваробы.

● Па меркаваннях нашых продкаў, пасля смерці Іуды на зямлі з'явіліся вісельнікі, тапельцы і самагубцы.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.46	17.56	11.10
Віцебск —	6.37	17.45	11.08
Магілёў —	6.36	17.47	11.11
Гомель —	6.31	17.45	11.14
Брэст —	7.01	18.12	11.11
Гродна —	7.00	18.14	11.14

Месяц

Першая квадра.
Месяц у сузор'і Рака.

Імяніны

Пр. *Аляксандра, Астапа, Георгія, Данілы, Цімафея.*

К. *Клаўдзіі, Ружы, Эльвіры, Віктара.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НАДВОР'Е на заўтра



АКТЫЎНЫ АДПАЧЫНАК — НАСУПЕРАК КРЫЗІСУ!

З 10 па 13 сакавіка ў Нацыянальным выставачным цэнтры «Белэкспа» (вуліца Я. Купалы, 27) будзе праходзіць 6-я міжнародная спецыялізаваная выстава-кірмаш «Паляванне і рыбалоўства. Актыўны адпачынак-2009». Гэтае мерапрыемства ўжо каторы год запар нязменна выклікае цікаўнасць як кампаній-удзельнікаў, так і ў шараговых наведвальнікаў: колькасць і першых, і другіх увесь час павялічваецца. Да прыкладу, летась выставу за тры дні наведала больш за 30 тысяч чалавек. Калі гаварыць пра ўдзельнікаў, дык сёлета яшчэ за паўтара месяца да яе пачатку заяўкі на ўдзел падалі больш за 100 кампаній.

Апошнім часам арганізатары і ўдзельнікі выставы імкнуцца ўвесь час здзіўляць наведвальнікаў, прапануючы ім кожны раз нешта цікавае. Сёлета таксама запланавана такая «разынка». Улічваючы пажаданні апошніх, і ўвогуле дастаткова вялікі інтарэс і попыт беларусаў на актыўны адпачынак, было вырашана некалькі змяніць стандартны фармат і акрамя традыцыйных кампанентаў — паляванне і рыбалоўства — уключыць у праграму выставы яшчэ адзін: актыўны адпачынак. І тое праўда! Нават калі прыгадаць леташні рэпартаж з выставы ў «Звяздзе», мы тады адзначалі, што на яе можна прыходзіць усёй сям'ёй — кожнаму з членаў тут знойдзецца на што паглядзець і што набыць, нават калі далёка не ўсе родныя захапляюцца паляваннем ці рыбалкай. Проста актыўны адпачынак даступны ўсім! Тавары для яго на выставе з кожным годам прапаноўвалі ўсё больш кампаній. А з сёлетняга сезона актыўны адпачынак стаў паўнавартасным трэцім напрамкам форуму: наведвальнікі змогуць вывучыць прапановы айчынных і замежных кампаній на рынку турыстычных і спартыўных тавараў, а пры жаданні — і набыць любы неабходны рыштунак. Як кажуць, рыхтуй лодку зімой!

Дарэчы, пра апошнія. Паводле слоў арганізатараў выставы, за апошнія гады праявілася тэндэнцыя да росту экспазіцыі маламерных суднаў (якія па-ранейшаму адразу пасля набыцця можна зарэгістраваць прама тут у прадстаўнікоў Дзяржаўнай інспекцыі маламерных суднаў). Тое ж можна з упэўненасцю сказаць і пра айчынных вытворцаў у сферы пашыву адзення і вопраткі для паляўнічых і рыбаловаў.

Зразумела, на выставе будуць прэзентаваны ўсе новыя рыбалоўныя калекцыі прыладаў, рыштунку — як ад айчынных вытворцаў, так і замежных. Улічваючы, што да новага рыбалоўнага сезона засталося не так шмат часу, бясспрэчна, гэтыя экспазіцыі па традыцыі выклікаюць найбольшую цікаўнасць у наведвальнікаў. Зрэшты, не будуць пакрыўджаны і аматары палявання. На выставе можна будзе набыць рыбалоўныя і паляўнічыя туры ў шэраг прыгожых мясцін Беларусі.

Па традыцыі, да ўвагі наведвальнікаў будуць паляўнічыя трафеі, можна будзе паспаборнічаць у стральбе з электроннай зброі (летась мы падрабязна пісалі пра гэта), убачыць модны паказ адзення для паляўнічых і рыбаловаў, паўдзельнічаць у фотаконкурсе. Сёлета, дарэчы, фотаконкурсаў будзе ажно два: акрамя традыцыйнага, што ладзіць газета «Рыбалоў», плануецца абвясціць і новы, удзел у якім зможа ўзяць любы ахвотны. Словам, актыўным трэба будзе быць не толькі на адпачынку, але і на самой выставе — каб паспець усё ўбачыць, у нечым паўдзельнічаць і абавязкова — штосьці набыць.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Усміхнёмся!

Ляжу я неяк на канапе, чытаю газету, адным вокам гляджу футбол па тэлевізары, п'ю піва, ем чыпсы, гуляю нагой з сабакам — і тут заходзіць жонка і пачынае крычаць, што я нічога не раблю!

☺

— Даруйце, я задавіў вашу кошку. Магу заплаціць або замяніць.

— Замяніць, кажаце? А мышэй лавіць вы ўмееце?

☺

— Алё, я ўжо каля дома, што-небудзь купіць? Вось толькі не трэба мне казаць, што ў нас дома дастаткова гарэлкі!

☺

— Можа перакусім?

— Дык гэта ж на тым тыдні было.

— Дык па два ж кубачкі.

ПЯТНІЦА, 13 САКАВІКА

5.05, 16.05 Серыял «Два лёсы».
6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55 Навіны.
6.02, 7.05 Прэс-агляд.
6.05, 1.40 Дзень спорту.
6.15, 7.10, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
6.45, 7.45, 19.30 Зона Х.
7.30, 11.50 Дзелавое жыццё.
8.20 Гатуем разам.
8.35 Сфера інтарэсаў.
9.05, 13.55 «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
9.10, 19.55 Серыял «Мантэкрыста».
10.05 Серыял «Гарачы лёд».
10.50, 18.05 Серыял «Родныя людзі».
11.40 «ЕўраФэст. Дзень за днём».
12.10 Гульнявое шоу «Інтуіцыя».
13.05 Серыял «Монк».
14.05 Шпілька.
14.30 Серыял «Офіс».
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.25 Дак. цыкл «Нябачны фронт».
16.55 Жаночае ток-шоу «Жыццё як жыццё». «Я не баюся крутых зменаў».
21.00 Панарама.
21.50 Серыял «Героі».
23.35 Трылер «Ракавая жанчына».

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.15, 1.40 Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 Серыял «Рыжая».
10.05 Меладрама «Пан».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.30, 1.55 Навіны спорту.
11.10 «Кантрольная закупка».
12.00 «Малахаў+».
13.10 «Зразумець. Дараваць».
13.45 «Модны прыгавор».
15.00 Серыял «Дзялкі».
16.15 Серыял «Агонь кахання».
17.10 «Няхай гавораць».
18.20 «Дакументальны дэтэктыў».
18.55 Поле цудаў.
20.00 Час.
21.05 «Клуб вясёлых і знаходлівых». Вышэйшая ліга.
23.35 «Наша Belarussia».
0.10 Камедыя «Жорсткія гульні 2».

6.55 «Ранішняя падзарадка».
7.55, 16.30 Смачна з Барысам Бурдой.
8.20 Серыял «Забойная сіла-6».
9.15 У гэты дзень.
9.20 Гадзіна суда. Справы сямейныя.
10.05 Час футбола.
10.30 «Спорт, спорт, спорт...». Алена Мікуліч.
10.55, 17.30 Серыял «Спадчынніца».
11.50 Камедыя «Дамы запрашаюць кавалераў».
13.05 Серыял «Расплата за грахі».
13.55 Мультсерыял «Сонік Iкс».
14.35 Пазакласная гадзіна.
14.50 Школа рамонту.
15.35 Гадзіна суда з Паўлам Астахавым.
16.55 Усё пра бяспеку.
18.30 Навіны культуры.
18.45 Жаночая ліга.
19.10 Біятлон. Кубак свету. Спрынт. Жанчыны.
20.40 Калыханка.
21.00 Меладрама «Анатомія Грэй».
22.55 Біятлон. Кубак свету. Спрынт. Мужчыны.

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.40 «Раніца. Студыя добрага настрою».
8.30 «Аўтапанарама».
8.50 Серыял «Атрад».
10.00 «Пяць гісторый».
10.40 Серыял «Танга ўтраіх».
11.45, 18.25 Серыял «Багатая і любімая».
12.40, 17.30 «Званая вячэра».
13.50 «Прывітанне, доктар!».
14.20 «Далёкія сваякі».
14.40 Серыял «Брыдкае качаня».
15.30 Серыял «Салдаты. Новы прызыў».
16.50 «Асабісты інтарэс».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
20.15 «Добры вечар, малы».
20.35 Камедыя «Дзіўныя сваякі».
23.00 «Відзьма-нявідзьма».
23.40 Маст. фільм «Дзённікі мерцвякоў».

5.00, 6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 20.00, 21.00, 22.00, 23.00, 0.00, 1.00 Навіны Садружнасці.
5.05, 6.05, 7.05 Садружнасць live.
5.30 «Рэальныя гісторыі». «Аб чым маўчаць рэжысёры — кіналяпы».
6.35 «Удачная пакупка».
6.45 «Цік-так».
7.30 «Рандэву з зоркай».
8.05, 1.45 «Жывая гісторыя».
9.05 Ток-шоу «Слова за слова».
10.05 Серыял «Скрыжаванне».
11.05 Серыял «Дзяўчынка з поўначы».
12.05, 0.05 Маст. фільм «Апошняя справа камісара Берлаха».
14.05 Мультсерыял «Рэдвол».
14.30 Серыял «Прыгоды Сіндбада».
15.20 «Культурны слой з Львом Лур'е».
15.55 «Білет на сёння».
16.05, 3.50 «Гадзіна суда. Справы сямейныя».
17.05 Серыял «Каханне як каханне».
18.20 Акцэнты.
18.30 «Лекі ад крызісу».
19.05 «Нашы рэкорды».
20.05 Канцэрт «Вясна рамансу».
21.20, 2.50 Дак. дэтэктыў. Паражальны бумеранг. Перахоп на зямлі. Справа пра суперракету.
22.30 «Увесь гэты рок».
23.15 Дак. фільм «Кома гэта праўда».

7.00, 10.40 «Навіны кіно».
7.10, 10.55, 23.30 «Метэапрагноз».
7.15 Серыял «Гардэмарыны, наперад!».
8.30, 18.45 Дак. серыял «Грэцыя вачыма гурмана».
9.00 «Дом жывых гісторый».
9.30 «К-відэа» для дзяцей.
9.50, 19.45 Серыял «Салодкі плод».
11.00 Баявік «Скалалаз».
13.00 «Дзённы тэлечат».
16.30 Мультпарад.
17.00 Серыял «Штрафнікі».
17.50 «Ін-фармацыя».
18.00 Серыял «Астанкі, якія гавораць».
19.10 «К-гульні».
19.15 «Адшукваецца адпачынак».
19.35 «8 самых».
20.45 «Вечарніца».
21.00 «К-відэа для ўсёй сям'і».
21.05 Трылер «Тэлепартацыя».
21.30 Дак. серыял «Іран».
23.00 «Хіт-парад тэлечата».

7.00 Добрай раніцы, Расія!
9.10 Серыял «Кармеліта».
10.00 Серыял «Даішнікі».
11.00, 14.00, 17.00, 19.00 Весткі.
11.30 Серыял «Трое супраць усіх».
12.20 Маст. фільм «Адкрыццё».
13.50, 16.50, 18.50, 23.20 Навіны—Беларусь.
14.20 «Кулагін і партнёры».
14.55 «Маналогі вялікага Дуні». Дак. фільм.
17.25 «Гарадок».
17.55 Серыял «Жанчына без мінулага».
19.30 «Парад зорак».
21.25 Камедыя «Дзевяць прыкмет здрады».
23.30 Дэтэктыў «Небяспечны паварот».

7.00 «Добрай раніцы, Расія!»
10.00, 17.30, 0.25 Серыял «Родныя людзі».
10.45, 18.15, 1.10 Серыял «Лэдзі Бомж».
11.30 «Эпізоды». Лілія Талмачова.
12.10 Серыял «Даішнікі».
13.00, 16.00, 19.00, 3.00 Весткі.
13.20 Весткі—Масква.
13.35 Серыял «Сітуацыя 202. Хвароба руху».
14.30 Мультфільм.
14.45 «Маналог у чатырох частках». Павел Чухрай.
15.15 «Мой сярэбраны шар. Павел Кадачнікаў».
16.20 Весткі—Паўночны Каўказ.
16.45 Весткі—спорт.
17.00 «Пятае вымярэнне».
19.45, 1.55 Серыял «Кармеліта».
20.30, 3.45 Дэтэктыў «Небяспечны паварот».
23.40 «Вакол смеху. Нонстоп».
2.40 Навіны культуры.

6.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
6.05 «Сёння раніцай».
9.05 «Рускія сенсацыі».
10.25 «Іх норавы».
10.55 «Жаночы погляд».
11.25 Серыял «Сакрэтныя даручэнні».
12.10 Серыял «Сола для пісталета з аркестрам».
13.30 Серыял «Сышчыкі-4».
15.30 «Агляд. Выратавальнікі».
16.30 Серыял «Марскія д'яблы-2».
18.20 «Ты не паверыш! Ньюс».
18.30 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
19.40 Камедыя «Другое жыццё».
21.40 Драма «Бумер. Фільм другі».
23.45 Трылер «Мёртвыя дочкі».

7.15 Канал «Настрой».
9.25 «Энцыклапедыя». Клаўдзій Гален.

9.30, 18.30, 3.05 Серыял «Трымай мяне мацней».
10.15, 19.20 Мультфільм.
10.30, 13.30, 16.30, 19.30 Падзеі.
10.45 Маст. фільм «Дзень шчасця».
12.20, 3.50 «Запрашае Барыс Ноткін». Дзмітрый Маліка ў.
12.45 Серыял «Каманда».
13.45 «Скандальнае жыццё» з Вольгай Б. Сярод гор смецця.
14.20 «Масква і свет».
14.35 «Маскоўскія прыгажуні». Таццяна Акуневская.
15.00, 6.10 Серыял «Жонка Іуды».
15.50, 5.30 «У цэнтры ўвагі». «Вайна таксістаў і «бамбіл».
16.50, 2.05 Серыял «Інспектар Дэрык».
17.50 Сусветная гісторыя здрадніцтваў «І ты, Брут!».
20.05 Серыял «Каманда».
20.50 «Народ хоча ведаць».
21.45, 4.15 Серыял «Галіна».
22.35 Маст. фільм «Адны і другія».
1.35 Падзеі. 25-я гадзіна.

9.30, 12.30 Горныя лыжы. Кубак свету.
11.45, 17.30, 2.00 Скачкі на лыжах з трамплiна. Кубак свету.
14.15 Футбол. Кубак УЕФА. 1/8 фіналу.
15.15 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу.
16.15 Веласпорт. Парыж — Ніца.
19.15, 23.00 Біятлон. Кубак свету.
20.45, 0.45 Футбол. Еўрагалы.
21.00 Канькабежны спорт. Чэмпіянат свету.
0.30 Экстрэмальны спорт.
1.00 Чэмпіянат свету. «Ралі Кіпра».
1.30 «Прыгоды». Часопіс.

21.40 ФІЛЬМ ДНЯ

«БУМЕР. ФІЛЬМ ДРУГІ» (РАСІЯ, 2006 г.)

Кот выходзіць на свабоду раней, чым чакаў, і хоча пачаць новае жыццё. Але за свабоду, якую яму купіў Дзімон, заплачана крывёй іншага. І вось ужо Кот у новым «бумеры» едзе да сястры хлопца, які з-за яго загінуў, каб перадаць яго перадсмяротнае пісьмо і паспрабаваць вымаліць прабачэнне.

Рэжысёр — Пётр Буслоў. **У ролях:** Святлана Усцінава, Уладзімір Удавічэнкаў, Андрэй Мярзлікін, Аляксандр Голубеў, Мікалай Алялін, Дар'я Мішчанка, Сяргей Гаробчанка.



СУБОТА, 14 САКАВІКА

6.25 Серыял «Сэрца акіяна».
6.50 Брытва Акама.
7.15 Існасць.
7.45 Дзень спорту.
7.55 «Добрай раніцы, Беларусь!».
8.45 Гатуем разам.
9.00, 12.00, 15.00, 18.00 Навіны.
9.10, 15.30 «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
9.15 Здароўе.
9.45 Серыял «Як сказаў Джым».
10.15 Шпілька.
10.55 Ранішняя хваля.
11.30 Дак. фільм «Тайны забытых перамог».
12.10 Камедыя «Кадрыля».
13.45 Дак. фільм «Любоў Палішчук. Барацьба за права быць».
14.30 Відэафільм АТН «Двайны падрад на забойства».
15.10 Навіны рэгіёна.
15.35 Вакол планеты.
16.20 «Зона Х». Вынікі тыдня.
16.40 Гульнявое шоу «Інтуіцыя».
17.45 «Зямля беларуская». «Волаты зямлі Віцебскай».
18.20 «Ваша лато».
19.10 Латарэя «Пяцёрачка».
19.20 «Мінскі джаз-2009».
21.00 Панарама.
21.45 Відэафільм АТН «Даруй мне».
22.10 Камедыя «Пра Шміта».
0.30 «Уласнай персонай».
1.00 Серыял «30 Рок».

7.00 «Суботняя раніца».
8.00, 9.00, 16.00, 20.30 Нашы навіны.
9.05 Серыял «Шчаслівыя разам».
9.35 «Здароўе».
10.20 «Смак».
11.10 Камедыя «Гараж».
13.00 Тэлечасопіс «Саюз».
13.30 «Кінаметры вайны». «Чалавечы фактар».
14.00 Маст. фільм «Вайна пад дахамі».
16.15, 21.00 Навіны спорту.
16.20 Вялікая палітыка.
16.50 «Не забывай». Песні Міхаіла Таніча.
18.35 «Адзін супраць усіх».
19.30, 21.05 «Ледніковы перыяд: Глабальнае пацяпленне».
23.05 «Пражэктарперысхілтан».
23.40 Драма «Сільвія».

7.45 Дак. серыял «Сардэчна запрашаю ў маю краіну».
8.15 Серыял «Олівер Твіст».
9.00 Свая кампанія.
10.05 «Тайны смак».
10.35 «Шунін і бландзінкі».
11.00, 4.00 «Хіт-экспрэс».
12.00, 15.00, 18.00, 21.00 Навіны Садружнасці.
12.10 «Любімыя акцёры».
15.55 Білет на сёння.
16.00 Серыял «Дружная сямейка».
17.00, 3.00 «Прагрэс».
18.20, 0.30 Маст. фільм «Любоўная ліхаманка».
20.30 «Дзень пасла».
21.20 Маст. фільм «Двайны агент».
23.30 Серыял «Чорны пакой».

9.00, 15.50 «Навіны кіно».
9.05, 23.30 «Астра-, метэапрагноз».
9.15 «Адзінка ў кубе».
9.45, 16.20 «Мультпарад».
10.00, 18.45 Дак. серыял «Грэцыя вачыма гурмана».
10.30 Трылер «Тэлепартацыя».
12.00 Маст. фільм «Трыстана».
13.45 Камедыя «Лепш не бывае».
16.00 «Адшукваецца адпачынак».
17.00 Камедыя «Кароткае замыканне».
19.15 Серыял «Невідзімка».
20.45 «Вечарніца».
21.00 «К-гульні» — юніёр.
21.05 Трылер «Малышка за мільён».
23.15 «Кіно—кліп—парад».

7.00, 11.00, 14.00 Весткі.
7.10 Дэтэктыў «Заражныя смерцю».
8.45 «Мой сярэбраны шар. Іна Ульянава».
9.40 «Суботнік».
10.25 «Ранішняя пошта».
11.10 Маст. фільм «Часы землямераў».
12.40 «Хаі». Маленькія камедыі.
13.00 Серыял «Марш Турэцкага. Новае назначэнне».
14.20 Камедыя «Сільва».
17.00 «Бабы, наперад!». Канцэрт Алены Сцепаненкі.
19.00 Весткі ў суботу.
19.40 «Суботні вечар».
21.35 Маст. фільм «Сітуацыя 202. Страшная сіла».
23.40 Маст. фільм «Круты паварот».

7.00, 10.00, 13.00 Весткі.
7.10, 10.10 Весткі—Масква.
7.20 Маст. фільм «Часы землямераў».
8.30 Мультфільм.
8.45 «Суботнік».
9.15 «Пакой смеху».
10.20 Біблейскі сюжэт.
10.45, 0.55 Серыял «Угрумрака». 1-я серыя.
12.00 За сямю пячаткамі.
12.30 «Розначытанні».
13.15 «Звычайны канцэрт з Эдуардам Эфіравым».
13.40 Вандроўкі музыканта.
14.15 Набытак рэспублікі.
14.25 «Формула ўлады». Лі Сянь Лун — прэм'ер-міністр Сінгапура.
14.55 «Відавочнае—неверагоднае».
15.20 «У Вашым доме». Святлана Бязродная.
16.00 «Імгненні Юрыя Бондарава».
16.45, 3.35 «Суботні вечар».
18.15, 2.15 Серыял «Вяртанне Турэцкага».
19.00, 3.00 Весткі ў суботу.
19.45 Камедыя «Даярка з Хацапетаўкі».
22.45 Маст. фільм «Канцервы».
5.10 Маст. фільм «Чортава кола».
6.30 «Гарадок».

7.30, 8.45 Мультфільмы.
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.20 «Казкі Бажэнава».
8.55 «Агляд».
9.25 «Без рэцэпта».
10.25 «Галоўная дарога».
10.55 «Кулінарны паядынак».
11.55 «Кватэрнае пытанне».
13.30 «Асабліва небяспечны!».
14.05 Камедыя «Маё вясёлае жыццё».
16.30 «Жаночы погляд».
17.10 Серыял «Закон і парадак: аддзел аператыўных расследаванняў».
19.30 «Прафесія — рэпарцёр».
20.00 «Праграма Максімум».
21.05 «Рускія сенсацыі».
22.00 «Ты не паверыш!».
23.00 Баявік «Асінае гняздо».
0.55 Трылер «Альфа дог».

7.00 Маст. фільм «Дзень шчасця».
8.35 «Надыдзе свая чарга». Дак. фільм.
9.35 «Дзённік вандроўніка». Мурманская вобласць.
10.00 «Pop Corn-TV».
10.30, 13.30, 0.35 Падзеі.
10.50 «Усё пра сабак». Дак. серыял.
11.05 Фільм дзецям «Снягурка».
12.30 Мультпарад.
13.00 Гісторыя рускіх цароў. «Раманавы. Пачатак дынастыі».
13.45 «Рэпарцёр».
14.00 «Непрыручаная прырода Азіі». Дак. серыял.
14.25 «Жалезная лэдзі Эліна Быстрыцкая». Дак. фільм.
15.05 Фільм-спектакль «Шалёныя грошы».
17.35 «Шпіён у цёмных акулярах».
18.15 «Спяём, сябры!». Канцэрт.
19.30, 4.40 Серыял «Прыватны дэтэктыў».
21.00 «Пастскрыптум».
22.00 Маст. фільм «Жыццё адно».
23.40 Часова даступны. Фёдар Бандарчук.
0.50 Маст. фільм «Анкор, яшчэ анкор!».
2.25 Маст. фільм «Жыве такі хлопец».

9.30, 17.00, 2.30 Скачкі на лыжах з трамплiна. Кубак свету.
10.00, 13.45 Горныя лыжы. Кубак свету.
11.45, 14.45, 19.30 Лыжныя гонкі. Кубак свету.
13.00, 18.45 Лыжнае дваяборʼе. Кубак свету.
16.00 Веласпорт. Парыж — Ніца.
20.30 Біятлон. Кубак свету.
23.00 Канькабежны спорт. Чэмпіянат свету.
2.00 Чэмпіянат свету. «Ралі Кіпра».

23.40 ФІЛЬМ ДНЯ

«СІЛЬВІЯ» (ЗША, 2003 г.)

Гісторыя кахання двух знакамітых літаратараў XX стагоддзя — амерыканскай паэтэсы Сільвіі Плат і брытанскага паэта Тэда Х'юса. З моманту першай сустрэчы яны акунуліся ў бурны раман. Вось толькі гісторыя іх сямейнага жыцця скончылася не так, як можна было б чакаць.

Рэжысёр — Крысцін Джэфс. **У ролях:** Дэвід Біркін, Элісан Брус, Аміра Казар, Дэніэл Крэйг.



НЯДЗЕЛЯ, 15 САКАВІКА

6.15 Камедыя «Старэйшы сын».
8.30 Альманах падарожжаў.
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.05 «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
9.10 Арсенал.
9.40 Серыял «Як сказаў Джым».
10.05 Культурныя людзі.
10.40 Усе стыхіі.
11.15 «У свеце мараўʼя».
11.45 «ЕўраФэст. Дзень за днём».
12.10 Камедыя «Формула кахання».
14.00 Дак. серыял «Тайны забытых перамог».
14.30 Дак. цыкл «Нябачны фронт».
15.10 Навіны рэгіёна.
15.30 Nota Bene.
15.55 Фестываль Беларуска-га КВЗ.
17.50 Суперлато.
18.50 Меладрама «Варачка».
20.35 «Спартлато 5 з 36».
21.00 Панарама тыдня.
22.10 Відэафільм АТН «Планета гольфа: Вялікабрытанія».
22.40 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
23.10 Баявік «Бэтмен назаўсёды».

7.00 «Нядзельная раніца».
8.00, 9.00, 16.00 Нашы навіны.
9.05 Нядзельная пропаведзь.
9.20 Серыял «Шчаслівыя разам».
9.50 «Бесталковыя нататкі».
10.10 Пакуль усе дома.
11.00 «Фазэнда».
11.35 Разумнікі і разумніцы.
12.20 «Ранішняя пошта».
13.10 «Дарослыя казкі пра жывёл». Дак. фільм.
13.35 «Адваротны адлік». «У пераплётах пашпартызацыі».
14.05 Праект «Агульная справа».
16.15 Навіны спорту.
16.20 Тэорыя неверагоднасці «Што трымае вагу».
17.10 Камедыя «Аперацыя «Ы» або іншыя прыгоды Шурыка».
19.00 Шоу «Рэкламная паўза».
20.00 Контуры.
21.05 «Дыханне планеты».
21.40 Меладрама «Калі толькі».
23.25 «Камедзі Клаб».
0.00 Меладрама «Танцуй са мной».

8.10 Звон.
8.40 Мір вашаму дому.
8.50 Бухта капітанаў.
9.30 Наша пяцёрачка.
10.00 Мультфільм «Кракадзіл Гена».
10.10 Весткі—Масква. Тыдзень у горадзе.
10.45, 0.55 Серыял «Угрумрака».
12.05 Мультфільмы.
12.20 «Сам себе рэжысёр».
13.15, 6.30 «Гарадок».
13.40 «Хто ў доме гаспадар».
14.10 Камертон.
14.40 «Тым часам».
15.35, 5.50 «І да, і пасля цябе будуць іграць тую ж ролю...» Марк Прудкін.
16.15 «Аншлаг і Кампанія».
17.45 «Сумленны дэтэктыў».
18.15, 2.15 Серыял «Вяртанне Турэцкага».
19.00, 3.00 Весткі тыдня.
20.05, 3.55 «Спецыяльны карэспандэнт».
20.35, 4.20 Маст. фільм «Злачынная страсць».
22.05 Маст. фільм «Башмачнік».
23.50 «Лінія жыцця». Вольга Якаўлева.

7.30 Мультфільм.
8.00, 10.00, 13.00, 16.00 Сёння.
8.15 «Дзікі свет».
8.45 «Іх норавы».
9.20 «Ядзім дома!».
10.25, 20.30 «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
10.55 «Quattroruote».
11.30 «Авіятары».
12.00 «Дачны адказ».
13.25 «Крамлёўскія пахаванні».
14.15 Меладрама «Замужам за незнаёмцам».
16.25 «Барацьба за ўласнасць».
17.00 Серыял «Закон і парадак: Злачынны намер».
19.00 Сёння. Падагульняючая праграма.
19.55 «Чыстасардэчнае прызнанне».
21.00 «Галоўны герой».
22.10 Трылер «Нас не дагоніш».
23.55 «Miss Dim-2008».
1.05 Драма «Свята кахання».

6.10 Маст. фільм «Адны і другія».
9.05 «Праваслаўная энцыклапедыя».
9.35 «Сялянская застава».
10.00 «21 кабінет».
10.30, 1.50 Падзеі.
10.45 «Нашы любімыя жывёлы».
11.10 «АБВГДэйка».
11.35 Мультфільм.
11.45 Маст. фільм «Жыве такі хлопец».
13.20 «Далёкае і блізкае Ілі Рэпіна».
13.50 Маскоўскі тыдзень.
14.20 «Запрашае Барыс Ноткін». Алена Хмяльніцкая.
14.45 «Непрыручаная прырода Азіі». Дак. серыял.
15.10 «Геній Места».
15.35 «Палітычная кухня».
16.05, 2.05 Дэтэктыў «Смерць пад ветразем».
18.05 «Смех з дастаўкай на дом».
19.30, 4.15 Серыял «Прыватны дэтэктыў».
21.00 «У цэнтры падзей».
21.50 Маст. фільм «Лабірынты кахання».
23.15 Фільм-спектакль «Шалёныя грошы».
5.45 «Дз. Ліхачоў. Я ўспамінаю».

9.30 Супербайк. Чэмпіянат свету.
11.00, 12.45, 21.00 Лыжнае дваяборʼе. Кубак свету.
11.45, 19.00 Біятлон. Кубак свету.
13.30 Горныя лыжы. Кубак свету.
14.00, 18.30 Скачкі на лыжах з трамплiна. Кубак свету.
16.30 Веласпорт. Парыж — Ніца.
17.30 Тэніс. Турнір WTA.
20.30 Агляд снежнага ўік-энда.
21.30 Канькабежны спорт. Чэмпіянат свету.
2.00 Чэмпіянат свету. «Ралі Кіпра».

21.40 ФІЛЬМ ДНЯ

«КАЛІ ТОЛЬКІ» (ЗША — ВЯЛІКАБРЫТАНІЯ, 2004 г.)

Недарэчная катастрофа забірае жыццё каханай, і Ян, нарэшце, разумее, што страціў. Калі б толькі ён мог павярнуць час назад, калі б толькі мог пражыць дзень занава, калі б толькі...

Рэжысёр — Джыл Джангер. **У ролях:** Джэніфер Лав Х'юіт, Пол Нікалс, Люсі Дэвенпорт, Том Уілкінсан.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 47 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.
http://www.zviazda.by
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.538 Індэкс 63850. Зак. № 1224. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ПАНЯДЗЕЛАК, 9 САКАВІКА

3.00, 21.00 Драма «Закон супраць легласцяў».
5.00 Трылер «Паўсвятло».
7.00 Камедыя «Графіня з Ганконга».
9.00 Драма «Калі вы будзеце гатовы, містэр Мак-Гіл».
10.30 Драма «Кірмаш славалюбства».
13.00 Камедыя «Гатэль «Сплендыд».
15.00 Драма «Паўночны Усход».
17.00 Камедыя «Осцін Паўэрс: чалавек-загадка міжнароднага маштабу».
18.30 Драма «Вецер, які гайдае вераск».
23.00 Драма «Партрэт Дарыяна Грэя».
0.30 Камедыя «Паводле матываў Джыўса».

АЎТОРАК, 10 САКАВІКА

3.00, 21.00 Трылер «Траўма».
4.30 Драма «Вецер, які гайдае вераск».
7.00 Камедыя «Гатэль «Сплендыд».
9.00 Драма «Паўночны Усход».
11.00 Камедыя «Осцін Паўэрс: чалавек-загадка міжнароднага маштабу».
13.00 Камедыя «Гуд бай, Ленін!».
15.00 Камедыя «Дабіся поспеху зноў».
17.00 Драма «Незакончанае жыццё».
19.00 Трылер «Спартанец».
23.00 Мюзікл «Паводле матываў Джыўса».
1.30 Вестэрн «Паўночная зорка».

СЕРАДА, 11 САКАВІКА

3.00, 21.00 Трылер «Двайны агент».
5.00 Трылер «Спартанец».
7.00 Камедыя «Гуд бай, Ленін!».
9.00 Камедыя «Дабіся поспеху зноў».
11.00 Драма «Незакончанае жыццё».
13.00 Драма «Аднойчы ў Сярэдняй Англіі».
15.00 Камедыя «Місіс Хендэрсан прадстаўляе».
17.00 Мюзікл «Ісус Хрыстос — суперзорка».
19.00 Камедыя «Бітвы салдата Келі».
23.00 Вестэрн «Паўночная зорка».
1.00 Камедыя «Жыгала». Вялікабрытанія.

ЧАЦВЕР, 12 САКАВІКА

3.00, 21.00 Камедыя «Бачнасць гневу».
5.00 Камедыя «Бітвы салдата Келі».
7.00 Драма «Аднойчы ў Сярэдняй Англіі».
9.00 Камедыя «Місіс Хендэрсан прадстаўляе».
11.00 Мюзікл «Ісус Хрыстос — суперзорка».
13.00 Драма «Шарлота Грэй».
15.00 Драма «Вада».
17.00 Драма «Здача».
19.00 Камедыя «Гарольд і Кумар ідуць у адрыў».
23.00 Камедыя «Жыгала».
1.00 Драма «Маці».

ПЯТНІЦА, 13 САКАВІКА

3.00, 21.00 Меладрама «Крок наперад».
5.00 Камедыя «Гарольд і Кумар ідуць у адрыў».
7.00 Драма «Шарлота Грэй».
9.00 Драма «Вада».
11.00 Драма «Здача».
12.50 Камедыя «Рэальнае жыццё».
15.00 Камедыя «Мільёны».
17.00 Камедыя «Распуснiцы».
19.00 Баявік «Онг-Бак. Тайскі воін».
23.00 Драма «Маці».
1.00 Драма «Правілы сэксу».

СУБОТА, 14 САКАВІКА

3.00, 21.00 Камедыя «Вельмі страшнае кіно».
4.30 Камедыя «Рэальнае жыццё».
7.00 Баявік «Онг-Бак. Тайскі воін».
9.00 Камедыя «Мільёны».
11.00 Камедыя «Распуснiцы».
12.50 Мюзікл «Чараўнік».
15.00 Драма «Выпрабаванне Акілы».
17.00 Драма «Нацыя Прозака».
19.00 Трылер «Браты Грым».
23.00 Драма «Правілы сэксу».
1.00 Трылер «Версія 1.0.».

НЯДЗЕЛЯ, 15 САКАВІКА

3.00 Трылер «Браты Грым».
5.30 Мюзікл «Чараўнік».
8.00 Драма «Выпрабаванне Акілы».
10.00 Драма «Нацыя Прозака».
12.00 Драма «Смерць спадара Лазарэску».
15.00 Драма «Прыгажосць па-англійску».
17.00 Камедыя «Чэрчыль ідзе на вайну».
19.00 Драма «Рассякаючы хвалі».
22.00 Трылер «Версія 1.0.».
0.00 Драма «Пастаянныя палюбоўнікі».

ПАНЯДЗЕЛАК, 9 САКАВІКА

7.00, 15.40 «Трукачы».
7.25, 16.05, 2.00 «Сапраўды вялікія рэчы».
8.20, 12.55 Амерыканскія калымагі.
9.15 Як гэта працуе.
10.10 Выжыць любой цаной.
11.05, 20.00, 6.05 Разбуральнікі легендаў.
12.00 «Пятая перадача».
13.50 У пагоні за ўраганам: Тарнада.
14.45, 21.00 Брудная работка.
17.00, 4.45 Аўтамайстэрні: Машына Давіда Жынола.
18.00, 5.40 З чаго гэта зроблена?
19.00, 3.50 Амерыканскі чопер.
22.00, 2.55 Самыя цяжкія работы свету.
23.00 Выжыць любой цаной.
1.00 «Галаваломы».

АЎТОРАК, 10 САКАВІКА

7.00, 15.40 «Трукачы».
7.25, 16.05, 2.00 «Сапраўды вялікія рэчы».
8.20, 12.55 Амерыканскія калымагі.
9.15, 18.00, 5.40 З чаго гэта зроблена?
10.10, 1.00 «Галаваломы».
11.05, 20.00, 6.05 Разбуральнікі легендаў.
12.00 Аўтамайстэрні: Машына Давіда Жынола.
13.50, 0.00 Выжыць любой цаной.
14.45, 21.00 Брудная работка.
17.00, 4.45 Ствары матацыкл.
19.00, 3.50 Амерыканскі чопер.
22.00, 2.55 Народжаныя ў катастрофах.
23.00 Кітайцы ствараюць цуды.

СЕРАДА, 11 САКАВІКА

7.00, 15.40 «Трукачы».
7.25, 16.05 «Сапраўды вялікія рэчы».
8.20, 12.55 Амерыканскія калымагі.
**9.15, 18.00

ВЯЛІКАГА ПЛАВАННЯ, КАРАБЕЛЬ ПАД ЧЫРВОНЫМ ВЕТРАЗЕМ!

Жанчынам «Крычаўцэментнашыфера» прысвячаецца

ВРУП «Крычаўцэментнашыфер» — адно са слынных прадпрыемстваў Беларусі. Яно мае слаўную 75-гадовую гісторыю і сёння з'яўляецца буйным вытворцам цэменту і шыферу. З кожным годам цэментнікі Крычава нарошчваюць аб'ёмы выпуску прадукцыі. Прадпрыемства развіваецца і мадэрнізуецца.

У штодзённай працы тут не забываюць, што галоўная каштоўнасць на любой вытворчасці — гэта калектыў. Людзі, якія працуюць на цэментным, ганарацца сваім прадпрыемствам і робяць усё для яго росквіту.

Значная доля ў агульнай працы — жаночая. Таму ў першыя дні вясны мужчыны-цэментнікі актыўна рыхтуюцца да святкавання жаночага дня 8 Сакавіка. Усё лепшае — для дарагіх працаўніц!

Генеральны дырэктар ВРУП «Крычаўцэментнашыфер» Мікалай ДУДЫКА:

«У нашых перамогах ёсць вялікая доля жаночай працы!»

— Мікалай Мікалаевіч, які настрой у вас напачатку вясны?

— Нармалёвы! Я даў каманду нашай ахове не пускаць крызіс на завод. І мы яго сапраўды не пускаем. Прынамсі, два першыя месяцы года. Паводле падлікаў, да ўзроўню 2008 года выпуск прадукцыі складзе не меней за 103 працэнты. Так што ахова ў нас добрая!

— Жарты — жартамі, але ад таго, як працуе «Крычаўцэментнашыфер», залежыць шмат у чым дабрабыт райцэнтра і ўсяго раёна.

— Вядома, можна сказаць, што цэментны завод — гэта падмурак, на якім стаіць слаўны горад Крычаў. У тым сэнсе, што наша прадпрыемства градаўтваральнае, і мы забяспечваем значную частку мясцовага бюджэту.

Цяпер у Крычаве кажуць: толькі б трубы завода «дыхалі»! А я памятаю, калі разбураўся Савецкі Саюз, то «зялёныя» рабілі тут акцыі пратэсту і патрабавалі, каб вытворчасць згарнулі. У той час я працаваў галоўным інжынерам, і ў мяне захаваўся цікавы дакумент. Мясцовыя актывісты пісалі міністру з прапановай зачыніць завод як неперспектыўны. Як бы зараз без завода жыў Крычаў?

— А якая сёння сітуацыя на прадпрыемстве?

— Мы нармальна працуем. Планы ў нас сур'ёзныя, і мы павінны іх ажыццявіць. Гэта і завяршэнне мадэрнізацыі дзейнай вытворчасці, і пачатак будаўніцтва новага завода. Сёлета толькі на дзейнай вытворчасці плануем асвоіць каля 60 мільярдаў рублёў. Так што нам трэба зарабляць грошы.

Нельга сказаць, што нас не закранулі негатыўныя праявы сусветнага фінансавага крызісу. Натуральна, мы іх адчуваем. Сёння павялічваецца дэбіторская запазычанасць — спажыўцы прадукцыі цяжка разлічваюцца з прадпрыемствам. Але мы ўсё ж супраціўляемся, не пускаем крызіс на завод.

— Як працаўнікі «Крычаўцэментнашыфера» адчуваюць сябе ў такой сітуацыі?

— Працуюць, як звычайна. Мы не маем намеру выкідаць людзей на вуліцу, а наадварот: нарошчваем аб'ёмы вытворчасці і не зніжаем заробкі. Сярэдні заробак — прыкладна 1,2 мільёна рублёў.

— Відаць, праца на цэментным заводзе — прэстыжная ў Крычаве?

— У начальніка аддзела кадраў ёсць спіс тых, хто жадае працаўладкавацца да нас. Займае спіс два агульныя сшыткі. Вось колькі чалавек стаіць у чарзе на працу! Гэта гаворыць само за сябе.

— Давайце ад спраў вытворчых пяройдзем да святочнай тэмы. Колькі сёння жанчын працуе на вашым прадпрыемстве?

— Увогуле працоўны калектыў налічвае 1900 чалавек, і з іх каля 400 — прадстаўніцы прыгожай паловы чалавецтва.

— У кабінеце за вашай спінай уся сцяна завешана граматамі і дыпломамі...

— У гэтых перамогах вялікая доля і жаночай працы. Асабліва што датычыцца якасці прадукцыі. Наш выпрабавальны цэнтр, дзе працуюць толькі жанчыны, пільна сочыць за якасцю цэменту і шыферу.

— Некаму можа падацца, што цэмент і жанчына — паняцці маласумяшчальныя.

— Жанчыны ў нас у асноўным занятыя не ў сферы вытворчасці цэменту, а на дапаможных працэсах. Яны працуюць галоўным чынам там, дзе чыста, цёпла і светла — у аператарскіх і лабараторыях, у блакітных халатах.

— Што вы скажаце пра характары жанчын-цэментніц?

— Яны — наша надзейнае плячо. Пра кожную можна сказаць толькі добрае.

— А прадпрыемства падстаўляе ім плячо, калі ў гэтым узнікае патрэба? Дзеці, хваробы, складаныя жыццёвыя абставіны...

— Адназначна — так. У любых праблемных сітуацыях жанчынам аказваем матэрыяльную дапамогу, даём дадатковыя дні да водпуску. Карацей, робім усё, што прадугледжвае закон. Мы сваіх жанчын не крыўдзім.

— Як вы лічыце, што сёння галоўнае для жанчыны?

— Добрае здароўе. Тады і астатняе дадасца. Будзе і праца нармальная, і заробак прыстойны, і ўсё астатняе. Таму нашы пажаданні жанчынам: здароўя, здароўя і яшчэ раз здароўя.

— Як мужчынскі калектыў «Крычаўцэментнашыфера» будзе віншаваць сваіх жанчын?

— Трэба добра павіншаваць жанчын на свята 8 Сакавіка! Скажу, што на Дзень абаронцаў Айчыны жанчыны зрабілі нам цудоўны канцэрт: прыгожа, з выдумкай і гумарам. Цяпер мы павінны нейкім чынам адказваць. Ад аднаго свята да другога — толькі два тыдні, але ў нас, скажу без залішняй сціпласці, заўсёды атрымлівалася лепей. Сёлета даваздецца асабліва пастарацца!

Звычайна ў канцэрце да 8 Сакавіка бяруць удзел лепшыя сілы мужчынскай часткі калектыву. Мы спяваем, танчым і выступаем з гумарэскамі. А таксама дорым кветкі і падарункі ў гонар свята!

— Ці возьмеце ўдзел у канцэрце вы асабіста? Кажуць, вы добра спяваеце...

— Паспрабую праспяваць для жанчын пра вясну і каханне. Пра ўсё добрае ў нашым жыцці.

— Што б вы пажадалі працаўніцам «Крычаўцэментнашыфера» і ўвогуле ўсім беларускім жанчынам напярэдадні свята 8 Сакавіка?

— Я заўсёды кажу так: няхай грошай у вас будзе столькі, каб не трэба было іх лічыць. Дзеля гэтага неабходна працаваць, і ўсё будзе добра. Трэба, каб кожны на сваім месцы выдатна выконваў свае абавязкі. А нашы жанчыны так і працуюць.

Генеральны дырэктар Мікалай ДУДЫКА.

Культура вытворчасці — жаночая справа

Сваёй тэрыторыяй «Крычаўцэментнашыфер» выгадна адрозніваецца ад іншых прадпрыемстваў і выклікае цікавасць у гасцей. Не толькі буяннем кветак улетку, але і сваімі незвычайнымі скульптурамі. Тут не толькі захавалі і абнавілі скульптуры мінулага часу, але і стварылі новыя.

Аддзел кадраў: Святлана ВАСІЛЕНКА, Вольга МІРОШНІКАВА, Зоя ДУДЫКА, Ірына СТАРАВОЙТАВА.

Карабель з чырвонымі ветразямі, рыцар з канём, арол топча змяю... Апошнюю выяву крычаўскія цэментнікі ўспрымаюць як актуальную для цяперашніх часінаў: як арол перамагае ядавітую змяю, так і беларусы адолеюць негатыўныя праявы сусветнага крызісу. Але сярод усіх скульптур усё ж вылучаецца вялікая кампазіцыя: шэсць жаночых постацяў трымаюць у руках зямны шар.

— Гэта сімвалізуе еднасць шасці абласцей Беларусі, — растлумачыла **начальнік аддзела кадраў Зоя Дудыка**, якая з'яўляецца ініцыятарам культурнага добраўпарадкавання на «Крычаўцэментнашыферы». — Увечары гэта скульптура падсвечваецца, і зямны шар у руках жанчын выглядае як крыштальны. Мы бралі ўдзел у конкурсе ландшафтнага дызайну сярод прадпрыемстваў Магілёўскай вобласці і занялі першае месца.

У стварэнні скульптур жанчыны прадпрыемства абапіраюцца на мужчын, якія тут — майстры на ўсе рукі. Асабліва адзначаюць ролю рамонтна-механічнага цэха. Зрабіць і ўсталяваць — справа моцных і знаходлівых мужчын, але ідэі ўсё ж належаць жанчынам.

— Нягледзячы на загружанасць у працы, жанчыны актыўна займаюцца культурай вытворчасці, — зазначае Зоя Іванаўна. — Усю тэрыторыю мы падзялілі на ўчасткі і замацавалі за кожным аддзелам. У аддзела кадраў — самы вялікі ўчастак. У нас ёсць свая цяпліца, дзе мы вырошчваем кветкі і расаду. Кветкі цешаць вока, ствараюць настрой.

Аддзел кадраў — гэта пяць жанчын, якія трымаюць пад увагай кадры ўсяго прадпрыемства. Тут кажуць, што ўсе цэментніцы — добрыя працаўніцы, і звальненне жанчыны — надзвычайны выпадак. У розных жыццёвых сітуацыях кіраўніцтва заўсёды імкнецца дапамагчы чалавеку выкараскацца са складанага становішча, у якое ён трапіў.

Жанчыны паспяхова працуюць у сферы абслугоўвання завода: у інтэрнатах і гасцініцах. Новая гасцініца «Янтар» падабаецца і гасцям з усяго свету, якія прыязджаюць на прадпрыемства.

Захаваць фізічныя сілы і прыгажосць дапамагае цэх «Здароўе». Там можна атрымаць медыцынскую дапамогу, вылечыць зубы, пракансультавацца з тэрапеўтам, зрабіць масаж.

— Наша масажыстка вучылася бескантактнаму масажу ў знакамітай лекаркі Джуны, — хваляцца субяседніцы. — І так робіць, што ў цялым Крычаўскім раёне ніхто не параўнаецца. З фізіяпрацэдураў ёсць новая вуглякіслая ванна, якая павышае тонус. А нядаўна набылі карэйскую кушэтку, яна ўздзейнічае на адмысловыя кропкі арганізма.

Для таго, каб расквітнець пасля доўгай халоднай зімы, жанчынам патрэбна не толькі аздараўленне, але і ўвага моцнай паловы чалавецтва. Таму кадравікі з добрымі ўсмешкамі назіраюць, як мужчыны прадпрыемства бегаюць на «тайныя» рэпетыцыі, каб забяспечыць узнёслы настрой жанчынам.

— Нам вельмі патрэбна свята 8 Сакавіка, — прызнае **вядучы інжынер па падрыхтоўцы кадраў Вольга Мірошнікава.** — Гэта цудоўная нагода атрымаць цэлы стос камплімента ў. І тады адчуваеш сапраўды цудоўны веснавы настрой: што ты жанчына, што цябе кахаюць, што ты патрэбна.

— Я згодна з Прэзідэнтам, які сказаў, што ў нас крызісу няма, але ён навокал нас, — гаворыць Вольга Мірошнікава. — Можа, і ёсць праблемы, але ў калектыве разгубленасці няма. Мы працуем, зарабляем і будзем добра святкаваць! Я жадаю ўсім жанчынам здароўя і кахання, дабрабыту і ўпэўненасці ў заўтрашнім дні ў наш няпросты час.

— Я жадаю ўсім вялікага шчасця, — сказала Зоя Дудыка. — Мужчынам — творчых поспехаў, а нашым самым добрым, самым дарагім, самым лепшым жанчынам — сапраўднага жаночага шчасця, і каб фіранка журбы ніколі не закрывала іх вокны.

Дзень пачынаецца з завода

— О, у нас тут на свята вялікія планы! — усміхаецца, адарваўшыся ад манітора камп'ютара, **начальнік планава-эканамічнага аддзела «Крычаўцэментнашыфера» Валянціна Стадуб.** — Увогуле 8 Сакавіка — гэта пачатак вясны, свята ў душы. Добры настрой, віншаванні. Падабаецца ўвага мужчын, але хочацца, каб так было не толькі адзін дзень, а доўжылася цэлы год.

— А якія планы ў працы на сёлета?

— Па ўсім відаць, год будзе складаным, і не толькі, напэўна, у нас. Але мы не падаем духам і прыкідваем, як спраўляцца з праблемамі, якія ўзнікаюць. Цэмент, што мы вырабляем, патрэбен заўсёды. Сёлета ў краіне запланавана пабудаваць 6 мільёнаў квадратных метраў жылля, таму будзе і рэалізацыя. Збіраемся грузіць сваю прадукцыю і на экспарт, таму што яна запатрабаваная. Калі будзем працаваць на плацежаздольных спажыўцоў — не перавядуцца і грошы на разліковым рахунку. А гэта наш заробак, які адзін з самых высокіх у горадзе Крычаве.

— Валянціна Дзмітрыеўна, колькі вы працуеце на прадпрыемстве?

— Сёлета споўніцца 30 гадоў — юбілейная дата. Я вельмі люблю свой завод. Мяне вельмі радуе, што ён працуе эфектыўна.

— Што вы жадаеце напярэдадні свята 8 Сакавіка сваім калегам?

— Дабрабыту: каб годна жыць, вучыць дзяцей, паехаць некуды адпачыць, патрэбен прыстойны заробак. А для гэтага трэба, каб наша любімае прадпрыемства працавала без збояў. Я жадаю жанчынам гармоніі ў сям'і, веснавога настрою. І каб намечаныя планы ажыццяўляліся паспяхова.

Вясна прыносіць аптымізм

Ніна Топанава прыехала ў Крычаў пасля заканчэння інстытута ў 1980-м годзе, і прайшла на «Крычаўцэментнашыферы» шлях ад маладога інжынера да галоўнага тэхнолага — начальніка вытворча-тэхнічнага аддзела.

— На маёй пасадзе патрэбны і цвёрдасць, уласцівая мужчынам, і чыста жаночая памяркоўнасць, — кажа яна. — Я навучылася цвёрдасці, калі ў маладосці пачынала на шыферны вытворчасці майстрам. Тады быў дэфіцыт рабочых, не тое што цяпер. Сёння, калі гаворыш, што працуеш на «Крычаўцэментнашыферы», то гэта гучыць годна.

Ніна Топанава ніколі не шукала іншай працы і выконвала свае абавязкі такім чынам, што за гады працы атрымала 15 заахвочванняў. Апошняе і самае ганаровае: Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка аб'явіў ёй падзяку.

— Гэта ў першую чаргу заслуга ўсяго нашага працоўнага калектыву, а потым ужо мая асабістая, — кажа галоўны тэхнолаг. — Таму што адзін у полі не воін. Атрымаць падзяку кіраўніка дзяржавы — гэта ганарова, але і цягне за сабой вялікую адказнасць.

Ніна Міхайлаўна з захапленнем распавядае пра абнаўленне вытворчасці: пабудавалі новую печ, вядуцца вялікія работы ў кар'еры. Там будзе ўзведзены новы завод з «сухім» спосабам вытворчасці цэменту. Аднак і цяпер па старой тэхналогіі ў Крычаве спакойна вырабляюць высакаякасны цэмент марак 500 і 550. Крычаўскі шыфер цяпер з паліамерным двухбаковым пакрыццём і, акрамя такой надзейнай абароны, мае прыемны колер.

— Спадзяёмся, што вясна нам прынясе дадатковы аптымізм, — сказала Ніна Топанава. — Мы працуем, і ўсё павінна быць нармальна. Будзем працягваць тэхнічнае пераўзбраенне, як і меркавалі. Мы сваіх планаў не мяняем.

Прэмія да свята

Бухгалтэрыя «Крычаўцэментнашыфера» — чыста жаночы калектыў. Яе работніцы адрозніваюцца высокай адказнасцю, здольны карпатліва працаваць з лічбамі і дакументамі. А таксама вучыцца ўсё жыццё — змяненні заканадаўства адбіваюцца на працы бухгалтэрыі.

— Мы толькі здалі гадавую справаздачу, так што ў нашай бухгалтэрыі год толькі завяршыўся і... адразу надышла вясна! — усміхаецца **галоўны бухгалтар «Крычаўцэментнашыфера» Ніна Андрэйчыкава.** — Калі шчыра, то вясны вельмі і вельмі хочацца. У нас будзе і канцэрт, і падарункі ад мужчын, і традыцыйная прэмія да 8 Сакавіка, якую атрымаюць усе жанчыны!

Многія супрацоўніцы бухгалтэрыі адпрацавалі шмат гадоў і добра ведаюць сваю справу. Галоўны бухгалтар працуе ўжо 35 гадоў. Моладзь лічыць за абавязак звяртацца за вопытам да старэйшых калег.

— Наша прадпрыемства апошнімі гадамі працавала стабільна і, адпаведна, заробак быў высокі, — апісвае стан фінансавых спраў Ніна Фёдараўна. — Летась было добра: грошай і інвестыцый хапала. Хочацца, каб сёлета было не горш. Але калі трэба будзе крыху зацягнуць паясы, то нічога не зробіш — жанчыны заўсёды былі цярплівымі.

Але хочацца верыць, што снег растане, усім спатрэбяцца крычаўскі цэмент ды шыфер, і заўтра будзе не горш, чым сёння.

— На свята ўсім — добрага настрою, падарункаў, сонечнага надвор'я, — сказала Ніна Фёдараўна. — І для сябе, і для майго прадпрыемства адно пажаданне: каб нам плацілі своечасова грошы за прадукцыю. Тады і праблем не будзе.

Прыходжу на свой завод, як у сям'ю

Соф'я Глінясцікава, майстар участка па перапрацоўцы і адгрузцы шыферу:

— Я родам з Заходняй Беларусі, а ў Крычаў выйшла замуж. Пасля заканчэння тэхнікума прыйшла на цэментны завод. Займала розныя пасады на вытворчасці, але ўвесь час працавала побач з мужчынамі і нікольі не шкадую. На свята 8 Сакавіка мужчыны, з якімі я працую, прыносяць мне жывыя кветкі, якія растуць у вазонах. Усе гэтыя кветкі добра прыжываюцца і радуюць мяне дома.

Цяпер побач са мной у асноўным моладзь, бо старэйшыя пайшлі на пенсію. Нармальныя хлопцы. Завод наш працуе рытмічна, заробкі добрыя, таму, мне падаецца, ніхто нікуды не збіраецца сыходзіць. Усе за працу сваю трымаюцца, і дысцыпліна высокая. Ды і кіраўніцтва ў нас нармальнае: можна заўсёды падысці, пагутарыць, вырашыць усе пытанні.

Начальнік планава-эканамічнага аддзела Валянціна СТАДУБ.

Я прадпрыемства сваё вельмі люблю. Не ведаю, як пайду на пенсію і буду жыць без яго. Я ўсё жыццё тут, не прывыкла скакаць з месца на месца. І прыходжу на свой завод, як у сям'ю. Мае дачка і сын таксама тут працуюць.

На свята ўсім жанчынам жадаю здароўя. Працаўнікам — поспехаў. А нашаму прадпрыемству — каб працавала і развівалася.

Якасць праверана жанчынамі

Якасць сыравіны і гатовай прадукцыі, увесь ланцужок тэхналагічнага працэсу кантралююцца выключна жанчынамі. У выпрабавальным цэнтры працуе больш за 60 чалавек, і ўсе яны — жанчыны.

— Калі шчыра, мы бралі двух мужчын, але яны ў нас нешта не прыжыліся, — расказала **начальнік выпрабавальнага цэнтра Ніна Кузняцова.** — Я працую на гэтым месцы ўжо 26 гадоў, а ўвогуле на прадпрыемстве — усё жыццё. І скажу, што ў нас такі завод, дзе ўсе адзін аднаго ведаюць і паважаюць.

І яшчэ добра ведаюць адну важную рэч: прадукцыя «Крычаўцэментнашыфера» — скрозь надзейная, яна адпавядае ўсім стандартам якасці.

— Я выкарыстоўваю, калі ёсць патрэба, толькі свае крычаўскія шыфер ды цэмент, — запэўнівае Кузняцова. — Яны самыя лепшыя, гэта праверана намі.

Ніна Канстанцінаўна родам з Украіны, і дасюль у яе гаворцы ёсць мяккае пявучае адценне ўкраінскай мовы. Першым пасля заканчэння Харкаўскага інжынерна-будаўнічага інстытута ў Крычаў паехаў яе муж.

— Я падыходжу да правадніцы і пытаюся, а што такое Крычаў? — узгадвае маладосць Кузняцова. — А яна мне ў адказ: «Ой, дзетачка, не трэба туды ехаць, там столькі цэментнага пылу — мы вокны фіранкамі завешваем». Праз год я прыехала ў Крычаў і хутка прызвычаілася да цэментнага завода. А сёння ўсё так змянілася! Дзе тыя бруд і пыл? Раней стаялі запасныя пары гумавых ботаў для начальства, якое прыязджала на завод. А цяпер у нас улетку ўсё патанае ў кветках, і жанчыны ходзяць у басаножках на вялікіх абцасах.

Лабараторыі — вялікія прасторныя пакоі, дзе пануе ідэальная чысціня. Шкляныя колбы і прабіркі зіхацяць на сонцы. Над імі «варожаць» жанчыны ў блакітных халатах.

— Надакучыла зіма, чакаем вясны, — проста сказала **вядучы інжынер-хімік Святлана Пшанічная.** — Чакаем падарункаў і добрых навін.

Святлана Анатольеўна родам з Крычава, і размеркаванне атрымала на мясцовы цэментны завод. Працуе тут ужо больш за 20 гадоў і па-ранейшаму настойвае на тым, што «праца ёй, як свята».

— Мне ў нашым калектыве ўтульна, — сказала Пшанічная. — Гавораць, што на працы сяброўак не бывае, а ёсць толькі калегі. А ў мяне якраз наадварот. Я ўсіх віншую са святам 8 Сакавіка. Няхай жыве і працвітае наш завод, і дзякуючы яму будзе і ў нас дастатак.

— Я жадаю поспехаў у працы і вялікага кахання нашым жанчынам, — дадае **інжынер-хімік Таццяна Кулічкова.**

— А я жадаю, каб у нашых сем'ях быў мір, — завяршыла калектыўную размову Ніна Кузняцова. — Ёсць такі ўкраінскі верш. «Жадаю кахання, але не такога, як мора, бо яно гуляе. Не такога, як вецер, бо ён блукае. А такога, як неба, бо яно — без краю».

Самае галоўнае — мець добрую працу

— Мы займаемся вырашэннем усіх жаночых праблем, — расказала пра сваю грамадскую працу **намеснік начальніка выпрабавальнага цэнтра шыфернай вытворчасці і старшыня жаночага савета «Крычаўцэментнашыфера» Галіна Сечка.** — Адзінокія маці, дапамога да школы, святы, асобныя просьбы...

— А кіраўніцтва ідзе насустрач?

— Так, заўсёды. Увогуле добра, што мы ўсе тут працуем. Значыць, ёсць на што жыць і гадаваць дзяцей. У наш час ці не самае галоўнае для жанчыны — мець добрую працу. Таму што калі не будзе грошай — не будзе і іншага, шчасця ды дабрабыту. Чалавек адчувае радасць ад таго, што добра ведае пра свой заўтрашні дзень, які надзейна забяспечыць яго кавалкам хлеба.

— Хоць жанчын на прадпрыемстве значна менш за мужчын, але яны, такое адчуванне, задаюць тут настрой.

— Жанчыны ў нас актыўныя — яны і на вытворчасці, і на добраўпарадкаванні шчыруюць. Прымаюць удзел у спартыўных спаборніцтвах і канцэртах. Калектыў у нас моцны і добры. Я шчаслівая, што тут працую. Не надакучыла за 33 гады, а наадварот. Гэта мой другі дом.

— Што вы пажадаеце жанчынам на свята?

— Мне падаецца, што шчаслівы чалавек — гэта той, які ідзе на працу, і ён — шчаслівы, і з працы ідзе таксама шчаслівым. Няхай так сябе пачуваюць нашы жанчыны.

Родны завод і сямейная дынастыя

Алена Шавялёва, слесар кантрольна-вымяральных прыбораў:

— Мая праца вельмі цікавая. Колькі разоў клікалі ў іншыя месцы, але я вырашыла застацца ў родным калектыве. Наша сям'я — дынастыя цэментнікаў. Тут працавалі мая маці, муж, працуе брат, дзеці таксама імкнуцца атрымаць працу на прадпрыемстве. Калі разам збіраемся, толькі пра завод і размаўляем.

Маёй маці Анастасіі Аляксееўне Рыловай 83 гады. Яна прыехала ў Крычаў з Расіі па накіраванні ў 1952-м годзе. Была майстрам на шыферны вытворчасці, узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Маё самае вялікае жаданне — каб было здароўе і магчымасць яшчэ папрацаваць. Не хачу сыходзіць на пенсію! Жадаю ўсім жанчынам шчасця і дабрабыту, і каб трымаўся родны завод.

Сандружына на свяце будзе спяваць і танчыць

Бухгалтар Любоў Кузняцова больш за 25 гадоў з'яўляецца камандзірам сандружыны крычаўскіх цэментнікаў.

— Санітарная дружына на нашым прадпрыемстве створана яшчэ ў 1962 годзе для аказання першай медыцынскай дапамогі ў любых выпадках і сітуацыях, — растлумачыла Любоў Мікалаеўна. — Штогод праходзяць спаборніцтвы сандружын раёна і вобласці, і мы там займаем прызавыя месцы.

Камандзір сандружыны пераконвае, што гэта вельмі патрэбная справа — не толькі на вытворчасці, але і ў штодзённым жыцці. Дапамагчы, калі чалавек на тваіх вачах, нават у гарадзе, страціў прытомнасць. Правільна накласці павязку на рану ці шыну пры пераломе — усё гэта можа спатрэбіцца і ў быце. Праўда, Любоў Мікалаеўна моцна спадзяецца, што медыцынскія навыкі ў свята нікому не спатрэбяцца. Затое сандружыніцы змогуць поўнасцю раскрыць свае таленты ў спевах і танцах.

— Усім жанчынам — сямейнай цеплыні, дабрабыту, — кажа камандзір сандружыны. — Самае галоўнае для жанчын: павага, каханне, дабрыня, пяшчота.

Жанчынам — стабільнасці і шчасця

Любоў Прышчэп, галоўны бухгалтар прафкама:

— Я — частка вялікай дынастыі працаўнікоў прадпрыемства. Мае бацькі тут працавалі, цёткі і дзядзькі, я хутка адзначу 30-гадовы працоўны юбілей. Сын і нявестка таксама з заводам звязалі сваё жыццё. Можа, і мае чацвёра ўнукаў стануць цэментнікамі? Але пакуль яны маленькія, няхай гадуюцца здаровенькімі і добра вучацца.

Перад жаночым святам у прафкама шмат клопатаў: кожнай жанчыне трэба падарыць кветкі. Мы ўвогуле больш працуем з жанчынамі: дапамагаем ім адпраўляць дзяцей у аздараўляльныя лагеры, падтрымліваем у сувязі з нараджэннем дзяцей і ўзяццем шлюбу. Штомесяц 60-70 чалавек атрымліваюць ад прафкама матэрыяльную дапамогу.

Я хачу пажадаць усім стабільнасці, здароўя, добрага заробку і шчасця дзецям і ўнукам.

Добра працуюць — прыстойна атрымліваюць

Наталля Шаўцова, інжынер па нарміраванні працы і заробку:

— Я на прадпрыемстве ўжо чвэрць стагоддзя адпрацавала. Мае сын і дачка тут працуюць таксама. У нас людзі атрымліваюць прыстойныя заробкі.

Я сябе на іншым прадпрыемстве і не ўяўляю. Можа, якраз таму, што тутэйшыя працаўнікі не любяць хадзіць з месца на месца, і трымаецца цэментны завод?

«Крычаўцэментнашыфер» клапоціцца пра сваіх жанчын, і да свята яны атрымаюць прэміі ды заахвочванні. На 8 Сакавіка ніводная не застанецца абдзеленай. Нават тыя жанчыны, якія пакуль даглядаюць малых дзяцей.

Жадаю ўсім здароўя, шчасця, поспехаў. Усе цяжкасці, я ўпэўнена, мы перажывём: трэба толькі быць аптымістамі і спадзявацца на лепшае.

Публікацыю падрыхтавалі Ілона ІВАНОВА і Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ.

УНП 700179598

Інжынеры-хімікі выпрабавальнага цэнтра Таццяна КУЛІЧКОВА і Святлана ПШАНІЧНАЯ, лабарант Ірына АРАШКОВА.

Майстар Соф'я ГЛІНЯСЦІКАВА.

Галоўны тэхнолаг Ніна ТОПАНАВА.

Слесар КІПіА Алена ШАВЯЛЁВА.